Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 43 (4486) 24 кастрычніка 2008 г.

У нумары:

Пад воклічы «брава» і «біс»

Дні культуры Беларусі ў Літве сталіся чаканай падзеяй для нашых суседзяў.

Стар. 3

І подых часу, і адметнасць слова

Лаўрэаты Другога рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор года — пра літаратуру, творчыя набыткі і задумы.

Стар. 4-5

Розныя погляды на кнігу А.Аўруціна «Свет вечерний»:

Даражэй за ўсё — святло вячэрняе... Пушкін плача...

Стар. 6-7

Таямніца кнігі — таямніца святасці

Спавядальнае ад Валянціны Коўтун: развагі, прызнанні, успаміны.

Стар. 12

Трыо незвычайных аўтараў

Выпускнікі фізфака БДУ Андрэй Жвалеўскі, Ігар Мыцько і Яўгенія Пастэрнак — «раскручаныя» ў Расіі белетрысты.

Стар. 14

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 6720 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 8710 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4500 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры:
1 месяц — 6820 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Пад покрывам нябёсаў

Адразу тры знакавыя святы — 1020-годдзе Хрышчэння Русі, 30-годдзе архіпастырскага служэння ў нашай краіне Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі і цудоўнае восеньскае свята Пакрова — аб'яднала прэзентацыя кнігі "Вопросите Господа за меня. (Книга бесед с Митрополитом Филаретом (Вахромеевым)".

Кніга, надзвычай простая па афармленні, але багатая зместам (выдавецтва Беларускага Экзархата, наклад 10 000 экз.), утрымлівае ў сабе лепшыя словы пастыра, якія гучалі з эфіру альбо былі надрукаваныя ў газетах і часопісах за апошнія два дзесяцігоддзі. "Гэта дваццаць гадоў жывога слова перад СМІ", — так вызначыў змест літаратурнага фаліянта кіраўнік прэс-службы Беларускага Экзархата Андрэй Петрашкевіч. Кніга створана найперш дзякуючы намаганням прэс-службы, супрацоўнікі якой скрупулёзна прааналізавалі, вылучылі і сістэматызавалі найважнейшыя з журналісцкіх пытанняў, якія задаваліся Уладыку, і змясцілі адказы на іх. Так атрымаўся не зборнік асобных інтэрв'ю, а адна ёмкая гутарка — вычарпальная і выключна шчырая, прамоўленая перад чытачом духоўнай Асобай.

"Кніга гэтая — не адкрыццё, не сенсацыя, не штосьці неверагоднае. Гэта звычайная чалавечая размова, якая ў нас адбывалася на працягу многіх гадоў з гэтымі мілымі і добрымі людзьмі — журналістамі, якім я за гэта ўдзячны", — адзначыў на прэзентацыі Уладыка Філарэт. "Дзякуй усім служыцелям пяра, якія сваімі пытаннямі прымушалі глыбей задумацца над многімі праблемамі, што хвалююць Царкву і грамадства, і, пазбягаючы прыгожых слоў, хацелася думаць, разважаць", — дадаў Мітрапаліт.

Прэзентацыя выдання сталася знакавай імпрэзай вялікай праграмы беларускага духоўна-асветніцкага Пакроўскага кірмашу, які мае статус міжнароднага і традыцыйна праходзіць увосень у сталічным Палацы мастацтва. Сустрэча з духоўнымі асобамі папярэднічала Дню Маці, які вось ужо 15 гадоў святкуецца ў нашай краіне. Медаль святой апякункі Беларусі, прападобнай Еўфрасінні Полацкай Уладыка Філарэт уручыў шасці шматдзетным маці. Сярод іх — Ганна Ізотава, якая мае трох хлопчыкаў і трох дзяўчынак, Валянціна Гардун (у яе таксама шасцёра дзяцей), Вера Кавалёва, якая гадуе чатырох дзяўчынак і шасцёра хлопчыкаў, Алена Сулкоўская, чыя сям'я стала лепшаю шматдзетнаю сям'ёю года, таксама Ксенія Бяляева ды Таццяна Краўчанка — член Савета Рэспублікі трэцяга скліканя, старшыня Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў. Разам з кветкамі кожная з жанчын-прыгажунь прымала як дарунак шмат кніг пра дзяцей, выдадзеных цягам апошніх гадоў, ды ікону — абраз Пакрова. «Так Збаўцу было ўгодна, каб Свята Маці супала са святам царкоўным, духоўным», — заўважыў Уладыка. Поруч з яго прачулымі словамі пра тое, што на прэзентацыі сабралася цудоўная хрысціянская сям'я (суполка аднадумцаў, духоўна і душэўна прыгожых людзей), лунала надзея, што сям'я гэта будзе расці — пад дабрадатным Пакровам нябёсаў. Таму ўзнёсла ды трыумфальна, сцвярджаючы вечныя каштоўнасці, замацаваныя ў памяці народнай ды занатаваныя ў пісьмовых крыніцах, гучала шматкроць паўторанае «Многае лета»: творцам, духоўным асобам, людзям уцэркаўлёным і «немаўлятам у веры», жанчынам, маці...

Ірына ТУЛУПАВА

Фота Кастуся Дробава

Рукатворны космас

Чарадою пленэраў, выставак, навуковых канферэнцый адзначае наша грамадскасць 120-годдзе Язэпа Драздовіча. На мінулым тыдні сталічнае жыццё расквецілі аж тры своеадметныя вернісажы, прысвечаныя гэтай даце. Сярод іх — "Цуды маляванак" у мастацкай галерэі "Універсітэт культуры", дзе прадстаўлена больш як сто сучасных твораў, выкананых паводле традыцый беларускага маляванага дывана.

Што адчуваеш, апынуўшыся ў энергетычным полі рукатворнага Сусвету, народжанага натхненнем і фантазіяй спадкаемцаў народнай традыцыі — глыбіннай традыцыі творчасці нашых продкаў? Па-дзіцячы адкрыты, даверлівы і чысты погляд; гарманічнасць зямнога і ўзнёслага; светлае ўспрыманне жыцця; неабсяжны і неразгаданы, таемны космас мудрай душы беларусаў. За малым выключэннем, сюжэты маляванак увасобленыя на строгім чорным фоне, але колькі сонечнай радасці, дабрыні, цяпла зыходзіць ад іх!

У далёкім 1978-м ладзілася ў Мінску першая выстаўка маляваных дываноў. Гэта быў час, калі творцам-энтузіястам, імпэтным, амбітным і паспяховым, карцела знайсці ва ўжо, здавалася б, даследаваным свеце беларускага мастацтва штосьці нязнанае. І яны адкрылі сапраўдны зямны космас — унікальны кірунак народнай творчасці, які ў савецкай культуралогіі лічыўся кічам, таму быў забыты. Да збірання і, можна сказаць, духоўна-эстэтычнай рэабілітацыі беларускіх маляванак спрычыніліся У. Басалыга, Я. Кулік, М. Купава, А. Марачкін, В. Маркавец, М.Раманюк, Я. Сахута, Л. Шчамялёў... Падзвіжніцкі шлях Язэпа Драздовіча пачалі вывучаць і асэнсоўваць; яго работы, як і матывы жывапісу Алены Кіш, паўплывалі на прафесійную беларускую выяўленчую творчасць. Цяпер канцэптуальна-вобразны лад, сімволіку і тэхніку маляванкі вывучаюць у мастацкіх ВНУ. А ў Заслаўі, пачынаючы з 2002 года, ладзіцца спецыялізаваны пленэр. Вынік сямі такіх пленэраў, арганізаваных заслаўскім творчым грамадскім аб'яднаннем "Мастак", а таксама работы студэнтаў БДУКіМ ды Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, і прадстаўлены ў галерэі (сярод арганізатараў таксама галерэя фальварка "Добрыя Мысліў").

Мастацтвазнаўца Таццяна Гаранская, куратар выстаўкі "Цуды маляванак", падкрэслівае, што гэта унікальнае мастацтва не проста люструе свет кузурак, птушачак і кветак: тут увасоблена беларускае ўяўленне пра светабудову і рай, таемная "зорная дзея"...

Зорачкамі зіхаціць на чорным радне блакіт незабудак; спакой і святлынь зыходзяць ад беларускай птушкі шчасця — белага бусла... Космас маляванкі чакае ўдумлівых падарожнікаў-гледачоў.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Фота Віктара Кавалёва

Сталічны дзённік

У рамках XVI пасяджэння Каардынацыйнага савета Міжнароднай асацыяцыі саюзаў архітэктараў прайшоў XVI Міжнародны агляд-конкурс на лепшы праект (пабудову) года. Яго арганізатары — Міжнародная асацыяцыя саюзаў архітэктараў і Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц СНД. Усяго ў спаборніцтве прымалі ўдзел каля 90 работ з розных краін.

Лепшай пабудовай 2008 года ў СНД прызнаны мінскі падземны грамадска-гандлёвы цэнтр "Сталіца" (архітэктар Міхаіл Гаўхфельд). Такое рашэнне вынес Каардынацыйны савет Міжнароднай асацыяцыі саюзаў архітэктараў (МАСА).

* * *

Дырэктар Мінскага міжнароднага фестывалю дзіцячых і юнацкіх фільмаў "Лістападзік" Генадзь Плескацэвіч паведаміў, што ў гэтым годзе Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" прадставіць на фестываль тры фільмы. У конкурсным паказе прыме ўдзел карціна "Аповесць мінулых гадоў", якая расказвае гледачам пра гісторыю гербаў Беларусі. Рэжысёрамі карціны выступаюць адразу некалькі аўтараў: Аляксандр Ленкін, Ігар Волчак, Наталля Хаткевіч і Уладзімір Пяткевіч. За прызы фестывалю таксама пазмагаюцца мультфільм "Аб тым, як Несцерка гаршкі прадаваў" (трэцяя частка карціны Ігара Волчака "Несцерка") і анімацыйная стужка Уладзіміра Пяткевіча "Жаба-падарожніца". Карціны будуць ацэньваць тры склады журы: прафесійнае журы мастацкага і анімацыйнага кіно і журы гледачоў. Дзеці і падлеткі выставяць ацэнкі за кожны фільм па дзесяцібальнай шкале. Акрамя Гран-пры фестывалю прадугледжаны прызы прафесійнага журы, дыпломы і памятныя падарункі ад спонсараў фестывалю.

* * *

З 7 кастрычніка 2008 г. па 14 студзеня 2009 г. у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны праходзіць выстаўка карцін Мікалая Канстанцінавіча Рэрыха і Станіслава Мікалаевіча Рэрыха "Запаведная краіна". Выстаўка з'яўляецца сумесным праектам Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай Вайны, Міжнароднага цэнтра-музея імя М. К. Рэрыха (г. Масква) і аддзела Міжнароднага цэнтра Рэрыхаў у Рэспубліцы Беларусь (г. Мінск).

* * *

Нядаўна ў Мінску прайшлі Дні Кіпра, прымеркаваныя да нацыянальнага свята гэтай краіны. У мерапрыемствах дзён прыняла ўдзел дэлегацыя Кіпра — Беларускага таварыства дружбы і кіпрскі фальклорна-музычны ансамбль. Музыканты Кіпра выступілі ў Доме дружбы з канцэртам, які быў арганізаваны сумесна з таварыствам "Кіпр — Беларусь".

* * *

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", 10 кастрычніка ў мінскім Доме кіно адбылася прэм'ера новага беларускага тэлевізійнага фільма "Пакуль мы жывыя" рэжысёра Сяргея Сычова.

Падрыхтаваў Анатоль КУДЛАСЕВІЧ



Выстаўкі

Язэп Драздовіч — постаць незвычайная ў гісторыі беларускага мастацтва і культуры, постаць магутная, высакародная і вельмі прывабная. Ён — самабытны творца беларускай культуры, мастак, настаўнік, археолаг, пісьменнік, збіральнік беларускага фальклору, аматар тэарэтычнай астраноміі.

«Люблю тое, у што веру...

Яго вабіла, захапляла хараство роднага краю, з маленства марыў ён стаць прафесійным мастаком, паступіў у Віленскую мастацкую школу, дзе навучаўся жывапісу ў прафесара І. Трутнева. Першыя творы Драздовіча — замалёўкі краявідаў Дзісеншчыны, алегарычныя карціны "Трызна мінуўшчыны", "Дух зямлі"... Крыху пазней ён пачаў працаваць у галіне кніжнай графікі, афарміў вокладку "Першага беларускага календара на 1910 год", кнігі "Курганная кветка" К. Буйло, "Школьнага спеўніка" А. Грыневіча. Тэматыка карцін мастака вельмі разнастайная. Шмат прац Драздовіч прысвяціў гістарычнай тэме. Ён першым стварыў серыю тэматычных партрэтаў беларускага першадрукара Францыска Скарыны. Ствараў Драздовіч і свае непаўторныя, вельмі лірычныя пейзажы.

Поўны надзей і спадзяванняў, Я. Драздовіч марыў арганізаваць на радзіме ўсебеларускую мастацкую секцыю, ці нават акадэмію мастацтваў. І асветніцкая дзейнасць мастака дае свой плён: ён стварае бібліятэку для народа, аматарскі тэатр...

Так, з нагоды 120-годдзя з дня нараджэння Язэпа Драздовіча ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адкрылася выстаўка "Вандроўнік за марай". Сярод раздзелаў экспазіцыі — "Дакументы да біяграфіі", "Працы па фальклярыстыцы, гісторыі, лінгвістыцы", "Літаратурная дзейнасць", "Сусвет Язэпа Драздовіча"... Аснову юбілейнай выстаўкі складаюць разнастайныя дакументы, творчыя рукапісы, малюнкі, эскізы, рэдкія фотаздымкі з асабістага фонду Я. Драздовіча, які захоўваецца ў бібліятэцы. Увазе наведвальнікаў прапануюцца арыгінал дзённіка мастака, узоры эпісталярнай спадчыны, фальклорныя і лексічныя матэрыялы...

Акрамя расповедаў пра жыццё і творчую дзейнасць Язэпа Нарцызавіча, выступоўцы рабілі і слушныя прапановы. Прыкладам, намеснік дырэктара па навуцы Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Надзея Усава прапанавала зрабіць зводны каталог Я. Драздовіча, выдаць яго дзённікі, а таксама правесці навуковую канферэнцыю, у якой бы ўзялі ўдзел не толькі архівісты-гісторыкі, але і фізікі, і літаратуразнаўцы. У сваю чаргу старшы навуковы супрацоўнік Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе" Юрась Малаш прапанаваў стварыць у Мінску музей у гонар Язэпа Драздовіча.

а веру ў тое, што люблю»

Яшчэ адна выстаўка з нагоды дня нараджэння творцы — з назовам "Зямля і космас Язэпа Драздовіча" — пачала працаваць у філіяле Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі "Дом-музей І з'езда РСДРП".

На ўрачыстым адкрыцці словы пашаны і павагі да дзейнасці Язэпа Нарцызавіча выказалі даследчык і пісьменнік Арсень Ліс, дырэктары Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе", Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, адпаведна, Сяргей Вечар, Мікалай Паграноўскі і Барыс Лазука. А экскурсію па экспазіцыі правёў аўтар канцэпцыі выстаўкі, даследчык Юрась Малаш.

Відаць, не было такой галіны дзейнасці, якую не закрануў Язэп Драздовіч. Пасля археалагічных раскопак на Нямізе і ў старажытным Заслаўі з'яўляецца графічная серыя партрэтаў полацкіх князёў — Рагвалода, Усяслава-Чарадзея, Барыса...

Апошнія гады жыцця Я. Драздовіч вельмі бедаваў, але працягваў пісаць карціны, вандраваў з вёскі ў вёску і пакідаў людзям на памяць маляваныя дываны, якія пісаў казеінавымі і алейнымі фарбамі на саматканым, пафарбаваным у чорны колер палатне, і прызначанымі для ўпрыгожвання сялянскіх хат. Кожная гаспадыня ў тых месцах, дзе вандраваў Драздовіч, марыла мець "малярства дзядзькі Язэпа". Маляваныя дываны былі асноўнай крыніцай заробкаў мастака: часам ён мяняў дыван на вядро бульбы.

Апошні твор яго — маляваны дыван "Зачараваны замак", які ён распісаў у 1954 годзе: на беразе возера стаіць узброены воін з пікай, а ўдалечыні бачыцца прыгожы старажытны замак... Дзядзьку Язэпа ў моцны мароз знайшлі на дарозе сяляне. Ён быў без памяці, не прыходзячы ў прытомнасць, па дарозе ў бальніцу і памёр.

Язэпа Драздовіча называюць містычным фантастам беларускага жывапісу, які вандраваў па навакольных вёсках і маляваў усё, што кранае сэрца. Яго лічаць пачынальнікам касмічнай тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве. Праз усё жыццё пранёс ён вялікую прагу да спазнання Сусвету, шчыра веруючы ў тое ("люблю тое, ў што веру, а веру ў тое, што люблю"), што і на іншых планетах існуе жыццё. Драздовіч — аўтар кнігі "Нябесныя бегі", у якой выклаў сваю тэорыю будовы Космасу.

У 1931 — 1932 гадах мастак стварае серыю графічных лістоў і жывапісных палотнаў на тры асноўныя тэмы: "Жыццё на Марсе", "Жыццё на Сатурне", "Жыццё на Месяцы". Арыгінальнае ўяўленне мастака дазволіла яму зазірнуць у далёкі і невядомы, загадкавы і таму такі прыцягальны таямнічы свет, стварыць свой вобраз незямнога жыцця. Ён рэалізаваў сваё ўяўленне пра чалавечае шчасце і гармонію, малюючы на далёкіх планетах тое, чаго так не хапала ў жыцці. Тут, на гэтай зямлі.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымку: наведвальнікі выстаўкі знаёмяцца з экспазіцыяй.

Фота аўтара

Вечарыны

Адкрыцца насцеж

На геаграфічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта адбылася сустрэча Навума Гальпяровіча са студэнтамі. Паэт прэзентаваў свой новы зборнік вершаў і навеў "Насцеж".

Мерапрыемства падрыхтавалі супрацоўнікі аддзела гуманітарна-асветніцкай работы фундаментальнай бібліятэкі БДУ. Студэнты чыталі вершы з новага зборніка. Дэкламацыю суправаджала рамантычная музыка. А на сцяне змяняліся прыгожыя слайды з краявідамі Полацка — роднага горада паэта. Быў падрыхтаваны і сюрпрыз. Даведаўшыся, што іх госць любіць беларускія народныя песні, студэнты вырашылі выканаць яго ўлюбёную — "Ой, сівы конь бяжыць". А паэта запрасілі падтрымаць хор.

Потым Навум Гальпяровіч адказаў на пытанні цікаўнай аўдыторыі. Дзяцінства, падарожжы, захапляльныя гісторыі, натхненне, улюбёныя выданні, музычныя прыхільнасці... А на пытанне пра ўласнае ўяўленне пра шчасце аўтар зборніка адказаў: "Шчасце — гэта калі цябе разумеюць. Дык вось, калі нехта з вас мяне сёння зразумеў, калі мае вершы перагукнуліся з вашай душой, то кавалачак гэтага шчасця я ўжо адчуў".

Пры канцы сустрэчы госць студэнцкай аўдыторыі прачытаў некалькі сваіх вершаў. А кожны ахвочы мог тут жа набыць кнігу. І атрымаць аўтограф Навума Гальпяровіча.

Ганна КАРПУК

Фестывалі

Залатая і зорная

22 кастрычніка ў сталіцы ўрачыста адкрыўся XXXV Міжнародны фестываль мастацтваў "Беларуская музычная восень".

Амаль месяц будзе ўладарыць на культурным абсягу нашай краіны "пятая паравіна года". Заўчора ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі выступаў знакаміты госць — Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Расіі, які сёння носіць імя свайго легендарнага маэстра Яўгена Святланава. Сёння ўпершыню ў Мінску прагучыць "Лірычная сімфонія" аўстрыйскага кампазітара А. фон Цамлінскага. Выканаўцы — Акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі на чале з А. Анісімавым, салісты І. Крыкунова (Расія) і Д. Стумбрас (Літва).

29 кастрычніка ў гэтай зале два Нацыянальныя акадэмічныя мастацкія калектывы нашай краіны — народны аркестр імя І. Жыновіча ды народны хор імя Г. Цітовіча прадставяць новую сумесную праграму з ужо вядомага цыкла "Галасы Бацькаўшчыны".

С. ВЕТКА

На здымку: Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Г.Цітовіча.

«Дух — гэта, людзі, Я!»

Пад такой назвай 26 кастрычніка ў вёсцы Гарошкаў, непадалёк ад Рэчыцы, адбудзецца традыцыйнае свята паэзіі ў гонар Анатоля Сыса. Сёлетняе свята праводзіцца акурат у дзень народзін паэта. У святе бяруць удзел родныя і землякі Анатоля, ягоныя сябры, а таксама вядомыя беларускія паэты, барды і мастакі.

Ласкава запрашаюцца ўсе, каму на справе, а не на словах дарагі несмяротны Дух айчыннай паэзіі, хто любіць і памятае творчасць Анатоля Сыса — аднаго з выбітных беларускіх паэтаў XX стагоддзя.

Пачатак свята а 12-й гадзіне на Гарошкаўскіх могілках, дзе адбудзецца адкрыццё надмагільнага помніка паэту. А 13-й — пачнуцца паэтычныя чытанні і бардаўскі канцэрт на падворку роднай хаты Анатоля Сыса.

Для тых, хто жадае далучыцца да імпрэзы, кантактныя тэлефоны: +37529-7-68-56-14 (у Мінску) і +37533-6-72-24-60 (у Рэчыцы).

Ул. інф.

Супрацоўніцтва

З 5 па 13 кастрычніка ў Літве прайшлі Дні культуры Беларусі, падчас якіх літоўскія гледачы ўпершыню за шмат гадоў пабачылі майстэрства беларускіх артыстаў балета ў спектаклі Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета нашай краіны "Рамэо і Джульета". Два спектаклі прывёз у Вільнюс Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага, адбыліся канцэрты камернай музыкі з удзелам беларускіх музыкантаў Белдзяржфілармоніі. У Літоўскай дзяржаўнай акадэміі музыкі і тэатра ў Дзень Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі маладыя айчынныя выканаўцы выступілі з канцэртам камернай музыкі.

Пад воклічы «брава» і «біс»

Дні культуры нашай краіны ў Літве адкрыліся Святам беларускай песні, якое арганізавала Пасольства Беларусі сумесна з Аб'яднаннем беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве пры падтрымцы Дэпартамента нацыянальных меншасцей і эміграцыі пры Урадзе Літоўскай Рэспублікі.

На цырымоніі ўрачыстага адкрыцця свята песні выступілі прэзідэнт Аб'яднання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве Л. Мурашка і Пасол Беларусі ў Літве У. Дражын.

У канцэрце бралі ўдзел самадзейныя калектывы беларускай дыяспары з Вільнюса, Вісагінаса, Клайпеды і Шальчынінкая. Вялікі поспех мела выступленне народнага ансамбля музыкі і песні "Астрамечаўскія Лявоны".

Свята беларускай песні сабрала прадстаўнікоў рэгіянальных беларускіх арганізацый з Вільнюса, Шальчынінкая, Вісагінаса, Швянчэніса, Шаўляя, Клайпеды, аматараў народнай песні і фальклору.

У наступныя пасля адкрыцця два дні ўвазе літоўскіх аматараў тэатральнага мастацтва былі прадстаўленыя два спектаклі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага "На змярканні" і "Легенда пра беднага д'ябла" ў пастаноўцы аднаго з лепшых айчынных рэжысёраў, народнага артыста Беларусі Барыса Луцэнкі.

Са сцэны Рускага драматычнага тэатра ў Вільнюсе літоўскіх гледачоў павіталі міністр культуры Літвы Ёнас Ючас і Пасол нашай краіны Уладзімір Дражын. Яны адзначылі, што і Мінск, і Вільнюс проста абавязаны ўдзельнічаць у культурным жыцці адзін аднаго, таму што адлегласць паміж сталіцамі не можа быць перашкодай для развіцця супрацоўніцтва ў культурнай сферы, асабліва для дзвюх нацый, аб'яднаных агульнай гісторыяй і традыцыямі.

Прывезены ў Вільнюс спектакль "На змярканні" так уразіў публіку, што фінал пастаноўкі гледачы суправаджалі авацыямі. А народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі, які выйшаў да іх, зазначыў: "Я быў тут 30 год таму. Вільнюс за гэты час вельмі змяніўся, не змяніліся толькі вы"... З такім жа захапленнем публіка сустрэла і спектакль "Легенда пра беднага д'ябла".

Галоўнай падзеяй Дзён культуры стаўся спектакль "Рамэо і Джульета" С. Пракоф'ева ў выкананні Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета Беларусі пад кіраўніцтвам вядомага пастаноўшчыка, балетмайстра, народнага артыста СССР Валянціна Елізар'ева на сцэне Нацыянальнага тэатра балета Літвы. З рэпертуару беларускага тэатра быў выбраны шэдэўр сусветнай класікі. У гэтага балета асаблівая сцэнаграфія, над ім працавала група мастакоў, якая стварыла унікальныя дэкарацыі і касцюмы. На сцэне літоўскага Нацыянальнага тэатра оперы і балета ўжо 15 год ідзе "Рамэо і Джульета" ў пастаноўцы Уладзіміра Васільева. Такім чынам, у літоўскіх аматараў тэатра з'явілася магчымасць параўнаць пастаноўкі. Як вынік — бясконцымі авацыямі, воклічамі "брава!", "біс!" пасля завяршэння прагляду вітала дасведчаная вільнюская публіка артыстаў беларускага балета.

Тэатр, балет, музыка... Дні культуры і павінны быць разнапланавыя. Таму яны і ўключалі ў сябе выступленні творчага калектыву Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Яе мастацкі кіраўнік, заслужаны артыст Беларусі Юрый Гільдзюк разам з Генадзем Забарам у Музеі прыкладнога мастацтва Літвы далі сумесны канцэрт камернай музыкі разам з літоўскімі выканаўцамі — струнным квартэтам "Акадэмія" Літоўскай акадэміі музыкі і тэатра...

Тое, як літоўцы сустрэлі Дні культуры Беларусі, сведчыць пра трывалую цікавасць да беларускай культуры ў розных яе праявах, пра імкненне даведацца больш пра суседні народ, яго традыцыі, мастацтва, пра зацікаўленасць у пашырэнні культурных сувязей. Часам ні палітычна, ні эканамічна нельга так зблізіць нацыі, як гэта адбываецца падчас культурнага супрацоўніцтва. Бо, як вядома, супольнасць і адзінства нараджаюцца там, дзе валадарыць шматстайнасць.

Н.К.

На здымку: выступае народны ансамбль музыкі і песні "Астрамечаўскія Лявоны". Фота Віктара Кавалёва

Канферэнцыі

На пачатку кастрычніка ў Гомелі праводзіліся Міжнародныя навуковыя чытанні "Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры", прысвечаныя памяці народнага пісьменніка, акадэміка Івана Навуменкі. Арганізатары канферэнцыі — Гомельскі абласны савет дэпутатаў, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны і Гомельская спецыялізаваная славянская бібліятэка.

Нараджэнне традыцыі

Прывітальнае слова ўдзельнікам Міжнародных навуковых чытанняў сказаў старшыня Гомельскага абласнога савета дэпутатаў Валерый Сяліцкі, ён жа — старшыня аргкамітэта. Нягледзячы на тое, што тэматыка чытанняў была даволі шырокая і ахоплівала праблемы гісторыі літаратуры і літаратуразнаўства ад старажытнасці да самых найноўшых метадаў даследавання, асноўная ўвага ўсё-ткі была аддадзена ўшанаванню памяці Івана Навуменкі. Вельмі цёплыя пачуцці ва ўдзельнікаў канферэнцыі выклікала тое, што на ёй прысутнічалі дзеці і ўнукі народнага пісьменніка. Успамінамі, асэнсаваннем ролі не толькі бацькі ў сваім жыцці, але і ролі пісьменніка і навукоўца ў культурным жыцці краіны падзяліліся дочкі — кандыдат медыцынскіх навук, вядомы афтальмолаг Валерыя Іванаўна, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Расійскай акадэміі мастацтваў імя Гнесіных Таццяна Іванаўна і сын — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта БДУ Павел Іванавіч. Выступілі на пленарным пасяджэнні і доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі Сцяпан Лаўшук (дарэчы, зямляк Івана Навуменкі), доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі Аляксандр Лукашанец, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскіх літаратур філалагічнага факультэта БДУ Іван Чарота, а таксама замежныя госці — прафесар, загадчык кафедры славістыкі Ольдэнбургскага універсітэта Гун-Брыт Колер (Германія), прафесар з Сербіі, стваральнік інтэрнэт-праекта, заснаванага на матэрыялах аб славянскіх культурных, сацыяльна-палітычных, гістарычных узаемасувязях Дэян Айдачыч.

На канферэнцыі працавалі чатыры секцыі: "Спадчына Івана Навуменкі і сучасны літаратурны працэс", "Перспектывы сучаснай славістыкі", "Нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры", "Перспектывы літаратуры класічнага тыпу ў эпоху глабалізацыі". Перад пачаткам працы секцый удзельнікам канферэнцыі была прапанавана водная экскурсія па рацэ Сож, падчас якой яны маглі ў неафіцыйнай атмасферы больш цесна пазнаёміцца і нязмушана абмяняцца думкамі. Вялікую цікавасць і ў сталічных гасцей, і ў гасцей з замежжа выклікала праца Гомельскай спецыялізаванай славянскай бібліятэкі, у якой сабраныя кнігі амаль на ўсіх славянскіх мовах.

Другі дзень быў прысвечаны наведванню мясцін, звязаных з жыццём і творчасцю Івана Навуменкі. Удзельнікі чытанняў мелі магчымасць пабываць у мястэчку Васілевічы, дзе нарадзіўся пісьменнік, пабачыць яго родную хату, з вялікай пашанай сустрэлі гасцей і ў Васілевіцкай школе. У другой палове дня было наладжана пасяджэнне ў памяшканні Рэчыцкай раённай бібліятэкі. Ля ўваходу гасцей вітаў рэчыцкі народны хор "Дняпро", дырэктар бібліятэкі Тамара Елісеева і загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ларыса Кухта распавялі, якую дзейнасць праводзіць установа па збіранні матэрыялаў пра пісьменнікаў-землякоў, ураджэнцаў рэчыцкай зямлі. А сярод іх, акрамя Івана Навуменкі, яшчэ і Уладзімір Верамейчык, Міхайла Грамыка, Валянціна Коўтун, Уладзімір Ліпскі, Барыс Паўлёнак, Аркадзь Пінчук, Анатоль Сыс, Нэлі Тулупава, Віктар Ярац. Супрацоўнікі бібліятэкі адзначылі, што грунтоўнай дапамогай у гэтым з'яўляецца для іх актыўны ўдзел саміх пісьменнікаў. Так, напрыклад, Валянціна Коўтун і Уладзімір Ліпскі часта наведваюць свае родныя мясціны, праводзяць у Рэчыцкай бібліятэцы творчыя сустрэчы, пакідаюць кнігі з аўтографамі.

Падчас урачыстага падвядзення вынікаў канферэнцыі прафесар Гун-Брыт Колер, якая наведала Беларусь упершыню, адзначыла, што яе вельмі ўразіла імкненне беларусаў шанаваць і захоўваць традыцыі. "Гэтаму нам, немцам, варта было б у вас павучыцца," — дадала яна. Нібы пацвярджаючы выказванне замежнай госці, доктар філалагічных навук, прафесар Іван Штэйнер выказаў прапанову зрабіць Навуменкаўскія чытанні рэгулярнымі і праводзіць іх раз на год альбо на два гады.

Жана КАПУСТА

На здымку: блізкія і родныя І.Навуменкі падчас канферэнцыі.

Пункцірам

МАГІЛЁЎ. Новым дырэктарам Магілёўскай абласной бібліятэкі прызначана Ілона Сарокіна. Ілона Уладзіміраўна падкрэсліла: традыцыі кніжнай скарбніцы будуць захаваны. Зараз заканчваецца ўнутраны рамонт памяшканняў, каб наведвальнікам і супрацоўнікам ўстановы было тут цёпла і ўтульна.

ПІНСК. Гарадская бібліятэка пастаянна ўдзельнічае ў месячніку "Міласэрнасць". У рамках гэтай акцыі днямі адбылася прэзентацыя новай кнігі Васіля Грышко "Пінскалогія". Аўтар, які ўзначальвае грамадскае аб'яднанне — фізкультурна-спартыўны клуб інвалідаў "Ветразь" — і выкладае геаграфію ў пінскай гімназіі № 2, распавёў пра гісторыю стварэння выдання. Прысутным была прадстаўлена падабраная супрацоўнікамі бібліятэкі выстава ранейшых кніг Васіля Георгіевіча.

КЛЕЦК. "Скура. Колер. Аб'ём" — такую назву атрымала персанальная выстава Таццяны Карчажкінай, якая экспануецца ў музеі гісторыі Клеччыны. Карціны, зробленыя са скуры, — гэта нацюрморты, пейзажы, партрэты.

Т. Карчажкіна — графік і жывапісец, з задавальненнем займаецца акварэллю. Карціны мастачкі знаходзяцца ў прыватных калекцыях Польшчы, Германіі, Швецыі. У Беларусі яе працы пабачылі жыхары Бабруйска, Барысава, Лагойска, Магілёва, Мінска.

БРЭСТЧЫНА. Адзінаццаты нумар часопіса "Маладосць" прысвечаны Брэстчыне, дзе пад адной вокладкай друкуюцца мастацкія творы берасцейскіх аўтараў. Аповесць Валерыя Гапеева "Усё цудоўна, або Урок бяспечнага сексу" зацікавіць шмат каго з чытачоў. Шырока прадстаўлены паэзія і проза Анатоля Крэйдзіча, Лявона Валасюка, Юрыя Паталкова, Марылі Тройніч, Алеся Каско, Ніны Мацяш, Міколы Пракаповіча, Васіля Дэбіша, Вінцэся Вашэкі, Алены Ігнацюк, Анатоля Трафімчыка ды іншых.

Зацікавяць матэрыялы, падрыхтаваныя да 60-годдзя Яўгеніі Янішчыц, а таксама пра Брэсцкі дзяржуніверсітэт, абласную бібліятэку, знакамітую мясціну каля Косава — Марачоўшчыну, пра стравусіную ферму ў Кобрынскім раёне.

Валянціна СМАНЦАР

ВІЦЕБШЧЫНА. Пра сенсацыю гаварыць пакуль рана: гэта ўсяго толькі гіпотэза, пацвердзіць або абвергнуць якую можна будзе пасля кампетэнтнай экспертызы. Але сам факт надзвычай цікавы. У музеі вёскі Гарадзец на Шаркоўшчыне захоўваецца старажытная скрыпка, пад парванымі струнамі якой чытаецца імя: "Antonius Stradivarius" і год: "172..." (чацвёртая лічба ў даце ўжо невыразная, нагадвае і "3", і "5"). Калі гэта і сапраўды скрыпка работы Страдывары, дык якім чынам патрапіла яна ў вясковы музей? Мясцовыя краязнаўцы не здзіўляюцца, бо гэтымі землямі здавён валодалі знаныя вялікакняжацкія магнаты. Нават дагэтуль захаваўся графскі маёнтак Плятэраў. А экспазіцыя музея, дзе выяўлены рарытэтны музычны інструмент, фарміравалася з прадметаў побыту і твораў мастацтва, сабраных тутэйшымі жыхарамі. Застаецца толькі правесці экспертызу і дачакацца яе вынікаў: а раптам гэта і сапраўды "дзіця" вялікага італьянскага майстра?

Я. КАРЛІМА

І подых часу, і адметнасць слова

Другі рэспубліканскі конкурс на лепшы літаратурны твор года завершаны. Названыя пераможцы па намінацыях, і што ўсцешвае, іх сёлета значна больш, чым летась. Заснавальнікі конкурсу — Саюз пісьменнікаў Беларусі і зацікаўленыя міністэрствы, вызначаючы лепшыя з лепшых твораў, строгіх рэгламентацый не прытрымліваліся. Не ва ўсіх намінацыях названыя абавязковыя тры лідэры. Аднак, наватарскае слова, слова мастацкае па-сапраўднаму ацэненае. На Свяце беларускага пісьменства творцам уручаны дыпломы, памятныя статуэткі і прэміі. Між іншым, конкурс цяпер будзе штогадовым. Значыць, распачынаецца наступны яго этап.

Пераможцы ў 10-і асноўных намінацыях выказваюць свае меркаванні пра конкурс, пра новыя кнігі і творчыя задумы, пра развіццё беларускай літаратуры.

Уладзімір КАРЫЗНА
(першае месца ў намінацыі "Песенны жанр", "Доля — Русь наша Белая")

Доўгі шлях да песні

Мною за апошнія некалькі дзесяцігоддзяў напісана больш двухсот песень, якія выконваліся вядомымі ў рэспубліцы і за яе межамі спевакамі, як Тамара Раеўская, Вольга Шутава, Ганна Радзько, Яраслаў Еўдакімаў, Надзея Мікуліч, Валянціна Пархоменка, гучалі яны і ў рэпертуары ансамбляў «Сябры», «Верасы», «Песняры».

У нядаўна выдадзенай кніжцы пад агульнай вокладкай "Доля — Русь наша Белая" аб'яднаны вершы і паэмы апошніх гадоў, пяцьдзесят песень. Усе творы розныя па гучанні, але звязаныя агульнай тэмай — тэмай любові да Радзімы. Ёсць у кнізе і творы патрыятычныя, звязаныя з перабудовай. Дарэчы, крыху раней пабачылі свет гэткія мае кнігі песень, як "Салавей спявае", "Клубныя вечары", Люблю цябе, Белая Русь", "Гэта наша Радзіма". Любоў да родных краявідаў, яе рэкаў і азёр як у вершах, так і ў песнях мае свой рэальны, канкрэтны змест.

Што характэрна для майго пісьма, творчай манеры? У сваіх вершах, некаторыя з якіх становяцца пасля песнямі, я расказваю, здавалася б, аб самых простых, звычайных рэчах. Але кожны радок сагрэты цеплынёй уласнага сэрца, пазначаны высокім гуманізмам.

Дастаткова ўзгадаць гэткія песні, як "Беларусь сінявокая", "Сінія вёсны", "Бяжыць мая рэчка", "Журавінка", "Гады маладыя" ды іншыя, якія выконваюцца літаральна на адным дыханні, прасякнуты святлом, радасцю, прываблівающь спевакоў натуральнасцю інтанацыі, шчырасцю і паэтычнасцю.

Адным словам, ствараючы кнігу "Доля — Русь наша Белая", я імкнуўся ў паэзіі будняў адлюстраваць паўнакроўнае жыццё, дзе ёсць і радасць, і засмучэнне, і каханне, і здрада — усё, чым жывуць людзі.

Іван ЧАРОТА
(першае месца ў намінацыі "Пераклад", "Мовы ўсяго жывога")

Дзеля сцвярджэння нацыянальнага слова...

Вядома ж, я ўдзячны ўсім, хто выдаваў маю перакладную кнігу, хто вылучыў яе на конкурс і хто прызнаў яе не горшай.

А пра сябе гаварыць няёмка... Таму спынюся не на персанальным, асабістым, а на тым, што мае дачыненне да жанру, віду пісьменніцкай працы. Хачу звярнуць увагу, што ў конкурсе — важным і стымулятыўным для пісьменнікаў усіх жанраў — сёлета ўпершыню з'явілася намінацыя "пераклад". А інакш, па нядобрай завядзёнцы, перакладчыкі ўспрымаліся (і вымушаны былі самі сябе ўспрымаць) як "недапісьменнікі". Без асаблівай крыўды, але згадваецца, як калісьці секцыя вылучыла мяне на атрыманне прэміі, але гэтая прапанова нават на Раду СБП не была вынесена... Падобнае адбылося і з кандыдатурай Уладзіміра Мархеля. Невыпадкова і тое, што перакладчыкі працавалі "ў шуфляды". Скажам, у мяне дзесятак кніг не выдадзеных...

Між тым, літаратурны пераклад — паводле азначэння і аб'ектыўнай функцыянальнасці — мае надзвычай важныя функцыі якраз дзеля сцвярджэння нацыянальнага мастацтва слова. Таму, нягледзячы на ўсе цяжкасці і супярэчнасці, стараюся, колькі магу, спрыяць умацаванню славянскага братэрства праз літаратуру, Слова. Нейкім вынікам гэтых намаганняў і стаў зборнік сербскіх народных казак "Мовы ўсяго жывога". Пры яго падрыхтоўцы галоўнай мэтай было даць уяўленне самым маладым суайчыннікам, унукам, пра дарагіх для мяне сербаў — каб гэтае пакаленне, свядомасць якога сістэмна разбураецца, не страчвала ўсведамлення роднасці, сваяцтва, агульнасці лёсаў. А сербы, дарэчы, маюць сусветна вядомы паэтычны эпас і неверагодна багатую казачную спадчыну. Што ж датычыцца таго, як гэта ўдалося данесці юным беларускім чытачам, няхай вызначаюць іншыя.

Мне застаецца толькі яшчэ раз падзякаваць усім, хто дачынны да выхаду кнігі сербскіх казак у свет і прысуджэння за гэтую кнігу прэміі.

Раіса БАРАВІКОВА
(першае месца ў намінацыі "Паэзія", "Дрэва для райскай птушкі")

Купідон, як помнік...

Па-першае, я ўдзячна выдавецтву "Мастацкая літаратура" за гэтую — такую бэзавую — кнігу "Дрэва для райскай птушкі", дзе ўсё так, як я хацела... Удзячна і Уладзіславу Мачульскаму, і Віктару Праўдзіну, які тады быў галоўным рэдактарам выдавецтва, і Віктару Шніпу... А яшчэ, безумоўна, і Івану Фёдаравічу Штэйнеру за цудоўную прадмову, і мастаку Віктару Альшэўскаму, чыю карціну аблюбавала для афармлення, калі кніжка толькі задумвалася.

Ну, а што да Купідона... Я ўдзячная і яму. Напэўна, ні з кім ён так азартна і адмыслова не гуляў у свае гульні, як са мной, чамусьці абраўшы для гэтых гульняў віртуальную прастору. У сямідзесятыя працяў сваёю стралою, калі пабачыла на тэлеэкране нямецкага спевака Дзіна Рыда... І хаця з гэтым спеваком ніколі не давялося сутыкнуцца, што называецца "ўжывую", вершы пісаліся і пісаліся... Як жа, напэўна, смяяўся тады Купідон, што гульня ўдалася. Мне ж заставалася адно: бараніцца пушкінскім радком: "Обмануть меня не трудно, я сам обманываться рад"... Сваю стралу Купідон скіраваў у мяне, калі колькі гадоў таму на Лагойшчыне каля куста бэза стаялі разам з Лёнем Дранько-Майсюком. Той бэз стаўся "Бэзам з вачамі Дон-Жуана"... Купідон і цяпер усё круціцца і круціцца каля мяне, спрабуючы ўціснуць у крэсла, калі на тэлеэкране ідзе якінебудзь фільм з Джорджам Клуні. Ужо часам пачынае ўзносіць у свае вышыні тая салодкая віртуальнасць, за якой радкі і радкі пачуццяў. І здаецца, я ўжо гатова прыняць гэтую віртуальнасць, раптоўна скінуць з сябе гадоў трыццаць, як тая гадзюка, што скідае, даруйце, падношаную скуру. Але.. ад стралы Купідона я стараюся ўхіліцца. Тую стралу трэба няньчыць у сабе, яна патрабуе шмат вольнага часу, каб смакаваць рану... Ды яе ўжо і вельмі лёгка зламаць у цесным рэдакцыйным кабінеце, дома — у цеснай куханьцы, ды і дарослыя дзеці могуць вырваць яе з асаблівым зларадствам.

Таму, хай даруе мне Купідон, які любіць гуляць у азартныя гульні. Цяпер я маю Купідона — бронзавага і ён у маёй кватэры, як помнік... Усім тым і салодкім, і пакутлівым пачуццям, што адрываюць ад зямлі... Пачалі пісацца фантастычна-прыгодніцкія кнігі для дзяцей: "Казкі астранаўта" (Касмічныя падарожжы беларусаў), "Казкі з гербарыя", цяпер вось працую над аповесцю "Дзімка з планеты жоўтага хакера"... Познімі вечарамі сяджу за пісьмовым сталом, а спінай чую: не спіць і мой Купідон... Хто ведае, якая задумка жыве ў яго галаве, ды, напэўна, і не трэба ведаць. Лепшае ў жыцці тое, што прадказаць немагчыма. Таму хай жыве непрадказальнасць і, зразумела, страла Купідона... Магчыма, мне яшчэ і давядзецца пабачыць яе ў палёце.

Віктар ГАРДЗЕЙ
(першае месца ў намінацыі "Літаратурная крытыка", "Паміж Бобрыкам і Ланню: Ганцаўшчына літаратурная")

Купідон без арбалета

Надоечы з глыбіннай палескай вёскі Хатынічы патэлефанавала малодшая сястра выдатнага паэта Міхася Рудкоўскага, нядаўняя настаўніца мясцовай школы Ірына Міхайлаўна Смаршчок і ад імя землякоў павіншавала мяне з перамогай у конкурсе па намінацыі "літаратурная крытыка", пра што яна, прыхільніца і знаўца сучаснай беларускай літаратуры, даведалася з газеты. Далікатна патлумачыў ёй пра заваяваны прыз — аголеную бронзавую скульптурку Бога кахання Купідона, які заместа арбалета трымае на выцягнутых руках разгорнутую кнігу. Гэты патаемны спакуснік чужога шчасця і юнага пачуцця, фігуральна кажучы, дастаўся мне за літаратурна-мастацкія нарысы, надрукаваныя ў важкім і змястоўным томе "Паміж Бобрыкам і Ланню", а выйшаў ён як чарговае выданне ў вядомай серыі "Беларусь літаратурная".

Маіх літаратуразнаўчых твораў, своеасаблівых па жанры і прысвечаных пісьменнікам — землякам, тут змешчана ажно восем. Разам яны склалі вялікі раздзел "Палескае сузор'е", дзе, безумоўна, самая яркая зорка — Якуб Колас, які свой працоўны і творчы шлях пачынаў на ганцавіцкай зямлі. Далей у адпаведным узроставым парадку ідуць іншыя славутыя імёны — А. Сержпутоўскі, У. Калеснік, В. Праскураў, М. Дубянецкі, М. Рудкоўскі, І. Кірэйчык, М. Купрэеў.

З сумам хачу зазначыць, што палескае сузор'е пісьменнікаў, названых вышэй, сёння ярка свеціцца дзесьці на нябёсах. Але менавіта ў міжрэччы паміж Бобрыкам і Ланню ў пасляваенны час нарадзілася цэлая плеяда маладзейшых таленавітых паэтаў і празаікаў: А. Каско, У. Марук, І. Лагвіновіч, К. Мохар, А. Кажадуб, М. Трафімчук, С. Локтыш, і, шчыра кажучы, пра кожнага з іх хацелася надрукаваць хоць невялікую нататку, што зрабіць не ўдалося з-за і без таго вялікага аб'ёму кнігі і адпаведнага яе гандлёвага кошту.

Ёсць у мяне "шырокафарматныя" нарысы пра творчасць У. Караткевіча, Я. Янішчыц, С. Гаўрусёва, М. Федзюковіча і многіх іншых. Галоўным чынам пішу пра пісьменнікаў, старэйшых і маладзейшых, з якімі сябраваў ці ведаў асабіста. Асобныя творы пра літаратараў, блізкіх да школьнай праграмы, змешчаны ў маёй кнізе прозы "Аселіца ў басейне Чорнага мора", накладам у 22 тысячы асобнікаў выдадзенай у серыі "Школьная бібліятэка", якая даўно, мабыць, стала набыткам процьмы чытачоў. А ўвогуле за нейкія 10—15 гадоў сабралася нарысаў, рэцэнзій, прадмоў на кнігу аб'ёмам да 30 аўтарскіх аркушаў, выданнем якой, калі дазволяць умовы, я хацеў бы заняцца ў бліжэйшы час.

Нягледзячы на Купідона, сённяшняга майго міралюбнага кватаранта, прафесійным ні крытыкам, ні літаратуразнаўцам сябе не лічу. Люблю прыязную, дасведчаную крытыку.

Анатоль ДЗЯЛЕНДЗІК
(першае месца ў намінацыі "Драматургія", "Анастасія Слуцкая" і "Князь Міхаіл Глінскі")

Людзям патрэбны святы

У Барысаве на Дні беларускага пісьменства чамусьці ўспомніў даўні эпізод свайго жыцця.

У 1973 годзе мне давялося пабываць на Канарскіх астравах. І прыгадаўся выпадак, калі напрыканцы дня нашы турысты сядзелі ў рэстаране, а побач з плантацыі вярталіся стомленыя сяляне. Раптам нашы жанчыны сталі запрашаць іх да стала. Яны, пасля невялікага супраціўлення, згадзіліся. А пасля выпітага бакала, другога так пайшлі ў скокі, што гледзячы на іх у мяне на вачах выступілі слёзы. Глядзеў і думаў пра нашых, на той час затурканых вяскоўцаў, на сябе прымяраў іх кашулю, не змаглі б яны так весяліцца, апынуўшыся ў аналагічнай сітуацыі.

Чаму? Гэта ўжо наша гісторыя... Але ж, і ў Іспаніі лютавала інквізіцыя, гарэлі на кастрах ерэтыкі і ведзьмы. Была і грамадзянская вайна... А ўмеюць жа весяліцца людзі! Тады я падумаў, колькі ў нас павінна змяніцца пакаленняў, каб вось так нашы хлебаробы маглі б радавацца жыццю?!

І ў Барысаве на Свяце беларускага пісьменства, і ў затым ў Оршы на Дажынках убачыў, што могуць, што наступіў гэты час. Столькі светлых усмешак, столькі запалу радасці ў прадстаўнікоў розных пакаленняў, якія шчыра радуюцца святам!

4 сакавіка 2009 года мне споўніцца 75 год. Хачу паспець штосьці напісаць, выдаць, паставіць на сцэне. Напісаў камедыю, якой зацікавіліся тэатры.

А зараз пішу, мабыць, сваю галоўную кнігу. Папярэдняя назва яе "Іранічныя мемуары". Мне падабаюцца словы Аляксандра Валодзіна: "Пісаць пра сябе без гумару нельга, сорамна". Але не пагаджуся з майстрам толькі таму, што гумар — гэта часам крыху жарсткавата, а іронія — больш далікатная штука. І мне хочацца паглядзець на свае ўзлёты і падзенні, на ўсіх, хто побач са мной быў і ёсць з іроніяй і ўсмешкай, а гэта больш цікава. Лепш за ўсё іранізіраваць над сабой і іншымі ўдавалася Бернарду Шоў і Аскару Уайльду. Да гэтага часу мы ў захапленні ад іх парадоксаў. Хочацца думаць, што кнігі такога кшталту ў нас пакуль не было напісана...

Анатоль ЗЭКАЎ
(першае месца ў намінацыі "Сатыра, гумар", "Кругі ў галаве")

Я чытаю вашы вершы...

Не скажу, што пародыя — мой асноўны літаратурны занятак. Лічу гэта для сябе нечым прамежкавым паміж паэзіяй і прозай. Як бы адпачынкам ад іх. Некалі нават напісаў такую аўтаэпіграму:

Са мною справа ясная —
Пара даўно намыліць шыю:
Як не выходзяць вершы
ўласныя —
Я парадзірую чужыя.

І ўсё ж, і ўсё ж... У 1994 годзе выйшаў мой першы парадыйны зборнік "Дуэль", праз год — "Дуэль-2", летась — "Кругі ў галаве". Менавіта апошні і стаў лаўрэатам другога Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу на лепшую кнігу 2007 года ў намінацыі "Сатыра і гумар".

Між тым, цудоўна, што лік намінацый, заснаваных летась, сёлета дапоўніла сатыра і гумар (дзякуй, Мікола Шабовіч!). Не магу сцвярджаць, што ў беларускай літаратуры раскашуе сатыра, а вось гумару, здаецца, крыху ёсць. Шкада толькі, што многія гумарысты абмяжоўваюць сябе выключна парадыйным жанрам: як бы саміх сябе чыхвосцім. Пэўна, па прынцыпе: бі сваіх, каб чужыя баяліся.

А сама статуэтка важкая, уся нават у сумку не змясцілася, не тое, што кніжка-лаўрэат: пятая частка тыражу ўлазіць!

Дарэчы, на асабістым вопыце пераканаўся, што ёсць дзве тэмы, якія хораша ўспрымаюцца любой аўдыторыяй: каханне і гумар. А ў нас нават на радыё і тэлебачанні няма сваіх гумарыстычных праграм. Расія на ўсіх каналах смяецца (хоць я і не прымаю грубы тэлегумар нашых суседзяў), а мы? Сур'ёзная нацыя, што ні кажы. Ды толькі сумна ўсё гэта. Упэўнены, што маглі б і філарманічныя канцэрты гумару ладзіць. Ёсць жа ў нас і пісьменнікі-гумарысты, і самабытныя артысты, і фестываль свой у Аўцюках праводзім... Надта ж не хочацца, каб Зэкаў быў першым і апошнім лаўрэатам-гумарыстам.

Ай, досыць бурчаць. Дабаўлю хіба адно (з кнігі "Дуэль-2"):

Паэты, крыўдаваць не час,
Што парадзірую я вас.
Няхай вас лепей тое цешыць,
Што я чытаю вашы вершы.

Уладзімір ЛІПСКІ
(першае месца ў намінацыі "Дзіцячая літаратура", "Прыгоды Нуліка")

«Як мы з Нулікам і Міколкам дакаціліся да прэміі».

Усе казкі на свеце складваюцца з трох частак: жыў-быў, аднойчы і раптам.

Гэтак здарылася і з маім Нулікам. Ён жыў-быў. Сумна жыў, абы-як. А ўсё таму, што быў адзінокі. Ён быў ніхто, нічый, ніякі.

Аднойчы ветрык-падарожнік пашаптаў Нуліку пра казачнага Калабка. Задумаў і Нулік паспрабаваць шчасця, захацеў пабачыць свету. З дапамогай ветрыку пакаціўся Нулік па зялёнай траўцы, пасля — па сцяжынцы.

Ды раптам Нуліка падняў хлопчык Міколка...

Пачаліся незвычайныя прыгоды Нуліка і Міколкі.

І так шчасліва здарылася з маімі героямі Нулікам і Міколкам, што яны трапілі ажно ў Барысаў, на свята беларускага пісьменства. А там ім, а заадно і мне, як аўтару, на самай урачыстай сцэне ўручылі высокую прэмію, за лепшую аповесць-казку для дзяцей.

Мае "Прыгоды Нуліка", адчуваю, падабаюцца дзецям. Нядаўна я пабываў у Рэчыцы, у дзіцячым садку "Пралеска". Там адбылося свята кнігі. Дык што вы думаеце, мае землячкі настолькі паверылі ў чароўны свет кніжкі, што задумалі, як у кіно, разыграць усе прыгодніцкія дзеі маіх герояў. І ў іх гэта здорава атрымалася.

Днямі я чытаў з мінскімі пачаткоўцамі са школы № 196 ва Уруччы асобныя старонкі з "Нуліка". Мае новыя сябры пыталіся: "Дзе можна знайсці гэту кніжку?" А іх цікаўнасць, як новая прэмія для мяне.

Дзеці — народ творчы, мудры. Працаваць для іх — святая, адказная справа. І рабіць яе трэба так, каб сагравалася, святлела, узвышалася дзіцячая душа.

Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ
(першае месца ў намінацыі "Проза", "Плата за каханне")

«Ну, амаль што так і было...»

Многім чым выклікана мая цікавасць да 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Думаю, найперш данінаю павагі да тых людзей, якім прыйшлося столькі перажыць падчас карэнных грамадскіх перамен: маім родным, найперш, радні, сям'і, аднавяскоўцам...

Задума ж прыйшла не сама па сабе — часта ў дзядулевай хаце, што ў вёсцы Вятчын Жыткавіцкага раёна, вечарамі гучалі ўспаміны пра той час, як і што было на самай справе ў вёсцы, колькі сапраўдных гаспадароў вывезлі няведама куды...

Адтуль, з патаемных глыбінь майго дзяцінства, калі стаў працаваць у журналістыцы, прыйшло жаданне напісаць аповесць пра душэўнае, непадробнае цяпло палешукоў. Дзякуючы парадзе, таварыскай падтрымцы майго настаўніка па пісьменніцкай працы Уладзіміра Саламахі, замахнуўся на раман. Пісаў твор "Плата за каханне" ажно шэсць гадоў. Чаго ён варты — меркаваць чытачам. Я ж удзячны лёсу, роднай зямлі, што змог яго напісаць. Але, мабыць, пакуль у той гісторыі не буду ставіць кропку...

Так сталася, што ўсе мае творы — пра каханне. Незаўважна — за паўтара года — напісаў новы раман "Цяпло маладзіка". Пра тое ж.

Хаця ж, сапраўднае каханне выпадае не кожнаму. Гэта — аксіёма. Галоўныя героі рамана — простыя, грэшныя людзі. І — незвычайныя ад гэтай душэўнай прастаты асобы.

Сяргей ТРАХІМЁНАК
(першае месца ў намінацыі "Дэтэктыўны жанр", "Сіндром выгарання")

Сіндром выгарання

Сярод маіх кніг, напісаных апошнім часам, ёсць дзве, якія адрозніваюцца па спосабе іх напісання. Гэта "Рэха забытай вайны" і "Сіндром выгарання". У прыватнасці, калі "Рэха забытай вайны" складалася на працягу пятнаццаці гадоў з твораў розных жанраў і, урэшце, выйшла ў свет пад агульнай вокладкай, то "Сіндром выгарання" як адзіны твор пісаўся на працягу дзесяці гадоў. Вельмі даўно ўзнікла жаданне напісаць раман пра людзей, якія выбралі сабе сцяжыну барацьбы з сацыяльнымі заганамі і, нягледзечы на змены ідэалагічных і палітычных арыенціраў, сумленна выконваюць свой абавязак.

Аднак грамадства і дзяржава, з аднаго боку, разумеючы, што яны робяць карысную справу, тым не менш, з другога боку, не спяшаюцца ацаніць гэту дзейнасць належным чынам і кампенсаваць, а ў шэрагу выпадкаў і рэабілітаваць страты гэтымі людзьмі свайго здароўя, а іншы раз і жыцця.

У рамане дзве асноўныя лініі: лінія следчага Юрэвіча і ўрача Жывагляда-вай. Гэтыя персанажы не раўназначныя для дэтэктыўнага жанру. І не толькі таму, што ў мяне існавала пэўная складанасць у стварэнні вобраза ўрача-нарколага, у адрозненне ад вобраза следчага (з працай следчага знаёмы практычна, паколькі пасля юрыдычнай ВНУ некаторы час працаваў ім). Складанасць была ў пошуку шляхоў перакрыжавання гэтых прафесій у сучасным жыцці.

Каб заглыбіцца ў дзейнасць урача, спецыяліста па сацыяльных хваробах, стварыць яго праўдзівы вобраз, давялося каля 10 гадоў збіраць па крупінках матэрыял пра дзейнасць нарколагаў і жыццё іх пацыентаў. На маё шчасце і няшчасце адначасова, урачом-нарколагам працавала мая жонка.

Шчасце было ў тым, што я атрымаў магчымасць даследаваць гэты матэрыял, а няшчасце ў тым, што жонка, аддаўшы ўсё жыццё медыцыне, не пазбегла, так бы мовіць, псіхалагічнага "выгарання".

Будучы чалавекам стрыманым і выхаваным старой медыцынскай школай, яна ніколі не выходзіла за межы медыцынскай этыкі, калі справа тычылася яе пацыентаў і калег. Але ў яе жыцці здараліся экстрэмальныя сітуацыі, пра якія я даведваўся. І яны сталі асновай для стварэння медыцынскага фону рамана.

Зразумела, крытыкі і журы, а ў першую чаргу — выдаўцы, вызначылі жанр рамана як дэтэктыў. Але ён, як мне падаецца, нешта большае, таму што побач з дэтэктыўнай інтрыгай раман фіксуе пласт сучасных праблем, а таксама сацыяльныя перакосы, якія ўзніклі на стыку стагоддзяў. Калі адна частка грамадства падчас змен сацыяльных і эканамічных арыенціраў стала абсалютна безабароннай перад другой, а дзяржава засталася ўбаку. Пры гэтым не толькі ў адносінах да тых, хто не можа сябе абараніць, але і ў адносінах службовых асоб дзяржавы, якія працуюць сацыяльнымі маргіналамі і самі трапляюць у сітуацыі так званага прафесійнага дэфармавання і псіхалагічнага выгарання.

Алесь Марціновіч, Уладзімір Вялічка, Васіль Шырко
(першае месца ў намінацыі "Публіцыстыка", двухтомнік "Зямля любові нашай")

Алесь МАРЦІНОВІЧ:

Своеасаблівы міні-партрэт Беларусі

Працуючы ў рэдакцыі часопіса Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не адзін год — мы пабывалі не толькі ва ўсіх абласцях, але і ці не ва ўсіх раёнах нашай краіны. Вынікам гэтых паездак станавіліся нарысы, эсэ, артыкулы, што змяшчаліся ў раздзеле "Улада" часопіса "Беларуская думка". І гэта невыпадкова, бо ў сваіх матэрыялах мы распавядалі пра работу мясцовай вертыкалі, пра лепшых людзей, якія, незалежна ад таго, якую пасаду займаюць, дзе працуюць, робяць усё магчымае дзеля нашай сінявокай Беларусі, каб яна квітнела год ад году, станавілася ўсё больш заможнай і шчаслівай. Пасля з'яўлення ў часопісе чарговай публікацыі, чытачы часта тэлефанавалі ў рэдакцыю, выказвалі пажаданні, а то і... патрабавалі выдаць лепшыя матэрыялы асобнай кнігай, будучы перакананымі, што яна дасць мажлівасць адчуць, чым жыве краіна, што найбольш хвалюе кіраўнікоў рэгіёнаў. Дарэчы, падобнай думкі прытрымліваліся не толькі радавыя чытачы, а і людзі аўтарытэтныя. Прынамсі, аб неабходнасці выхаду такой кнігі часта гаварылі дырэктар Навукова-даследчага інстытута жывёлагадоўлі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі акадэмік Іван Паўлавіч Шайко, доктар сельскагаспадарчых навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, дырэктар Навукова-даследчага інстытута земляробства Міхаіл Анатольевіч Кадыраў ды іншыя аўтарытэтныя людзі, да голасу якіх мы проста не маглі не прыслухацца. Урэшце і вырашылі пайсці насустрач іхнім пажаданням. А паколькі матэрыялаў сабралася шмат дый новыя камандзіроўкі таксама былі плённымі, спыніліся не на адной кнізе, а на двухтомніку. Назвалі ж яго "Зямля любові нашай" таму, што, як нам здаецца, гэта вельмі ёмкая і аб'ёмная назва, якую ў некалькіх словах можна звесці да наступнага — зямля і на ёй чалавек. Чытачам меркаваць, што ў нас атрымалася лепш, што горш, але адно не выклікае сумнення: двухтомнік "Зямля любові нашай" — своеасаблівы міні-партрэт сённяшняй Беларусі. Пазнаёміўшыся з ім, можна атрымаць уяўленне аб тым, чым жыве наша краіна, якія яе дасягненні ў розных галінах дзейнасці. Расказваецца не толькі аб справах працаўнікоў вёскі і работнікаў прамысловасці. Не абыдзена ўвагай і сацыяльна-культурная сфера. Адзін з нарысаў невыпадкова называецца "Грэкаўская акадэмія". У ім гаворка ідзе пра начальніка аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама Анатоля Грэкава, у якога ёсць чаму павучыцца, каб культура ніколі не адчувала сябе падчаркай.

Алімпійцы прыгожага пісьменства

Сярод узнагароджаных ёсць і пісьменнікі, якім таксама падчас святкавання Дня беларускага пісьменства ў горадзе Барысаве былі ўручаны дыпломы і грашовыя прэміі за другое і трэцяе месцы.

Так, напрыклад, у галіне прозы журы літаратурнага конкурсу адпаведна другое і трэцяе месцы прысудзіла Алене Паповай за кнігу "Восхождение Зенты" і Генадзю Пацыенку за двухтомнік "В дождь под Рождество". А сярод алімпійцаў прыгожага пісьменства ў галіне паэзіі другое і трэцяе месцы адпаведна — у Анатоля Аўруціна за кнігу "Наедине с молчанием" і Тамары Красновай-Гусачэнкі за зборнік вершаў "Осень молодая". У галіне ж дзіцячай літаратуры другое і трэцяе месцы за кнігі "Сарамлівы памідор" і "Падарожжа ў краіну загадак" прысуджаны адпаведна Паўлу Саковічу і Міхасю Пазнякову.

Згодна з Палажэннем Саюза пісьменнікаў Беларусі аб правядзенні літаратурнага конкурсу, у галіне публіцыстыкі, сатыры і гумару, перакладу, літаратурнай крытыкі, драматургіі і дэтэктыўнага жанру другое і трэцяе месцы не вызначаюцца. Адзначым аднак, што ў новай намінацыі — песенны жанр — другое месца атрымаў Уладзімір Мазго за кнігу "Анёл нябесны". Трэцяе месца ў гэтай намінацыі таксама не прысуджаецца, тым не менш лаўрэатамі конкурсу за песню "Афганістан" сталі кампазітар Ігар Лучанок, паэт Рыгор Сакалоўскі і спявак Уладзімір Правалінскі.

Трэба адзначыць, што на сёлетнім Свяце пісьменства пераможцаў у галіне літаратурнай творчасці было больш, паколькі прысутнічала пяць новых намінацый: сатыра і гумар, пераклады, драматургія, дэтэктыўны і песенны жанры. Такім чынам, у дыяпазоне дзесяці намінацый і былі вызначаны лепшыя творы.

Сёлетняй адметнасцю з'яўляецца і тое, што па выніках конкурсу статуэткі Саюза пісьменнікаў Беларусі, дыпломы, грашовыя прэміі атрымалі і юныя таленты літаратурна-творчага аб'яднання пры ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі" "Дрэва жыцця" — Алена Бурак, Вольга Старавойтава, Лізавета Ліпай. Узнагароды дзецям уручылі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Барысаўскай выбарчай акрузе Віктар Аляксандравіч Гумінскі і намеснік генеральнага дырэктара СП "Фармлэнд", прафесар Вадзім Валянцінавіч Сянчук.

Напярэдадні Дня беларускага пісьменства, як і падчас яго правядзення, празаічныя і паэтычныя кнігі, бібліятэчкі Саюза пісьменнікаў Беларусі атрымалі прадстаўнікі многіх замежных пасольстваў, бібліятэка Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, дзяржаўныя, абласныя і раённыя грамадскія ўстановы і арганізацыі. З іх каля 400 кніг — з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў.

Кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў Беларусі словы ўдзячнасці выказала "Беларусбанку", "Белаграпрамбанку", "Белінвестбанку", якія аказалі фінансавую падтрымку для заахвочвання пераможцаў II Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ

Два погляды на адну кнігу

Даражэй за ўсё – святло вячэрняе...

Паэт, у адрозненне ад дзяржавы, не можа абвясціць сваю незалежнасць ад астатняй літаратуры, таму, гаворачы пра паэта, немагчыма абмінуць увагай мноства праблем, так або інакш датычных яго.

"Почила в бозе" руская паэзія. Нельга ж сур'ёзна прымаць за літаратуру друз, які друкуецца цяпер. ... Не спрабуйце ў Маскве выявіць жывога паэта. Вы што, "Литературку" не чытаеце? Не бачыце, каго яна друкуе? Сталіца — суцэльнае Ваганькава.

У правінцыю трэба ехаць. Жывы яшчэ, дзякаваць Богу, у Трубчэўску Сцяпан Кузькін, які выпусціў нядаўна выдатную кнігу "Золотая тропа".

Культурны пласт рускай літаратуры захаваўся сям-там і ў былых рэспубліках СССР. Напрыклад, у Беларусі ведаю трох-чатырох паэтаў, здольных заявіць пра сябе на суветным узроўні. Толькі выдайце, чорт вазьмі! Гэта я да расійскага боку звяртаюся.

* * *

Даўні мой сябар Віктар Козыраў некалі казаў: "Да паэта нельга набліжацца. Меркаваць пра яго варта на адлегласці". Колькі разоў пераконваўся, што ён мае рацыю.

У паўсядзённым жыцці з Анатолем Аўруціным я амаль не сутыкаўся. Адна-дзве сустрэчы. Мяркую пра яго, як і раіў Козыраў, на адлегласці. Спадзяюся — аб'ектыўна. Пазнаёміўся з ім на чарговым пасяджэнні салона "Сустрэчы на Замкавай". На дзвярах Гомельскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Герцэна некалькі гадоў таму з'явілася аб'ява пра сустрэчу з "ведущим" рускамоўным паэтам Беларусі А. Аўруціным, якая неўзабаве мела адбыцца. Памятаецца, гэтая аб'ява закранула маё самалюбства. А я, выходзіць, "плетущийся следом"?

Сустрэча з паэтам упэўніла, што Аўруцін па праве быў названы "ведущим". Куды? Час паказаў — да цяперашняга Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гэта ўжо гісторыя. І не аспрэчыць дачыненне да яе Аўруціна. Не адцясніць плячом.

А вось з азначэннем "рускамоўны" я быў не згодны, пра што і сказаў на сустрэчы, і сёння паўтараю: Анатоль Аўруцін — рускі паэт. У такой жа ступені, як Джозаф Конрад — англійскі пісьменнік, хоць па паходжанні — паляк.

Цяпер пра назву апошняй па часе выхаду кнігі паэта. Цыялкоўскі сцвярджаў: чалавецтва паступова ператворыцца ў прамяністую энергію. Вось такое святло ў канцы тунеля...

"Свет вечерний"... Ён больш каштоўны за ранішні, таму што развітальны. Не словы ператвараюцца ў святло. Уся духоўная і фізічная энергія паэта пераходзіць у іншы стан. У святло, а не ў прах. Не кожнаму дадзена пацвердзіць справядлівасць думкі вялікага навукоўца...

* * *

Элегантны томік выбраных вершаў — прыемна ў руках патрымаць — увабраў у сябе толькі маленечкую частку таго, што хацелася б перачытаць. Пэўна, не мне аднаму ўпадабаныя вершы прыемна сустракаць у новых выданнях. Нейкае новае святло ад іх. Яны ўспрымаюцца як абноўленыя.

Струменіцца "свет вечерний" другой паловы жыцця, і марудзіш перагортваць старонкі. Добра, што існуе такі цуд, як кніга, і можна па сваім жаданні запавольваць плынь жыцця.

К. Федзін неяк сказаў: "Добрая мова тая, якую не прыкмячаеш". Мне хацелася б паўтарыць гэтыя словы кажучы пра культуру верша, пра форму Аўруцінскіх вершаў.

Веранда. Полдень.
Дождь отвесный.
На всем — напрасности печать.
И мне совсем неинтересно
От женщин письма получать.

Погляд слізгае па радках, нібы абмытым дажджом. І разумееш — гэта не толькі паэзія, але і жывапіс. Успомнілі карціну Герасімава? А далей — душэўная драма, якая прымусіла напісаць гэты верш.

Аўруціну цесна сярод сучаснікаў. Ён вольна перасоўваецца ў прасторы рускай паэзіі. Чуе думкі старога Дзяржавіна:

А кто теперь войдет
с листочком?
А кто теперь?.. А кто теперь?..

Тут і нецярпенне, і асцярога, і чаканне будучых перамен. Усе памятаюць словы ліцэіста Пушкіна пра тое, як слухаў яго Дзяржавін, але не ўсе памятаюць злую рэпліку Аляксандра Сяргеевіча наконт таго, што Дзяржавін не ведаў толкам рускай мовы. Вось таму і хваляванне: *"А кто теперь?.. А кто теперь?..."*

Хтосьці з вялікіх сказаў: "Каб стаць пісьменнікам, трэба мець нешчаслівае дзяцінства". Няшчасці рознымі людзьмі ўспрымаюцца па-рознаму.

Памятаеце ясенінскае:

Ничего, я споткнулся о камень,
Это к завтрему заживет.

Не ва ўсіх зажыло. Памятаюцца дзіцячыя крыўды, дарослае выгнанства. Яны і нарадзілі паэта Аўруціна.

Ну и пусть...
А со школьными гадами
Он не встретится до сентября.

Колькі мінула верасняў. А гады паранейшаму поўзаюць і джаляць цішком. І жыве ў душы паэта:

Странный мальчик
с испуганной шейкою
И тетрадочкой в хилых руках.

Але цяпер не адзін сшытачак у яго руках. 17 уласных кніг, анталогія "Сучасная руская паэзія Беларусі", часопіс "Няміга новая літаратурная". І падымацца трэба з гэтым грузам усё вышэй, куды няма прыступак.

Ёсць у Аўруціна асаблівасць, з якой часцяком сутыкаецца ўважлівы чытач, пакінутая, пэўна, з блазенскіх гадоў. Падражніць, але гэтым разам не "школьных гадаў", а класікаў.

"Какая ночь!" – усклікае Фет.

"Какая ночь!" – усклікае Аўруцін.

"Вот бреду я вдоль большой дороги", — самотна ўздыхае Цютчаў.

"Я бреду по забытой дороге", — паўтарае Аўруцін.

Ды не па забытай дарозе "бредет", а, выходзіць, па збітай.

"И в крылатке влетал еще старец хохлатый", — радок з "Лукоморья" Л. Мартынава.

"И крылатку свою просто брошу в траве напоследок!". Правільна, Аўруцін. Чаго шкадаваць чужое дабро.

А вось верш пра блажэнную Юльку напісаны яўна пад уплывам ірландскага паэта Йетса.

Ну, хопіць, хоць у запасе ў мяне нямала такіх стрэмак. "Не грех свое взять у кого-то!" — казаў у такіх выпадках Дзмітрый Кавалёў...

Пакінем дробныя прыдзіркі. Вось цудоўны ва ўсіх адносінах верш "Переулок... Ни собак, ни лая".

Часам Анатоля Юр'евіча пакідае дабрадушнасць. Успыхвае садызм. Ён піша такія вершы, як "Нерон", "Арестант. 1863", быццам прымерваючы на сябе чужую скуру. Вы не задумваліся: кожны з нас мог нарадзіцца ў іншы час кімсьці іншым?

Ёсць у Аўруціна верш, да якога я вяртаюся не раз. Ён пра тое, што даўно лунае над кожным, хто піша вершы. Некалі гэтую краіну — маю на ўвазе па звычцы СССР — называлі самай чытаючай. Прайшло нейкіх пятнаццаць гадоў — вымірающь нашы чытачы. Нярэдка можна пачуць пытанне: "Для каго вы пішаце?" Што адказаць "пітэкантрапам", заклапочаным адным, — забіць маманта, то бок здабыць ежу, набыць машыну, дагнаць амерыканца. А навошта яго даганяць, калі ён едзе ў іншым напрамку?

"Пітэкантрапу" мне няма чаго сказаць. Вось і Аўруцін пытаецца:

С кем поделиться? Блок в могиле...
И Тютчев... И помещик Фет...
Иных при жизни позабыли.
Кого-то не было, и нет.
Теперешние?.. То — не ново,
У этого фальшива речь.
Как скучно!
Вдруг нагрянет слово...
А перед кем его изречь?

У мяне падазрэнне: вялікія паэты былі таму, што былі вялікія чытачы. Зайдзіце ў любую маласямейку, дзе мацюкі, тытунёвы дым, гарэлка, распуста... Патрэбныя тут вершы? Гэтыя, з дазволу сказаць, гома сапіенс абыходзяцца мінімумам слоў — і ўсе нецэнзурныя. Ці не падаецца вам, што з дваццаць першым стагоддзем ідзе не слова, а эра азвярэння? Усе прыкметы ў наяўнасці.

Пэўна, я — іншапланетнік. Не разумею, навошта людзям свінства? І вось задаюць пытанне: "Навошта вы пішаце вершы?" Для таго, каб людзі жылі на планеце Зямля! Каб яны ўспрымалі такія вершы.

С вечера то схлынет,
то нахлынет...
Прямо в хмарь отворено окно.
Захребетьем чувствуешь —
отныне
Все в душе твоей отворено.
И, гоня жестокую тревогу,
Что вон там последняя межа,
Не дыша выходишь на дорогу...
Ни души... Но все вокруг — душа.

Такія вершы змяняюць духоўны свет без рэвалюцый. Яны і патрэбныя для таго, каб не здаралася дзікіх бунтаў.

Пра тое ж верш "Яблочно... Чуть мотыльково". Нюансы. Паўтоны. Толькі тонка аркестраваная душа зможа ўспрымаць такія вершы. Болей бы ў нашым жыцці Грыга, Вівальдзі, а не жалезабетоннага грукату сучаснай музыкі.

* * *

Творы розных гадоў адкрываюцца вершам "Грушевка". Проза жыцця і паэзія. Пасляваенны час. Дзейныя асобы — бабы, што засталіся без мужоў.

Стирали обноски ребячьи
Да мелкое что-то свое.
И дружно глазами тоскуя,
Глядели сквозь влажную даль
На ту, что рубаху мужскую
В тугую крутила спираль.

Ды нават калі б Аўруцін напісаў толькі гэты верш, і тады ён мог бы лічыцца значным паэтам, які сказаў пра жыццё суровую праўду.

Не маю ахвоты слупянець ад кожнага верша. Навошта я буду падрабязна аналізаваць "Тленом станут и эти смешливые губы". Перачытайце "Падаль" Бадлера — у яго гэта сказана больш бязлітасна.

У мяне быў прыяцель Алег Вашчанка. Калі яго папракалі, што ён мала піша, ён адсылаў такога куды далей. Па яго меркаванні, Гай Валерый Катул пра ўсё напісаў, так што няма чаго псаваць паперу.

А вось Аўруцін так не лічыць і, як Давід, спрабуе перамагчы Галіяфа.

Прычым варта ўлічыць і такую акалічнасць. У творах, нечым падобных паміж сабою, можа быць розная танальнасць. Імпрэсіяністы часта выкарыстоўвалі гэты прыём. Прыгадаем серыю лонданскай смугі Клода Мане. "Падаль" Бадлера і "Тленом станут и эти смешливые губы" рэзка адрозніваюцца адно ад аднаго менавіта танальнасцю, тэмбрам голасу. Гэта розныя творы. Алей і графіка.

Цяжкі характар у паэта Аўруціна. Шмат што не задавальняе яго ў вершах папярэднікаў і сучаснікаў. Анатоля Юр'евіча апаноўвае творчы сверб перапісаць усё напісанае да яго, бо яно напісана не так...

Ну, скажам, хто толькі не пісаў пра конскія сляды на дарозе. Што новага тут можна адкрыць? Аўруцін знаходзіць на збітай дарозе сваё — "оспины подков".

У яго шмат вершаў, якія падабаюцца, невядома чаму. "Только грохни ведром — отзовется тоска мировая" з іх ліку. Падаецца, створана яно, калі яшчэ і самому аўтару была не ясная яго таямніца. "Значит, так надо", — як пісаў ён у іншым вершы.

А яшчэ ён ведае: жыццё вакол пякельнае, "но отсюда восходят на небо угрюмые боги". І зноў: "Так надо".

Часам падаецца, некаторыя знаходкі паўсталі выпадкова, як падказка, і толькі ў працэсе напісання аўтар паверыў у іх. Напрыклад, ён паўтарае: "Но я не об этом". Без гэтых слоў не было б верша.

Некаторыя радкі могуць жыць як самастойны твор.

Всю жизнь выходит на Отчизну
Оконце узкое мое.

Не такое вузкае, між іншым...

Няўтульнасць, бяздомнасць... Падаецца, не Блок, а Аўруцін прамовіў: "Выхожу я в путь, открытый взорам". Выхад на заветраную прастору — гэты матыў стала прысутнічае ў вершах Анатоля Юр'евіча. Блок сцвярджаў: у рускага паэта павінна быць пачуццё шляху, інакш ён не паэт. Я б сказаў: вобраз мітуслівага перакаці-поля паўстае ў шматлікіх вершах Аўруціна. Гэта ідзе яшчэ ад цютчаўскіх радкоў. Памятаеце: "из града в град судьба, как вихрь..." Ну і гэтак далей...

Вось і Аўруціну трызніцца прастора, "где лишь ветер и Бог". Ветравей тут — лёс. Бог — тая інстанцыя, да якой апелюе паэт у тым няўстойлівым свеце, дзе:

Подпёртые стволы облезлы
и хромы,
А мокрые дома бесформенны
и шатки.

"Автодоровка. Детство" захоўваюць рэчыўнасць, сюжэтнасць ранніх вершаў Аўруціна. Па сутнасці, гэта маленечкая, сціслая паэма пра дзяцінства.

Горкі, нават жорсткі верш "Как призрачно все!.. Как мгновенно!" пра лёс рускіх паэтаў. Гумілёў, Ясенін, Пастэрнак, Рубцоў...

Подла абышоўся з імі час. Але магло быць горш.

...А если захватят при жизни
Окстись... И от горя заплачь...

* * *

Вяртаючыся да выказанай у пачатку артыкула думкі пра смерць рускай паэзіі, распаўсюджу такі выпадак.

Сканаў адзін мой знаёмы мастак. Яго спрабавалі вярнуць да жыцця — усе высілкі былі марнымі. Афармілі паперы пра смерць і разышліся. Позна ўжо было. Стаміліся. А нябожчыка пакінулі прывязаным да стала.

Праз нейкі час моцны ўнутраны штуршок прымусіў яго расплюшчыць вочы. Карацей — уваскрос, урачы былі незадаволеныя: дарма паперы афармлялі...

Я яго сустракаю часцяком у той жа бібліятэцы імя Герцэна. Раней ён выпіваў. Пасля "паўстання з мёртвых" яго пацягнула на вершы. Выдаў некалькі зборнікаў. Прыняты ў сябры СП Беларусі. Робіць уражанне абсалютна жывога чалавека. Здаецца, не прыкідваецца.

Магчыма, уваскрэсне і руская паэзія. Тым больш, у ёй прысутнічаюць такія паэты, як Анатоль Аўруцін.

Юрый ФАТНЕЎ

Пушкін плача...

Анатоль Аўруцін — "адкрыццё" апошніх год у галіне паэзіі. Сёння — гэта вядомы факт. Некалькі крытыкаў ды калег аўтара па творчасці пра тое заявілі публічна і гучна. Уступны артыкул А. Андрэева да кнігі А. Аўруціна "Наедине с молчанием" літаратурны люд проста "расхапаў на цытаты". Самыя папулярныя радкі такія: *"Не скажешь, что Аврутина не замечают; но его не замечают как первоклассного поэта, вполне нобелевского по своему формату. Разве он не сопоставим с тем же Бродским?"*

Не менш красамоўна выказаўся яшчэ адзін крытык, у артыкулах якога ключавымі словамі зрабіліся "*талантливый*", "*зрелый*", "*оригинальный*", "*признанный*", "*интересный*", "*большой, широко известный мастер*" і інш.

Сказаць, што я не згодная з гэтымі меркаваннямі — гэта нічога не сказаць. Але паколькі "феномен" А. Аўруціна вымагае разваг і пра эпігонства ў літаратуры, і пра фарысейства ў крытыцы (што ніяк не ўціснецца ў рамкі аднаго артыкула), абмяжуюся разглядам адной кнігі аўтара.

Зусім нядаўна "*большой, широко известный мастер*" А. Аўруцін выдаў чарговую кнігу — "Свет вечерний" (Избранные стихотворения). Як вядома, выбраныя творы — самыя моцныя, па-мастацку дасканалыя. Таму, верагодна, па гэтым зборніку можна меркаваць і пра творчасць аўтара ў цэлым.

Адназначна патлумачыць уражанні ад кнігі немагчыма... Хаця, калі сказаць науprост, дык гэта адчуванне... блюзнерства. Падобныя пачуцці я зведала ў час прагляду спектакля "До и после" ў тэатры на Таганцы (пастаноўка Ю. Любімава). У аснову "брыкалажа" (гэтая жанравая атрыбуцыя літаральна азначае "наступствы непрадказальныя") была пакладзена паэзія Мандэльштама, Севяраніна, Блока, Гумілёва, Цвятаевай, Ясеніна, Маякоўскага ды іншых класікаў. Большасць з іх выстаўлялася ў самым непрывабным выглядзе: Ахматава, Купрын і Валошын — алкаголікамі і мярзотнымі цынікамі, Бродскі — апошні прадстаўнік сярэбранага веку рускай паэзіі — проста шаленцам. Ролю Бродскага выконваў В. Залатухін, які галёкаў па сцэне ў фраку і красоўках (убор — намёк на нобелеўскую прэмію паэта) і, вырачыўшы вочы, істэрычна гарлаў вершы. Апроч прыкрасці ды агіды пошлае відовішча не выклікала ніякіх адчуванняў. Гледачы сядзелі прыгаломшаныя. Аднак былі і такія, што актыўна "рукоплескали", выкрыквалі "браво!", а пасля цугам павалакліся на сцэну з букетамі кветак...

Безумоўна, у вершах А. Аўруціна падобнага замаху на класікаў няма. Тут іншае. Ужо неаднаразова ў літаратуры назіралася такая з'ява: калі творца шчыра пераймае стылістыку, паэтыку ды эстэтыку ў папярэднікаў, дык пачынае шчодра памінаць іх у сваіх творах (маўляў, вось яны — мае літаратурныя настаўнікі...) І тады ўжо яго ўласная творчасць быццам бы мае падставы называцца не "падробкай", не "малпаваннем", а "школай" (!).

Сваю прыхільнасць да славутых паэтаў сп. Аўруцін выказвае ледзь не ў кожным вершы. У адным:

С кем поделиться? Блок в могиле...
И Тютчев... И помещик Фет...

У другім:

Раскрытый Тютчев... Смятая кровать.
Четвертый день раздумчивого мая.

У трэцім:

Век серебряный... Без суесловия
Шёл сквозь выстрелы, гогот, раздрай,
Что гремела страна Гумилёвия,
А вокруг — Северянинский край.

Асабліва дзіўнымі падаюцца развагі аўтара адносна самой паэтычнай творчасці.

Сравнимой с письмом Гумилёва
Должна быть шальная строка,
.....

Есенинской ранью повеять
Должно из туманной дали.
.....

Кем нужно родиться, однако,
Чтоб выдохнуть, сердце губя,
Чтоб родина, как Пастернака,
Кляла и топтала тебя?

Пытанні, якімі задаецца аўтар, маюць, па-мойму, вельмі простыя адказы. Каб дараўняцца да "вялікіх папярэднікаў", найперш не трэба пераймаць іх стыль, не трэба гвалтам цягнуць у свае творы чужыя вобразы... Карацей, не варта пісаць ні як Гумілёў, ні як Ясенін, ні як Рубцоў... Паэзія каштоўная самабытнасцю, самастойнасцю, арыгінальнасцю, непадробнасцю... Але, аднак, маецца, сп. Аўруцін прытрымліваецца іншага меркавання. Бо першае, што заўважаецца ў яго вершах, — гэта імітацыя самой тэхнікі вершабудовы паводле ўзораў рускіх класікаў. Возьмем, напрыклад, славуты верш Ахматавай:

Двадцать первое. Ночь. Понедельник.
Очертанья столицы во мгле.

Версія А. Аўруціна:

Веранда. Полдень. Дождь отвесный.
На всём напрасности печать.

Або — яшчэ адна версія:

Новолунье... Третье Мандельштама...
Горький привкус Спаса-на-Любви...

І яшчэ:

Озеро. Полночь. Дорога
Еле заметна впотьмах.

(Хаця — не. Гэта, відаць, бліжэй да Блока: "Ночь, улица, фонарь, аптека...")

Перазовы з класічнымі ўзорамі паэзіі сустракаюцца ў вершах А. Аўруціна на кожным кроку — у рыфмах, вобразах і нават эмоцыях. Не раз і два, напрыклад, мы сустракалі ў творах класікаў эмацыянальны зачын "Какая ночь!": у Пушкіна — "Какая ночь! Мороз трескучий..."; у Фета — "Какая ночь! Как воздух чист..."; у Ясеніна — "Какая ночь! Я не могу..." Вось і сучасны паэт не прамінуў далучыцца да вялікіх:

Какая ночь!.. И снова от тоски
Терзает кровь набухшие виски...

Або яшчэ. Калісьці Блок прамовіў:

Я — Гамлет. Холодеет кровь,
Когда плетет коварство сети...

Сучасны калега па цэху бярэ "вышэй":

Я — кровавый Нерон...
Так идёт сквозь века...

Нямала ў паэзіі А. Аўруціна і іншых відаў перайманняў. У прыватнасці — рыфмаў у чыстым выглядзе. Так, напрыклад, чытаючы верш "*талантливого*" і "*оригинального*" паэта "И снова осень... Звук заледенелый...", адчуваеш, што цябе "терзают смутные сомненья". Штосьці надзвычай знаёмае чуецца ў радках:

Он полыхает мерно, в такт дыханью
Того, кто над неприбранным столом
Всё тщится в мысль
упрятать мирозданье,
Еду и сон упрятав на потом.

Варта крыху напружыць памяць, і прыгадваюцца радкі любімага А. Аўруціным (і вельмі паважанага мною) Афанасія Фета:

Не жизни жаль
с томительным дыханьем,
Что жизнь и смерть? А жаль того огня,
Что просиял над целым мирозданьем,
И в ночь идет, и плачет уходя.

Скажаце, — "дробязь"? Дык з гэтых дробязей сатканана большасць твораў "*интересного*" паэта. Трошкі — адтуль, крышку — адгэтуль... І вось вам — "*поэзия нобелевского формата*"!

Сярод твораў А. Аўруціна сустракаюцца і такія вершы, рыфмы з якіх (калі прыгадаць правобразныя аналагі) набываюць камічнае гучанне. Напрыклад:

Полусвет как будто смешан с ядом,
И своё, беззвучное, шепча,
Всё гадаешь — звуком или взглядом
В тишине колеблема свеча?

Гэты верш няўхільна выклікае ў памяці радкі "пралеткультаўскага" паэта У. Кірылава, што гучаць "из прекрасного далёко" як адказ сучаснаму аўтару:

О, не знать бы отравленных ядом
Этих жутко-звенящих стихов,
Улыбнуться бы солнечным взглядом
И упиться дыханьем цветов!

Нельга абмінуць увагай яшчэ адзін напрамак творчасці "*интересного*" паэта. Вядома, што філасофская лірыка заўжды мае інтэлектуальны пачатак, яна асэнсоўвае складаныя праблемы свету, быцця... А вось узоры філасофскай лірыкі А. Аўруціна — нагадваюць спробу адказаць на пытанне "ці ёсць жыццё на Марсе?".

Квохчет капризная птаха
Полночью в темном саду.
Ночью не сохнет рубаха,
Утром кислинка во рту.
.....
И не отыщешь ответа,
Жизнь проживая взаймы:
Тьма ли родится из света,
Свет ли родится из тьмы?..

Шмат у творах А. Аўруціна элементарнай неахайнасці: тут і няўдалая метафорыка, і лексічныя недакладнасці, і стылістычныя парушэнні, і яўныя сэнсавыя памылкі. Напрыклад, у працытаваным вышэй вершы. Справа ў тым, што "капризные птахи в тёмном саду" робяць што заўгодна — "поют", "щебечут" і нават, як сцвярджаў класік, "полощут горло". Толькі не "квохчут". Квохчуць, па маім глыбокім перакананні, куры. Да гэтага ж шэрага адносіцца яшчэ адзін прыклад:

Еще жара, но клекот уток
Уже пророчит холода.

Што ж, трэба будзе прыслухацца. Дасюль падавалася, што "утки" схільны "крякать", а "клекот" ідэнтыфікаваўся пераважна з буслам...

Падобных недакладнасцяў у творах А. Аўруціна надзвычай многа:

Вдали за речкой огонек
Чадит бездумно и безвольно.

"Вдали за речкой огонек" — можа "гореть", "дымить", у рэшце рэшт, "мигать"... "Чадит" тое, што побач, што бачыцца выразна: свечка, керасінка або такі "огонёк", пра які пісаў Э. Асадаў:

Огонёк чадит в жестянке,
Дым махорочный столбом.

Возьмем радок з іншага твора А. Аўруціна: "Мы все живём под нитью Ариадны". Чаму "живём"? Па-мойму, і па логіцы, і паводле старажытнагрэчаскага міфа "мы все идём за нитью Ариадны". Дастаткова нават прыгадаць радкі Брусава:

Вперяю взор бессильно жадный:
Везде кругом сырая мгла.
Каким путём нить Ариадны
Меня до бездны довела?

Возьмем яшчэ адзін верш. Чытаем:

Вот так и столпились они у предела:
Без духа — душа и бесплотное тело.
Столпились... И только безмолвно гадают,
А что они завтра ещё потеряют?..

Было б натуральна, каб двое (хто б гэта ні быў, нават "душа" і "тело")ці "встретились", ці "сошлись", ці "столкнулись"... Бо двое — гэта ніяк не "толпа".

Нярэдка дзеля захавання рытму і рыфмы верша аўтар выкарыстоўвае недарэчныя варыяцыі слоў, кшталту:

И вновь летят в полумгле минуты,
И вновь за шумом не слышно слов.
Но, не распятый и не распнутый,
Белесый сумрак восходит вновь.

Сустракаюцца ў творах А. Аўруціна і зусім камічныя выпадкі, кшталту: "Портье! Портвейну пора плеснуть..." Парцье, як вядома, — той, хто сядзіць у гатэлі за канторкай ды выдае ключы. Па-мойму, каб чаго-небудзь "плеснули", варта паклікаць афіцыянта ці метрдатэля. (На крайні выпадак (дзеля захавання рыфмы) можна было б выкарыстаць універсальнае слова "лакей").

А вось проста унікальны вобраз:

И гипсовый Сергей Есенин
С челом, уткнувшимся в салат...

Бачыла шмат помнікаў Ясеніну, але каб "с челом — в салат"!..

Яшчэ адна перліна вобразнасці: "...Блаженная Юлька, что пляшет себе в камышах". Справа ў тым, што "камыш" (чарот) расце ў забалочаных месцах, паспрабуй там "спляши"!

Яшчэ адзін прыклад:

Хочу в Лицей... Там дух маячит,
Взахлеб расталкивая тьму.

Не ўяўляю, як можна "расталкивать" штосьці або кагосці "взахлёб"! Верагодна, аўтар меў на ўвазе "взашей"? Між іншым, цалкам чатырохрадкоўе гучыць так:

Хочу в Лицей... Там дух маячит,
Взахлеб расталкивая тьму.
Дуэль не скоро... Пушкин плачет...
И сам не знает, почему....

Сказаць па шчырасці, я здагадваюся чаго Пушкін плача...

Лада АЛЕЙНІК

Сказ, як літаратурны жанр, ды яшчэ ў паэтычнай форме ў нашым прыгожым пісьменстве не прыжыўся — скончыўся на "Лысай гары", у аснову якой пакладзены сапраўдныя падзеі, рэальныя дзеючыя асобы і антураж. У шырокім жа значэнні сказ — гэта прыдумка, небывальшчына з нечувальшчынай, казка з мараллю (успомнім пушкінскае "Сказка — ложь, да в ней намёк»...")

Залаты паясок дабрыні

Да чаго падводжу? А да таго, што зусім нядаўна пабачыла свет новая кніжка сказаў і апавяданняў Антона Параскевіна "Светлозор". Кніжка ўдумлівая, вынашаная душой і сэрцам. Чытаючы яе, акунаешся ў дзівосны паэтычны свет і ў яго прывідным святле шукаеш і не знаходзіш тое, пра што думаеш сам, апускаючыся з неба на зямлю разам з яе героямі, і тут жа ўзгадваеш радок з названай кніжкі: "правдой живут лишь безмен да дурак".

Чытаючы сказы Параскевіна, прыпамінаю "Шляхціца Завальню" Яна Баршчэўскага. Барані Бог — у Антона не падробка і нават не наследаванне. Проста і там, і тут поплечкі з прыдуманымі героямі смяюцца і засмучаюцца, любяць і ненавідзяць жывыя людзі, б'юцца за сваё існае, чалавечае. Палоніць высокая паэтыка твораў, змешчаных у зборніку.

Дазволю сабе крыху падрабязней спыніцца на "Сказе о Назаре и русалке". Калі сцісла, то сэнс яго зводзіцца ўрэшце да таго, што не нейкія там дзядкі, цары, дамавікі, чыстая і нячыстая сіла дапамогуць стаць заможным і шчаслівым. Няхай сабе нават такая русалка, што "даже в ночи не сидела без дела, дом весь обула она и одела". Толькі рукамі і потам, сахой, а не дзівоснай русалчынай касой можна і трэба араць, сеяць, збіраць ураджай, каб застацца з хлебам, да якога абавязкова прысуседзіцца потым і песня. А што яшчэ трэба для шчасця?

Паэтычная палітра сказаў асветлена і афарбавана ўсімі колерамі і гукамі паэтавых думак і памкненняў, якія настройваюць чытача на адпаведны лад. Паўнагучная рыфма, выверанны, нібыта сэрцам, рытм, ёмкія вобразы.

Прыклады паўсюль:

В городе боярила зима,
По улицам ходила удалая,
Вся в жемчугах:,
в дохе из горностая,
Летучей тройкой
правила сама.

Назіральнасць аўтара, трапнасць паэтычных дэталей навідавоку. Вось толькі некалькі з іх: "ночью в отместку в углы избушки бил колотушкой трескун-мороз" — зіма; "солнце уже — золотой цыпленок — стало дырявить снега в полях" — вясна; "вот и июль уже златокудрый достал из пригорошни колоски" — лета; "по хатам; по улочкам взад и вперед ходит хозяином умолот" — восень. Хораша, пагадзіцеся, гучыць: "красное лето, как полог запечный, тихо качалось и жаром дышало", "домик, как веки, сомкнул занавески".

Уключыў аўтар у сваю кніжку і некалькі апавяданняў. Яны — кароткія, праўдзівыя ад слова да слова, запамінальныя і спагадлівыя.

Кніга адбылася таму, што адбыўся, як чалавек, яе аўтар — доктар і краязнаўца, збіральнік і захавальнік усяго свайго неад'емнага і кроўнага. Збылася мара майго самага блізкага па часе і месцы нараджэння земляка Віктара УЛЮЦЕНКІ — такое сапраўднае імя і прозвішча аўтара сказаў. А сам ён з уласцівай сціпласцю сам пра сябе напісаў так:

Я войду к вам в жилье,
никому не грозя, не переча,
Незаметно и тихо еще
до ночной темноты,
Никому не мешая,
как поздний сиреневый вечер,
Чтобы тихо связать
золотой поясок доброты.

Алег САЛТУК

Зоркі над Горкамі

Горацкі край здаўна славіцца і па праве ганарыцца сваімі літаратурнымі традыцыямі. У 1799 годзе Горкі наведаў паэт Гаўрыла Дзяржавін, сюды дасылалі лісты Леў Талстой і Іван Тургенеў. Тут вучыліся, працавалі Максім Гарэцкі, Юрый Гаўрук, Нэля Тулупава. На горацкай зямлі нарадзіліся Леў Разгон, Васіль Каваль, Георгій Шчарбатаў; у Горках неаднойчы бывалі Янка Купала і Якуб Колас. Па сцвярджэнні аўтарытэтных гісторыкаў, тут была напісана паэма "Тарас на Парнасе", аб чым ускосна сведчыць і ўзгорак на тэрыторыі Беларускай сельгасакадэміі з той жа назвай "Парнас". Традыцыйна ўзнікалі і плённа дзейнічалі (як правіла, пры Горацкай навучальнай установе) усемагчымыя грамадскія гурткі, у тым ліку літаратурная філія "Аршанскі маладняк".

У 1986 годзе пры Горацкай раённай бібліятэцы было створана літаб'яднанне "Роднае слова". У 1990 годзе яно перайшло ў ведамства мясцовага гісторыка-этнаграфічнага музея, а ў 1995 годзе аб'яднанню было прысвоена ганаровае званне "народнага". Цяпер яно налічвае каля двух дзесяткаў чалавек. Сюды ўваходзяць людзі розных узростаў і прафесій: настаўнікі, выкладчыкі акадэміі, журналісты, медыцынскія работнікі. Гэта і пачынаючыя літаратары, і тыя, у каго за плячыма не адзін зборнік і публікацыі ў вядучых беларускіх і замежных выданнях. Сярод яго ўдзельнікаў і члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Ніна Кавалёва і Міхаіл Уласенка.

За апошні час трывала ўвайшлі ў практыку творчыя вечарыны, прэзентацыі кніг, конкурсы маладых літаратараў, сустрэчы з мясцовымі і вядомымі беларускімі паэтамі і пісьменнікамі. Давайце і мы з вамі, паважаныя чытачы, паспрабуем уважліва прыслухацца да нашых горацкіх матываў. І, думаю, кожны з вас пачуе ў іх нешта сваё, бясконца знаёмае і роднае...

Людміла Дзеружкова, кіраўнік народнага літаратурнага аматарскага аб'яднання "Роднае слова"

Аляксандр КЛАЧКОЎ

Аляксандр Віктаравіч Клачкоў нарадзіўся ў 1952 годзе ў вёсцы Ваўкавічы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Доктар тэхнічных навук, прафесар. Працуе загадчыкам кафедры сельскагаспадарчых машын БДСГА.

ПАЛАНЕЗ

Назаўжды знікае кожны дзень,
З Сонцам развітаўшыся над лесам,
Напаўзае доўгай ночы цень,
І гучыць расстанне паланезам.

І гады лятуць у чарадзе,
Стынуць закаваныя ў жалезе.
Літасці ў жыцці няма нідзе,
Можа, ёсць яна у паланезе?

Назаўжды боль страты родных душ —
Быццам бы пякучыя парэзы.
У пару бясконцых белых сцюж
Не сціхаюць гукі паланеза.

ДЗВЕРЫ ШЧАСЦЯ

Адчыніліся насцеж дзверы
У вялікую залу палаца,
У царкву зразумелае веры,
Дзе прарокаў не трэба баяцца.

За дзвярыма — сімфонія Сонца
Светлым колерам льецца звысоку,
І хоць цягнецца зала бясконца,
Ды прастора не страшная воку.

І спакойна за тымі дзвярыма,
Нават часу хады не чуваць:
Побач від старажытнага Рыма,
Зорны водар, жаданне спяваць...

СВАЁЙ ПАРОЮ

Нібыта сон, успомню маладосцьь
І сэрца зноў не знойдзе супакою,
Напэўна, край дзівосны недзе ёсць –
Заўсёды там чакаюць нас з табою.

Там рэкі скрозь, што мыюць берагі,
Якая моц вакол жыццём кіруе!
І заціхаюць на вадзе кругі,
Нябачна моц вады вакол віруе.

І думкі, як няспынная рака,
Нясуць за небакрай і далягляды.
Дзе нейкая пяшчотная рука
Заслонай стане ад бяды і здрады.

Ніна КАВАЛЁВА

Ніна Дзмітрыеўна Кавалёва нарадзілася ў 1949 года ў вёсцы Еськаўка Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыла Аршанскае ГПТВ-45 тэкстыльшчыкаў. Інвалід 1-й групы. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

ЛАСТАЎКІ

Навучы мяне, маці, лятаць,
Так, як ластаўкі вучаць малых,
Каб магла, ян яны, святкаваць
У раздоллі на крылах тугіх.

Як яны, каб магла дараваць
Тым вятрам, што у вырай нясуць.
Навучы мяне, маці, лятаць,
Каб з палёту на дом свой зірнуць.

Вось ён, ціхі, маленькі такі,
Ды яго анідзе не забыць.
Узляцеўшы з ягонай рукі,
Буду век успамінамі жыць.

Навучы мяне, маці, лятаць,
Каб вяртацца ў разлівы палёў
І з пагляду твайго не знікаць,
У якім дабрыня і любоў.

ЖАБРАЦКІ ЛЁС

Ляжыць бярозка – дрэнны знак.
Ёй шапацець бы век над намі,
Ды пасадзілі абы-як,
І вецер вырваў з каранямі.
Другая тут над ёй трымціць:
Ужо адчула гэту страту.
О, лепш было б зусім не жыць,
Ці смагу піць, ці нават здраду,
Ці быць крывою між бяроз
І нават не цвісці гадамі,
Чым напаткаць жабрацкі лёс:
Адной хістацца пад вятрамі.

БЕЛАРУСІ

Якая ты бялюткая
З заснежанымі ранкамі,
З танюткімі Анюткамі,
З дапытлівымі Янкамі.

Якая ты прыгожая
Пад кронамі зялёнымі,
Хоць зграямі варожымі
Была ты спапялёная.

Якая ты жаданая!
Прымай дачушку з выраю.
І справам ты адданая
І у сяброўстве шчырая.

Якая ты імклівая!
Твая дарога ясная.
Хто скажа – нешчаслівая?
Яшчэ якая шчасная!

Лідзія АНДРЭЕВА

Лідзія Андрэева (Лідзія Андрэеўна Мініч) нарадзілася у 1940 годзе ў вёсцы Рэкта Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт (выкладала на ааінжынерным факультэце БДСГА).

ГОРАЦКІЯ ЎЗОРЫ

Ты нібы першае каханне
З той некранутай чысцінёй.
Іду з табою на спатканне,
Гаючы прагна п'ю напой.

Зялёнае хвалюе мора
На каляровым дыване.
Тут кожны крок
і кожны ўзгорак
Міжволі сэрца закране.

Чаруюць горацкія ўзоры
Мяне да позняе пары,
Пакуль у глыбіні азёраў
Запаляць зоркі ліхтары.

Тут з мудрай думкаю вучоных
Усё ў гармоніі жыве,
Тут песня вырвецца з-пад кронаў —
І ўдаль над горадам плыве.

МАЯ МАГІЛЁЎШЧЫНА

Кожнай жменькі зямлі маіх продкаў
Смак спрадвеку салёна-салодкі.
І мая тут узрошчана доля
На нягодах, спагадзе і волі.
Чараўніца мая дарагая,
І блакітная, і залатая.
Першай сонцу далонь адкрываеш,
За Радзіму малітву чытаеш.
Тут заўсёды са шчыраю ўсмешкай
Сустракаюць суседа на ўзмежках.
І ласкава тут шэпчуць бярозкі:
"Вы мае васількі і валошкі".

Фота Кастуся Дробава

Кожнай жменькі зямлі маіх продкаў
Смак спрадвеку салёна-салодкі.
Не зракуся я гэтае долі,
Як ад праўды, ад хлеба – ніколі.

ДЗЯКУЮ ЛЁСУ

З маленства вядомы
мне смак зямлі роднай:
Ў ваеннай зямлянцы,
ў гады недароду,
Ў аладках пясчаных,
што вугаль счарнелых,
З бульбінак замерзлых,
вясной адапрэлых.

Аб цяжкім былым
я зусім не ўздыхаю.
Што дадзена лёсам,
спакойна прымаю.
І дзякую Богу, што сілы даў досыць,
Што горшае міма
пакуль што праносіць.

Ўсё розумам, вопытам,
шчыра здабытае,
У кнігу жыцця
маёй памяццю сшытае.
Зараз чытаю, старонкі гартаю
І значнае з вершам
нашчадкам вяртаю.

Лія РОДНАЯ

Лія Родная (Ніканчук Наталля Валянцінаўна) нарадзілася ў 1967 годзе ў вёсцы Мервіны Клецкага раёна Мінскай вобласці. Скончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Была навуковым супрацоўнікам кафедры ММЭС (матэматычнага мадулявання эканамічных сістэм) БСХА. Цяпер працуе ў аддзеле эканомікі Горацкага райвыканкама. Са сваімі творамі выступае на старонках рэспубліканскіх выданняў.

БЕЛАЯ РУСЬ

Белая Русь, белая —
Лілеямі на вадзе,
Белая Русь, белая —
Буслікам на гняздзе.
Белая Русь, белая —
Бярозавым «ручайком»,
Белая Русь, белая —
Хмурынкаю і матыльком.
Белая Русь, белая —
Рамонкаваю парой,
Белая Русь, белая —
Поўняю над ракой.
Белая Русь, белая —
Песняй ціхуткай званцоў.
Белая Русь, белая —
Коўдрамі дзьмухаўцоў.
Белая Русь, белая —
Яблыкам наліўным,
Белая Русь, белая —
Ходнікам ільняным.
Белая Русь, белая —
Кашуляй і ручніком,
Белая Русь, белая —
Глечыкам з малаком.
Белая Русь, белая —
Ранішняй чыстай расой
Белая Русь, белая —
Простай дзявочай красой.
Белая Русь, белая —
Быліннасцю гусляроў,
Белая Русь, белая —
Натхнёнасцю змагароў.

* * *

Ты чуеш, як смяецца вецер,
як скачуць промні
і расце трава?
А я твае цалую скроні,
і кружыцца ад шчасця галава.

Ты чуеш, як звініць паветра,
як носіць мёд
руплівая пчала?
І палыновы пах
прыемна-горкі,
як невымоўная дзявочая туга.

Ты чуеш, як плывуць аблокі,
як паскарае свой разбег Зямля?
А я твае кранаю рукі
І цешуся, нібыта немаўля.

Карцінкі з глыбінкі

Міхаіл УЛАСЕНКА

Матвеіч

Матвеіч — чалавек справы. Бо слоў на вецер не кідаў, на сходах надта не вытыркаўся, на планёрках адмоўчваўся. Нават калі яго адчытвалі за недагляды ў рабоце. Разумеў: усё гэта — мітусня, за якой глухая сцяна абыякавасці. Таму і крытыку прымаў як належнае.

А справу сваю Матвеіч ведаў тонка. Пасада ў яго была далікатная — слесар-інструментальшчык. Выдаваў што каму трэба — ключы, малаткі, балты-гайкі, падшыпнікі розныя, іншую драбязу, без якой і тэхніку ў поле не выведзеш.

Адна праблема была ў Матвеіча, за што яго, уласна, і бэсцілі, — страшны дэфіцыт гэтай барахольшчыны. За перабудову ўсё развалаклі, а зямлю араць трэба. Інжынер, якому таксама на арэхі даставалася, увесь час падганяе: маўляў, давай, Матвеіч, давай! А што даваць, калі няма чаго? Яно і раённае начальства калгасу нічога не дае — толькі патрабуе.

Вось і ствараў Матвеіч паціху ды памалу свой асабісты "абменны фонд". З таго, што з возу звалілася падчас той "генеральнай расцягалаўкі". Бо не ўсё звалаклі, сёе-тое і па двары раскідалі, а да нечага яшчэ і проста рукі не дайшлі. Ідзе, скажам, Матвеіч па тэрыторыі, а пад нагамі гайка валяецца. Падбярэ, пачысціць, масельцам змажа і — як новенькая. Яму і механізатары дапамагаць пачалі — адпрацаваную дэталь ужо за агароджу не выкідвалі. Прынясуць у інструменталку — вазьмі, маўляў, Матвеіч, камусьці спатрэбіцца. Іншы жартаўнік іржавую жалязяку пад дзверы падкіне, або проста шпурне пад ногі. Ведае: Матвеіч усё вартае знойдзе, у справу пусціць. Яго і тэхнічка за акуратнасць нахвальвала, а ў вёсцы нават плётку пусцілі: каханне, маўляў, у іх таемнае...

А раніцой ля інструменталкі цэлая чарга выстройвалася — як ля піўнога ларка: каму ключ на дзевятнаццаць, каму ніт з гайкай на семнаццаць, каму падшыпнік, а то чаго і ямчэйшае... Пакапаецца Матвеіч па сваіх паліцах, і — калі ласка: табе ніт з гайкай, табе ключ на семнаццаць. "А падшыпніка такога памеру — прабач, дарагі, няма, ідзі да механіка".

А той механік сам заяўкі розныя даваў Матвеічу, і выканання няўхільнага патрабаваў. Бурчыць, калі чаго не знаходзіцца. Матвеіча ўжо ўсе пачалі прымаць за штатнага забеспячэнца. І прыходзілася яму воляй-няволяй па машынных звалках лазіць ды выглядваць, дзе б што прыдатнае адкруціць.

А тут прыпар уборачны надышоў. Матвеічу і зусім жыцця не стала. Камбайны не гатовыя. Вышэйшае начальства насядае на ніжэйшае, а тое, у сваю чаргу, на Матвеіча. Новы (ужо быццам бы сёмы) старшыня, пачаў было крайняга шукаць — па чыёй віне рамонт зацягнулі. І ўсе на Матвеіча паперлі, маўляў, зусім ад рук адбіўся. Старшыня, не разабраўшыся, тут жа, прама ў майстэрні прылюдна вымову Матвеічу закатаў: "Не можаш забяспечыць — саступі, ідзі на заслужаны адпачынак!"

Крыўда ўзяла Матвеіча за такую несправядлівасць. Выцер пот рукавом, змахнуў мімаходзь набеглую слязіну і пайшоў у сваю "капцёрку" заяву пісаць. Напісаў, разам з ключамі на стол механіку моўчкі паклаў і пайшоў цішком са двара. Больш ён сюды і носу не патыкаў. Неўзабаве старшыня і механіка звольніў, а потым і самога кудысьці на павышэнне сплавілі...

Чытач з чыноўнага асяроддзя спытае: "А дзе ж гэта такі Матвеіч водзіцца? У якім калгасе? Якога раёна?"

Ды ўсюды! Бадай кожны калгас не без Матвеіча.

Вымова

Я стаяў за горадам ля дарогі, што вядзе ў падшэфны калгас і з нецярпеннем чакаў "папутку". А заадно думаў пра вымову, якую мне абавязкова ўлепіць новы дырэктар Арцём Пятровіч. Вялікі ўжо ён аматар вымовы аб'яўляць. За ўсякую драбязу. Асабліва за спазненні на работу ды неабходныя адлучкі. А тут справа і зусім катастрафічная: спазніўся на ведамасны аўтобус, каб разам з калектывам на сціртаванне саломы паехаць. І вось на табе! З'яўлюся ў поле, як з карабля на баль — глядзіце, які я спрытны...

Высадзіў мяне вадзіцель на ўскрайку поля з доўгімі радамі салямяных коп. Праца ўжо ваўсю кіпела. Мясцовыя хлапчукі на конях з валакушамі сцягвалі копы да месцаў сціртавання, а там гарадскі народ з віламі рабіў сваю няхітрую справу. Ля адной са сцірт рупіўся і мой родны калектыў. На стозе, які паспелі ўжо выгнаць у мой рост, тапталіся сам Арцём Пятровіч і бухгалтар Мякушаў. З верхатуры ім добра бачна, хто рупіцца, а хто — цераз пень-калоду. Ды і класці сціркту — справа сама па сабе даволі складаная і адказная.

Убачыў мяне бухгалтар і з падхалімскім азартам усклікнуў: "Во, сялянскі сын прыбыў — кандыдат на дошку пашаны ёсць!" Я змікіціў, якую "дошку" ён меў на ўвазе. Другі падхалім, начальнік аддзела кадраў Кірбашкін, тут жа ўдружыў мне вілы з самым доўгім дзяржальнам — імі ямчэй падаваць салому на самую верхатуру. І я моўчкі ўзяўся за справу, добра знаёмую мне, вясковаму чалавеку, з дзяцінства. Яшчэ паглядзім, хто тут чаго варты! Я набіраў на вілы важкія ахапкі саломы, узнімаў высока над галавой і спрытна кідаў на сцірту, да ног дырэктара. Мякушаў для мяне быў нішто. А Арцём Пятровіч павінен бачыць кожны мой крок, кожны рух, кожную пададзеную на сцірту порцыю. Я ім пакажу, на што "сялянскі сын" здольны?

Толькі гляджу — і астатнія імкнуцца падаваць салому менавіта яму, Арцёму Пятровічу. Ну і падхалімы! Няхай я — віну сваю скупіць імкнуся, а астатнім навошта выкладвацца? Але ім за мной не ўгнацца — вілы ў мяне даўжэйшыя.

Хутка дырэктар сапраўды заўважыў маю стараннасць, пачаў больш дружалюбна паглядваць на мяне. А я, задаволены яго ўвагай, датуль трымаю ўверсе чарговую порцыю, пакуль Арцём Пятровіч сваімі вілами яе не падхопіць.

А сонца паліць бязлітасна. Неба чыстае, як сумленне дзіцяці. Ні воблачка на ім, ні хмурынкі. Перасохлая салома сыплецца за каўнер, казыча патыліцу, ліпне да мокрых плячэй. Але я не звяртаў на гэта ўвагі. Арцём Пятровіч атрымліваў ад мяне такія важкія ахапкі, нібыта поўхі, ад якіх ён хістаўся з боку ў бок, ледзь трымаючыся на нагах. А я падначаплю на вілы як мага больш, ды і кіну, ды і кіну... Гляджу, твар дырэктара спахмурнеў, ён усё больш адплёўваецца, выцірае рукавом твар, нервова чухае за пазухай ды непрыязна зыркае на мяне. Ніяк не забудзе маю правіннасць. Не даруе ён мне, як піць даць, вымову ўлепіць. Не бяда тая вымова, не шкада прэміяльных! Дык цэлы ж тыдзень людзі будуць хадзіць ля гэтай дошкі, чытаць загад і неўпрыкмет пасміхацца. І я з яшчэ большым азартам налягаў на вілы...

Сцірта станавілася ўсё вышэй і вышэй, быццам спаборнічала з самім сонцам, якое, нягледзячы на канец лета, паліла няшчадна. І дырэктар пачаў надта падленьвацца. Ужо не так жвава прымае мае "падарункі", і я вымушаны больш чакаць і лішні раз хапнуць свежага паветра. А ён сюды-туды тузаецца, вілы яго звіняць, як тэлеграфны дрот, і раўнавагу ён утрымлівае з цяжкасцю. Мне ўжо і шкада яго зрабілася.

А тут, як знарок, на небасхіле чорная хмара з'явілася, на гарызонце бліснула маланка.

— Паднапружымся, хлопчыкі! — скамандаваў начальнік аддзела кадраў Кірбашкін.— Інакш уся наша справа кату пад хвост пойдзе.

І хлопчыкі паднапружыліся. Я па-ранейшаму кідаю да ног дырэктара ахапкі — адна ямчэй за другую. На табе, на табе! Паглядж у, як вы, дарагі шэф, ацэніце маю работу! За дваіх выкладваюся.

Усе ўжо стаміліся, матляюць у паветры пустымі навільнікамі, нібы танец з шаблямі выконваюць, салома з вілаў валіцца, не далятае даверху. Арцём Пятровіч ужо ротам паветра хапае, ды на мяне ўмольна паглядае. Быццам я адзін магу справу паскорыць. У мяне і сіл прыбавілася, другое дыханне адкрылася. А навальніца ўжо над самай галавой грымнула, холадам падзьмула. Са стога паляцелі сарваныя ветрам жмуты саломы...

Арцём Пятровіч раптам выпусціў з рук вілы і сам быццам праваліўся. За ім следам загадкава знік бухгалтар Мякушаў. Затым яго белая галава зноў вырасла над стогам і паведаміла, што Арцём Пятровіч у непрытомнасці — пэўна, ад сонечнага ўдару. Мы хутка спусцілі яго пры дапамозе вяроўкі на зямлю, напаілі гарбатай з тэрмаса і пасадзілі пад лазовы куст...

У панядзелак я штохвіліны выбягаў у калідор пацікавіцца, ці вісіць на дошцы загад з вымовай. У абед ён-такі з'явіўся, але ніякай вымовы там не было. Дырэктар аб'явіў калектыву падзяку "За выдатную работу на стагаванні саломы ў падшэфным калгасе". У загадзе красаваліся прозвішчы многіх маіх саслужыўцаў, якія "асабліва вызначыліся". Мяне сярод энтузіястаў не было. Пра мяне дырэктар чамусьці не ўспомніў — а ў адной жа запрэжцы змагаліся! Я ўжо з прынцыпу і на вымову быў згодны. Але надта і не сумаваў. Другім разам пастараюся. Калі, вядома, Арцём Пятровіч не пашле мяне на стог.

Радня да паўдня

Цяпер усе разумныя людзі пошукамі родавых каранёў заняліся. Уласную гісторыю сваімі рукамі пішуць.

Я ж сваіх родзічаў ведаў не болей як да другога калена. Калі, скажам, у гасцях налівалі, то разумеў: гэта блізкія сваякі. А тыя, што абзывалі бесталковым ахламонам, ды імкнуліся як найхутчэй з хаты выправадзіць, лічыў — дзесятая вада на кісялі.

Нарэшце закончыў я тэхнікум, і прызначылі мяне прарабам на раённай будоўлі. Паказаў свае здольнасці, і тут ужо на прыступку вышэй паднялі — адным словам, начальнікам стаў.

Не паспеў мазалі з далоняў звесці, кабінет адрамантаваць, ды мэблю замяніць, як да мяне радня зачасціла. Спачатку з віншаваннямі, а потым і з просьбамі.

Першым прыйшоў стрыечны брат, які працаваў падсобным рабочым на нашай жа будоўлі. Цэглу падносіў ды раствор мяшаў.

— Ці не хопіць мне,— кажа,— Іван Дзмітравіч, бруднай справай займацца. Заробак маленькі, а тут і на пенсію неўзабаве.

Я і прызначыў яго загадчыкам складоў.

Потым завітаў нейкі блізкі родзіч па жончынай лініі. Яго я майстрам узяў. Далей зачасцілі блізкія родзічы маіх родзічаў... Усе, канечне, віншавалі, нават у госці запрашалі. Праўда, узамен усе чагосьці прасілі. Хто — цэглы выпісаць па нізкэйшым кошце, хто — нейкіх адыходаў, якія наогул нічога не каштуюць. А мой стрыечны брат, якога загадчыкам складоў паставіў, за маёй спінай пачаў налева ды направа ўсялякую драбязу размяркоўваць.

Я ўзяўся ўжо адбівацца, казаць, што матэрыялаў на дзяржаўную будоўлю не хапае, што план трашчыць па ўсіх швах. А родзічы ўсё напіралі. Я і адмовіць ужо не мог — пойдуць па радні плёткі ды перасуды. І душа ў мяне яшчэ не зусім счарсцвела. Праўда, калі ўжо ў госці да сябе зацягвалі — пітва было хоць адбаўляй. А ўвагі ды павагі — і тым болей. За чаркай, канечне, знаёмствы з новымі родзічамі, пра якіх я да гэтага і сном і духам не ведаў. Толькі чамусьці высокіх начальнікаў сярод іх не было.

Высокія начальнікі, асабліва па лініі кантролю, пачалі наведваць мяне крыху пазней. Пасыпаліся вымовы, штрафы ды налічэнні ўсялякія.. І стаў я прасіць Усявышняга: пазбаў ты мяне ад нахабнай радні, а з кантралёрамі я і сам як-небудзь спраўлюся.

І Усявышні пачуў мае маленні. Выклікалі мяне ў райвыканкам і знялі з пасады. Сяджу цяпер дома, успамінаю радню да пятага калена і чакаю: мо хто наведаецца, дапаможа хоць падсобнікам якім уладкавацца. Ніхто не прыйшоў. Толькі родная жонка спачувае: кожны дзень піліць. А якая яна мне радня? Гэта ўжо зусім іншы радавод.

Юры ЧАРНЯКЕВІЧ

Тое, што сніцца

Неяк нават дзіўна думаць, што ты недзе жывеш, дыхаеш, ходзіш...

Яшчэ больш дзіўна тое, што я думаю пра цябе без хвалявання, без трывожнага ўспаміну, без анічога ўвогуле.

Ёсць адна дзяўчына, падобная на цябе, і заўсёды, калі яе сустракаю, я міжволі ўспамінаю цябе, але чаму? Чаму — не ведаю і сам...

І нават нейкае пачуццё да гэтай Волі, пачуццё або лепш сказаць, прыцягненне, нейкую повязь, якую адчуваю ўсёй сваёй істотай. Ці не ёсць яна, гэтая повязь, толькі напамінам пра тое вялікае пачуццё, што было ў мяне да цябе?..

Хто яго ведае...

Я разумею, што былога не вернеш, ды і не хачу гэтага сам. Але нешта трымае ў памяці цябе, не дае забыць твой вобраз.

Часам нават не ўспамінаю цябе месяц, другі, трэці; шматлікія падзеі і кругазвароты жыцця нясуць мяне за сабой, але аднойчы ноччу, у сне, я зноў сустракаюся з табой, бачу твае вочы, чую твой голас. Мне робіцца гэтак добра, што, прачнуўшыся, пішу табе гэты ліст.

Пішацца лёгка, без выпраўленняў і роздумаў, без горычы і шкадавання, пішацца так, як і павінны пісацца ўсе лісты, што ніколі не будуць адасланыя.

Летам

— Чаму ты не хочаш гэтага зрабіць? Можа, я табе не падабаюся?

— Чаму, не, ты мне вельмі падабаешся, але тут іншае...

Алена была ў кароткіх шортах і ў белай маечцы, а пантофлі трымала ў руках. Мы ішлі басанож уздоўж Прыпяці. Што да мяне, то на мне былі толькі плаўкі, а красоўкі і сваю майку я нёс у адной руцэ з пакетам, дзе ляжала вада і покрыўка. Было крыху нязручна.

Мы паплавалі, пазагаралі, вырашылі ісці дамоў, і вось тут пачалася тая размова.

Яна добра ведала, што падабаецца мне. Ды і зараз падабалася яшчэ больш, калі ішла побач, загарэлая, вабная, жаданая. Загар вельмі пасаваў ёй і яна пра гэта цудоўна ведала.

Мы былі аднагодкі, вучыліся ў адной ВНУ, на адным факультэце. Толькі яна яшчэ на 1-ым курсе выскачыла замуж за дваццаціпяцігадовага хлопца, які потым досыць часта чакаў яе пасля заняткаў каля універсітэта. Я ведаў, што жывуць яны добра і мне ніколі не даводзілася чуць ад яе нешта благое пра мужа.

Цяпер мы працуем у адной установе, сядзім у суседніх кабінетах і вельмі часта ходзім адзін да аднаго на чай.

Ну, а я, канечне, яшчэ нежанаты.

— Дзіма, ведаеш, гэта пытанне лёгка вырашыць, проста сказаць, так ці не. І ведаеш, мне проста не хочацца, каб гэта быў нехта іншы. Ды і як бы спецыяльна некага шукаць...

— Я разумею.

—Ты проста нечага баішся? Саромеешся? Мне здавалася, кожны хлопец будзе рады такой прапанове. А ты неяк усё сур'ёзна ўспрымаеш... Ведаеш, проста думай, што робіш добрую справу і табе будуць удзячныя за яе двое людзей. Я дык, прынамсі, дакладна.

Яна спынілася і ўзяла мяне за руку, зірнула мне ў вочы. Чакала. Адказу. Пацалунка. Чаго-небудзь.

Вось ужо шосты год яна замужам, але не мае дзяцей. Па яго віне. З інтэрната браць дзіця не хочуць, тым больш што яна цалкам здаровая жанчына, як мне сказала.

— Гэта можна зрабіць і штучна. У паліклініцы.

— Я не хачу. Я хачу з табой. Я хачу ад цябе.

Што можна на такое адказаць? На мне і на ёй былі крыжыкі. Кожную нядзелю яна з мужам і я сустракаліся ў царкве. І я добра ведаў Валеру, мы неаднойчы ездзілі з ім на рыбалку і хадзілі ў вандроўкі. І як пасля глядзець яму ў вочы? Як потым глядзець на іхняе дзіця, ведаючы, што гэта твой сын ці дачка...

А з другога боку, я нейкім чынам разумеў і яе.

Але не пацалаваў яе ні тады, ні потым.

Больш мы не пілі разам чай, хоць і віталіся ды бачыліся кожны дзень. Праз некаторы час я даведаўся, што яны ўсё-ткі ўзялі з інтэрната хлопчыка.

Арт-пацеркі

У сталічным відэакомплексе "Центр-відэа" прайшоў рэтраспектыўны паказ фільмаў Федэрыка Феліні. "Рэпетыцыя аркестра", "І карабель плыве...", "Джынджэр і Фрэд" — калісьці гэтыя сужкі вялікага італьянскага рэжысёра збіралі ў кіназалах мінскую інтэлігенцыю. І вось яны ненадоўга вярнуліся на наш экран, стаўшыся для каго ўспамінам, а для каго і адкрыццём.

Польскі інстытут ("ІР") у Мінску запланаваў на апошні квартал года яскравую чараду культуралагічных, гісторыка-краязнаўчых, літаратурных, мастацкіх праектаў і прэзентацый. Так, у Віцебскім краязнаўчым музеі гасцюе VI Міжнародная выстаўка "Нататкі з падарожжа. Еўропа", якую 28 кастрычніка зменіць экспазіцыя работ Ежы Пёнтака "Смутак і чароўнасць правінцыі". У Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў з пачатку гэтага месяца і амаль да сярэдзіны лістапада раз на тыдзень ладзяцца рэтраспектыўныя паказы фільмаў рэжысёра Кшыштафа Занусі. Пры падтрымцы "ІР" нядаўна ажыццёўлена прэм'ера "Ён, яна і Бэтман" — камедыя двух дзяцей і трагедыя дарослых паводле п'ес сучасных польскіх драматургаў К.Бізэ і М. Вальчака (мінскі тэатр "Арт-Про", рэжысёр Алег Коц), а 28 кастрычніка будзе паказаны спектакль гэтага ж тэатра "Ноч Гельвера" паводле І. Вількіста. У Смаргоні ды Ашмянах замоўлены Дні польскай музыкі з удзелам беларускіх выканаўцаў: апроч канцэртных выступленняў, яны правядуць тут майстар-класы для навучэнцаў музычных школ.

Вечар музыкі Фрыдэрыка Шапэна адбыўся ў Малой зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Фартэпіянныя творы

выдатнага польскага кампазітара-рамантыка прагучалі ў выкананні народнага артыста Беларусі прафесара Ігара Алоўнікава.

Увесну мінула 25 гадоў, як пакінуў зямны свет заслужаны артыст Беларусі Юрый Смірноў. У кастрычніку споўнілася 80 гадоў з дня яго нараджэння. Тыя, хто быў знаёмы з яго шчырай, нават можна сказаць — шчодрай творчасцю, памятаюць гэтага, у свой час вельмі папулярнага, спевака. Дзіва што: доўгія гады яго пранікнёны лірычны тэнар быў у нейкім сэнсе візітоўкай Беларускага радыё, салістам якога працаваў Юрый Смірноў. Вядома, змяніліся пакаленні слухачоў, змянілася так званая мода на музычнай эстрадзе. Але песні, рамансы ў выкананні Юрыя Смірнова — незабыўныя, яны часам гучаць у беларускім радыёэфіры.

Ансамбль салістаў "Класік-Авангард" разам з нашым госцем — амерыканскім дырыжорам Філіпам Сімансам прадставіў у Малой зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі праграму амерыканскай музычнай класікі. У свежых аранжыроўках гучалі вядомыя аматарам музыкі творы Шарля Іва, Скота Джопліна, Джона Філіпа Созы, Джэрома Керна.

С. ВЕТКА

На здымку: партрэт Фрыдэрыка Шапэна — фотарэпрадукцыя вядомай работы Жэна Дэлакруа.

На сёлетняй "Белай Вежы" ў Брэсце было паказана больш як 30 спектакляў (улічваючы пазаконкурсныя паказы) з 15 краін свету. Сярод удзельнікаў — Абхазія, Балгарыя, Беларусь, Венесуэла, Германія, Ізраіль, Літва, Малдова, Польшча, Расія, Славенія, Украіна, Францыя і іншыя. "Белая Вежа", як заўсёды, была непрадказальная і нечаканая...

Карнавал мары

Палітра XIII Міжнароднага тэатральнага фестывалю «Белая Вежа»

Міжнародны тэатральны форум прадставіў самыя разнастайныя — стылёва і жанрава — пастаноўкі. Тут і псіхалагічная драма, і шэраг музычных, пластычных відовішчаў, і спектаклі для дзяцей. На закрыцці фестывалю адбыўся паказ "Шчаўкунчыка" П. Чайкоўскага (лібрэта і харэаграфія В. Елізар'ева) Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета Беларусі. Такі маштабны спектакль брэсцкая публіка ўбачыла на сваёй сцэне ўпершыню. Амаль кожны тэатральны дзень завяршалі вулічныя імпрэзы, прадстаўленыя Львоўскім тэатрам "Уваскрэсенне", Кіеўскім акадэмічным Малым тэатрам, Польскім тэатрам "A Part" з Катавіцаў і іншымі.

Гран-пры фестывалю атрымаў спектакль Татарскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Г. Камала **"Чорная бурка"** (рэжысёр Ф. Бікчантаеў). Ён проста ўзрушыў гледача. Філасофская прыпавесць Г. Хугаева пра абавязак, гонар, каханне і здраду вырашана тэатрам у жанры музычнай драмы (кампазітар М. Шамсутдзінава, ЗША). З самага пачатку глядацкую ўвагу прыцягвае містычная сцэнаграфія С. Блазнава: застыглыя, празрыстыя горы на задніку сцэны. Складаная канструкцыя, раскінутая па сцэне, нечым нагадвае фрагменты ці то касмічнага карабля, ці то самалёта, які пацярпеў крушэнне. На іх месціцца логава ваўкоў, адначасова тут знаходзіцца прытулак лясных звяроў і птушак: лісіцы, зайчыхі і старога крумкача. У спектаклі кожны з гэтых персанажаў з'яўляецца носьбітам пэўных станоўчых ці адмоўных чалавечых якасцей. Наогул, у пастаноўцы выяўляецца, што звяры вельмі падобныя да людзей і наадварот.

Галоўны герой спектакля — Тузар — добры, аддаены свайму гаспадару сабака, здольны амаль да скону чакаць вяртанне чалавека і вартаваць пакінутую ім, забытую чорную бурку. Але ці ацэніць гэта чалавек, і як вырашыць ён лёс хворага і знясіленага сабакі? Над гэтымі ды многімі іншымі пытаннямі разважае тэатр. Арганічна, пераканальна існуе ў ролі Тузара акцёр Іскандэр Хайрулін (адзначаны дыпломам "За лепшую мужчынскую ролю"). Запамінальныя вобразы ствараюць акцёры Люцыя Хаміт (чароўная, уладарная ваўчыха Чобра), Рынат Тазэтдзін (дакладны ў жэстах і ўчынках, моцны і хітры воўк Чобр), Алсу Гайнуліна (экстравагантная, ліслівая і чапурыстая лісіца Бурэта) і іншыя. У гэтых сімвалічных вобразах спектакля сканцэнтраваныя ўсе вядомыя спрадвеку каардынаты асобы: ад дабрыні, аддонасці да хітрасці і здрадлівасці. Спектакль тэатра з Казані ўразіў гледача як вельмі кранальнай тэмай, незвычайна распрацаванай драматургам, так і зладжаным прафесійным акцёрскім ансамблем.

Прыцягальным для гледача і журы стаў спектакль **"Паўдзённы падзел"** паводле П. Кладэля, паказаны Цэнтрам драматургіі і рэжысуры А. Казанцава і М.Рошчына (Расія, Масква, рэжысёр У.Агееў, сцэнаграфія і касцюмы М.Філатавай). У аснове — выдатная п'еса сусветнага рэпертуару, твор парадаксальны, неадназначны, здатны зацікавіць тонка выпісанымі характарамі і тымі сітуацыямі і станамі душы, у якіх знаходзяцца персанажы. Поль Кладэль ставіць такія знаёмыя ўсім нам пытанні: у чым таямнічая сутнасць Жанчыны і з чаго складаецца гэтая незямная істота?

Акцёры Т. Сцяпанчанка, А. Багдасараў, А. Несцераў і А. Смола віртуозна разыгралі і пражылі высокую любоўную драму на чатырох дзейных асоб. Іх узаемаадносіны ўяўляюць сабой піраміду, на вяршыні якой знаходзіцца жанчына. Аснову ж піраміды складаюць трое мужчын гераіні, тры неабходныя складнікі яе зямнога існавання: адзін з іх — муж, без якога няма ўпэўненасці ў жыцці, як, відавочна, няма і без двух астатніх складнікаў — душы і цела. Невыпадкова разгорнутая піраміда, пазначаная ў сцэнаграфіі II дзеі спектакля, абрушваецца, знікае, ператвараецца ў веер, калі губляецца адно са звёнаў яе трывалага апірышча. Так і крохкая жанчына — плача і пакутуе, калі губляе аднаго за адным сваіх мужчын.

Ізэ — гераіня Таццяны Сцяпанчанкі — надзеленая знешняй прывабнасцю і тонкай, складанай, неардынарнай унутранай структурай характару. Да дробязей распрацаваны вонкавы малюнак вобраза: мяккія, павольныя рухі і жэсты, амаль бязважкая хада па сцэне, абаяльны, лёгкі акцэнт іншаземкі. Яна ўжо з першых карцін спектакля прыцягвае глядзельную залу як асоба незвычайная, загадкавая, створаная для кахання. Напачатку гэта дзіўная архідэя, да якой нават нельга дакрануцца і адчуць яе таямнічую прысутнасць. Пры канцы спектакля — стомленая, палахлівая і безабаронная жанчына, якая страціла ўсё, проста таму, што хацела кахаць і быць каханай. Вобраз Ізэ трансфармуецца і мяняецца на працягу ўсяго сцэнічнага дзеяння, у залежнасці ад таго, з кім зводзіць яе зменлівы і непрадказальны лёс. Работа расійскай актрысы сталася з'явай яркай на сёлетняй "Белай Вежы", і журы адзначыла Таццяну Сцяпанчанку дыпломам "За лепшую жаночую ролю".

Санкт-Пецярбургскі Невялікі драматычны тэатр Льва Эрэнбурга (Расія), трупа якога складаецца з маладых акцёраў, прывез на фестываль спектакль **"Іванаў"** паводле п'есы А. Чэхава. Малады тэатр прапанаваў гледачу сваё адметнае бачанне вядомага чэхаўскага твора: у пастаноўцы цесна пераплеценыя камедыя і драма, адначасова прасочваюцца і элементы тэатра абсурду. Спектакль часам нагадвае шэраг добра выкананых эцюдаў, якія, нібы пацеркі, нанізваюцца адзін за адным, утвараючы цудоўныя каралі. Па-майстэрску выконваюць свае ролі, трымаюць гледача ў пастаянным напружанні акцёры К. Шалястун (Іванаў), Т.Рабаконь (Сара), В. Сквірскі (Шабельскі), К. Сёмін (Лебедзеў), С.Абідзіна (Зінаіда Савішна), М. Сямёнава (Саша), Д. Шыгапаў (Львоў), Т. Калганава (Бабакіна) і іншыя.

Цікавымі, яркімі ў агульнай палітры фестывалю былі спектаклі **"Улейскія дзяўчаты"** С. і Э. Жамбалавых Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра драмы імя Х. Намсараева; **"Ілья Прарок"** Т. Слабадзянэка Тэатра Татра са Славакіі; спектакль-целасузіранне **"Песні дажджу"** Тэатра пластычнай драмы "ЧалаВЕК" імя Нэлі Дугар-Жабон з Санкт-Пецярбурга; **"Наплыў пачуццяў"** — лялечны спектакль для дарослых Міждысцыплінарнага тэатра Га-Зіра (Ізраіль) і шэраг іншых.

Беларусь прадставіла на фестываль некалькі пастановак. **"Злачынства і пакаранне"** паводле Ф. Дастаеўскага (Брэсцкі тэатр драмы і музыкі): мастак гэтага спектакля В. Лесін атрымаў дыплом "За лепшую сцэнаграфію". Спектакль **"Макбет"** У. Шэкспіра Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы адзначаны дыпломам "За міжнацыянальнае супрацоўніцтва". Дыпломамі былі ўзнагароджаныя таксама работы моладзі: **"Ах, Галівуд, Галівуд!"** Тэатра-студыі імя Е. Міровіча Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў; аднаактовыя танцавальныя спектаклі **"Зіма", "Дэ-рэ"**, **"Мухі на сонцы"** мінскага Тэатра сучаснай харэаграфіі "D.O. ZK. I". Два спектаклі для дзяцей паказалі Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача (**"Шчаўкунчык"** паводле Э. Т. А. Гофмана) і Гомельскі абласны драматычны тэатр (**"Па шчупаковай волі"** паводле матываў рускіх народных казак).

Сёлетні фестываль "Белая Вежа" прадэманстраваў высокі ўзровень конкурсных спектакляў, як драматычных, музычна-пластычных пастановак, так і вулічных відовішчаў. Ён стаў сапраўдным карнавалам яркіх фарбаў і моцных уражанняў для ўсіх прыхільнікаў тэатральнага мастацтва.

Вераніка ЯРМАЛІНСКАЯ

На здымках: сцэны са спектакляў "Злачынства і пакаранне" (Брэст, Беларусь), "Ілья Прарок" (Нітра, Славакія), "Чырвоны каптурок" (Люблін, Польшча).

Шчаслівая

Да юбілею Нінэль Шчаснай

Нінэль Шчаснай спаўняецца 75. І ў свае гады мастачка не збіраецца замыкаць пэндзлі ды фарбы ў шуфляду. Калі я завітала да яе ў майстэрню, Нінэль Іванаўна ў спрадвечнай шапачцы, звязанай кручком, і ў вясёленькім ружовым кажушку з малатком, цвікамі і рэйкамі ў руках рабіла рамкі для чарговай выставы карцін. Мастачка напаіла мяне духмянай гарбатай, расказала што-кольвек пра свае планы і вельмі прасіла не пісаць у артыкуле "Н. І. Шчасная", бо атрымліваецца "няшчасная", а пісаць ініцыялы пасля прозвішча.

Папараць-кветка

Нінэль Іванаўна за сваё багатае на падзеі і знаёмствы жыццё паспела пакінуць адбіткі літаральна ва ўсіх тэхніках выяўленчага мастацтва. У 1970 — 80-х гг. шаноўная юбілярка ўласнымі рукамі рабіла вітражы на заводах Бярозаўкі ды Барысава. Жанчына-мастачка сама не толькі прыдумляла вобразы, але і ўвасабляла іх ў шкле ля адмысловай печкі. Цяпер ад гэтай цяжкай, мужчынскай паводле вызначэння, працы мастачка адышла. І займаецца паралельна жывапісам, кніжнай графікай, аўталітаграфіяй. Шчасная праілюстравала больш як 30 кніжак, у тым ліку творы Янкі Брыля, Алега Лойкі, Івана Бурсава. Яе жыццёваму аптымізму і радаснасці можа пазайздросціць нават летуценнік-падлетак.

У творах мастачкі ёсць адзін адметны (бадай што аўтарскі) элемент, па якім можна беспамылкова пазнаць яе аўтарства. Гэта папараць-кветка. Каля 20 аўталітаграфій з выявамі таямнічай раслінкі зрабіла Нінэль Шчасная. Кніжныя ілюстрацыі таксама зырчаць яскравай, як агонь, недасяжнай кветкай. І самая апошняя, не скончаная яшчэ работа, якую я пабачыла ў майстэрні, называецца "Бабуля са сваімі ўнукамі ў папараці". Гэтую карціну Шчасная хоча падараваць свайму роднаму Полацку. Папараць-кветка недарэмна гэтак часта з'яўляецца на палотнах і графічных аркушах Нінэль Іванаўны. Яна кажа, што насенне папараці знайшлі ў космасе, і лічыць, што гэта самая старажытная і сімвалічная расліна на зямлі. Для яе адшукаць папараць-кветку азначае не спосаб разбагацець, а спосаб зберагчы сябе, сваю сям'ю і народ ад злога.

Творы Шчаснай аўтабіяграфічныя. Калісьці яна намаляавала сябе між двух мужчын, якія адначасова зрабілі ёй прапанову. На гэтую карціну — "Ля вогнішча" — потым паквапіўся Уладзімір Караткевіч і прасіў нікому не аддаваць, пакуль ён не назбірае грошай купіць яе для сябе. На жаль, так і не назбіраў, і Нінэль Іванаўна падаравала палатно свайму роднаму гораду. Карціны Шчаснай сямейныя. Яна часта малюе сваю ўнучку Ніку і дачку-нябожчыцу Ладу. Амаль у кожным творы — матыў любові да сваіх родных. Я доўга ламала галаву: як жа ў жанчыне могуць спалучацца светлая сямейнасць і пакуты творчасці? Дылема, перад якой губляліся легіёны творцаў. Шчасная знайшла гармонію: партрэты, аўтапартрэты — усё адно, што сямейны альбом. Дарэчы, сапраўдны сямейны альбом і безліч фотаздымкаў — неад'емная частка ўтульнага творчага вэрхалу яе майстэрні.

Падарункі

У 2007 годзе Нінэль Іванаўна падаравала свайму Полацку 40 карцін, якія змяшчаюцца цяпер у новым корпусе Полацкага дзяржаўнага універсітэта. "Калі я саспела для таго, каб гораду падараваць свае карціны, у мяне і ў думках не было, што я падарую іх Мінску. Я мусіла падараваць іх толькі Полацку, — распавядае мастачка. — Са мной так: я жыву ў сталіцы, а думаю толькі пра Полацак". Сваю неўтаймоўную любоў да роднага горада палачанка выказваць не саромеецца. Летась Нінэль Іванаўна адмыслова для Полацка напісала вялізную карціну "Наша жамчужына" з выявай Еўфрасінні Полацкай, якая лунае ў нябёсах над Свята-Еўфрасіннеўскім манастыром. Мастачка скарыстала ў гэтай рабоце свой улюбёны матэрыял — шкловалакно, які, на яе думку, адкрывае новыя магчымасці для працы з фактурай і колерам. Свой юбілей Нінэль Іванаўна запланавала адсвяткаваць таксама ў Полацку.

На маё пытанне — маўляў, ці ёсць у такой сталай мастачкі яшчэ няздзейсненыя планы, — Нінэль Іванаўна імпэтна выдыхнула "Ой, ну што вы!" і прызналася, што планы яе насамрэч не змяшчаюцца ў галаве. Шмат няскончаных партрэтаў, якіх чакаюць заказчыкі. Шмат такога, што душа проста не можа дазволіць абмінуць. "Вось мне падаравалі лілею, — кажа Шчасная. — Я гляджу — ну, такая прыгожая кветка, а калі зачэзне, то нічога і не застанецца. Думаю: трэба ж яе зрабіць. Саджуся і малюю". Вось такая неспатольная прага спыніць імгненне, адлюстраваць прыгажосць і пакінуць яе для вечнасці.

Saloon

Ужо больш як 30 гадоў кожную сераду ў яе майстэрні на вуліцы Сурганава збіраецца творчая інтэлігенцыя. Член Беларускіх саюзаў мастакоў і архітэктараў, ганаровая грамадзянка горада Полацка Нінэль Шчасная ладзіць адмысловыя сталічныя сустрэчы з гарбатай і печывам. Пачалося ўсё з таго, што вырашыла мастачка вылучыць адзін дзень на тыдні, у які дзверы для ахвочых завітаць да яе ў госці будуць адамкнёныя, у астатнія ж дні — рупліва працаваць. Так і павялося. "Вось гэта ўсё мне падаравалі за мінулы год, — паказвае яна салідны стос кніг і альбомаў. — Кожны, хто да мяне прыходзіць, звычайна прыносіць штосьці сваё: альбо гэта кніга паэзіі, альбо альбом з фотаздымкамі ці рэпрадукцыямі". Мы досыць доўга разглядаем розныя кнігі, мастачка распавядаючы, а я — запіваючы ўражанні цёплай гарбатай. Чаго тут толькі няма! З самага адметнага: кніга "Стихи — в живопись! Живопись — в стихи!" Нінэль Шчаснай і Уладзіміра Лобача, з ілюстрацыямі і вершамі-каментарамі; музычны твор Уладзіміра Курловіча "Трепетное прикосновение", прысвечаны мастачцы. На гарбатку да Нінэль прыходзіць заўжды шмат цікавых і вядомых людзей.

Зайздросных сяброў прыдбала сабе трымальніца "салона па серадах", малюючы партрэты. Касманаўт Пётр Клімук захоплена адгукаецца пра творчасць аўтаркі яго партрэта. Нінэль Іванаўна — адзіная з мастакоў напісала (у 1973 годзе) партрэт паэта Уладзіміра Дубоўкі з натуры. Напісаны ёю партрэт Святланы Акружной, знакамітай актрысы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа, — гонар Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі. У партрэтнай галерэі мастачкі — Іван Шамякін, Максім Багдановіч, Максім Танк, Аркадзь Куляшоў, Іван Мележ, Францыск Скарына і Цётка. Некаторыя з палотнаў ствараліся па некалькі гадоў! І Нінэль Іванаўна з імпэтам працягвае пісаць і пісаць для гісторыі новыя партрэты. А раз на тыдзень сярод гасцей "салона Шчаснай" можна сустрэць многіх напісаных ёю сённяшніх знакамітасцей.

"Вось адсвяткую юбілей, і шчыльна вазьмуся за працу, — кажа мастачка. — І новы сезон сустрэч у майстэрні распачну, — дадае з усмешкай".

Воля ЧАЙКОЎСКАЯ
Фота аўтара

Нарадзілася побач з Сафіяй Полацкай

Пчолка, нягледзячы ні на якія здарэнні ў свеце, усё адно будзе збіраць мядок. Так і чалавек у свеце мастацтва: творца і працаўнік, як пчолка! Мне падалося, што гэты вобраз, створаны адным знаным паэтам, вельмі пасуе да аблічча выдатнай беларускай мастачкі Нінэль Шчаснай. Яе жыццё — гэта плённая праца на ніве беларускай культуры і дзеля беларускай культуры.



Так думалася мне на дачы ў Нінэль Іванаўны ў вёсцы Ляхі, што кіламетраў трыццаць ад Мінска па Гродзенскай шашы. У той цёплы жнівеньскі вечар мастачка шмат расказвала і пра сваё жыццё, і пра цікавыя сустрэчы са знакамітымі дзеячамі беларускай культуры.

"Я нарадзілася побач з Сафіяй Полацкай", — сказала Нінэль Іванаўна. Так проста — і ўсё ж знакава. Пад сценамі напаўразбуранай Сафіі месцілася бальніца, дзе ў 1933 годзе і нарадзілася будучая мастачка. Храм не працаваў, вера ў Бога забаранялася. А бабка Ліда верыла ўсё жыццё: у скрыні ляжаў абразок Хрыста, у савецкія часы даставала яго і малілася ўпотай — гэта была вянчальная іконка бабкі Ліды. Перад смерцю яна падаравала абразок унучцы. Гэта цяпер як сямейная каштоўнасць, дапамагла вытрымаць не адно жыццёвае выпрабаванне.

Вучылася Шчасная і ў Мінску, і ў Ленінградзе, працавала ў Сярэдняй Азіі, а нараджаць дачку Ладу вярнулася на радзіму, тут і засталася.

Амаль паўстагоддзя творчай дзейнасці ў Беларусі. Мы разглядалі старонкі мастацкага альбома "Іскры майго жыцця" і нібы гарталі адметныя старонкі жыцця Нінэль Іванаўны, неад'емныя ад беларускай культуры.

...Так склалася, што дача бацькоў Шчаснай была ў Ждановічах — там, дзе былі дачы і многіх пісьменнікаў, паэтаў, дзеячаў культуры. Насупраць Шчасных жылі Шамякіны. Іван Пятровіч добра ставіўся да творчасці маладой мастачкі, і сама сабой нарадзілася ідэя зрабіць партрэт знакамітага пісьменніка. "Я любіў глядзець, — прыгадваў Іван Пятровіч, — як яна піша партрэты маіх сяброў Андрэя Макаёнка і Івана Мележа. З радасцю і хваляваннем згадзіўся пазіраваць..." Шамякін нарадзіўся ў снежні, мо таму і яго партрэт на фоне снежнай беларускай зімы: Іван Пятровіч стаіць у паліто з непакрытай галавой, шапка ў руцэ, на валасах пухкі снег, нават адчуваецца, што невялічкі марозік. Народны пісьменнік, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, чалавек, які працаваў на высокіх дзяржаўных пасадах, зняў шапку — перад народам, перад Беларуссю...

Карціна, прысвечаная Івану Мележу, названая "Наш гонар": Іван Паўлавіч стаіць ля дзвюх бярозак, прытуліўшыся левым плячом, са значком дэпутата Вярхоўнага Савета БССР на грудзях. І толькі той, хто ведае жыццёвы шлях пісьменніка (ён быў цяжка паранены, левая рука засталася скалечанай), не здзівіцца, чаму так "коса" напісаная постаць.

"Беларуская песня" — прысвячэнне Рыгору Шырму, збіральніку нашай песеннай спадчыны, заснавальніку акадэмічнай харавой капэлы — нарадзілася за адзін дзень. Шчасная наведала Рыгора Раманавіча, калі яму заставалася жыць некалькі тыдняў. Сядзела побач з хворым і трымала яго вытанчаную духоўнай мастацкай працай руку з глыбокімі лініямі жыцця на далоні. Яна дакраналася да той кропкі, дзе нібыта заканчваецца лінія лёсу чалавека — і адчула нешта таямнічае. Нінэль Іванаўна вярнулася ў майстэрню і зразумела, што павінна пісаць партрэт Шырмы. І адбылася сапраўдная "Беларуская песня": на фоне неба, у коле белых журавоў блакітам вачэй глядзіць з карціны абаронца народнай беларускай песні. Яго душа ўжо ўзнялася над зямлёй, і правай рукой ён быццам бласлаўляе нас на далейшую працу — працу на ніве народнага мастацтва, якое сілкуе душу народа... Праз тры тыдні славутага майстра не стала.

Карціна "Быць можа я не скончу жыць" прысвечаная Максіму Багдановічу, яго апошнім дням жыцця ў Ялце: паэт на белым ложку, трымае свой першы зборнік вершаў "Вянок" — нібы "цвяток радзімы васілька"... Партрэт выкананы ў адмысловай тэхніцы, на шкловалакне, якое пры святле нібыта блішчыць маленькімі зорачкамі. Ствараецца ўражанне галаграфічнасці гэтага твора.

... У той жнівеньскі вечар былі расповеды пра трохгадовую гісторыю стварэння дыптыха "Францыск Скарына" ды "Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец" (знаходзіцца ў музеі Беларускага Дома друку), пра пісьменнікаў Уладзіміра Дубоўку (магчыма, работа Шчаснай — яго адзіны партрэт, напісаны з натуры), Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Ніла Гілевіча, Генадзя Бураўкіна, Анатоля Бутэвіча, пра партрэт Цёткі, пра герояў-партызанаў з атрада імя Шчорса, пра акадэмікаў І. Антонава і А. Романа, пра карціну-абраз Еўфрасінні Полацкай, пра трыпціх, прысвечаны касманаўту Пятру Клімуку і яшчэ пра дзесяткі выдатных творчых людзей Беларусі, з якімі сябравала і сябруе, якіх ведала і ведае Нінэль Іванаўна.

У розных музеях краіны і за мяжой знаходзяцца творы мастачкі. А ў Полацку ёсць галерэя яе карцін.

"У Вашай творчасці я бачу глыбокі філасофскі сэнс. Каб так паказаць рэальны свет, трэба глыбока любіць усё навакольле, душэўна дакранацца і адчуваць прыгожае. Мне падаецца, у працы Вашы рукі, душа і светапогляд зліваюцца ў адно". Гэта словы Пятра Клімука з альбома Нінэль Шчаснай "Іскры майго жыцця"...

Уладзімір ЛОБАЧ

Таямніца кнігі — таямніца святасці

Усё, што звязана з творчасцю, у тым ліку літаратурнай, ва ўяўленні публікі асмужана таямнічасцю. Між тым, сапраўдная таямніца нараджэння твора нярэдка застаецца неспасцігальнай і для самога аўтара.

Апошняя кніга Валянціны Коўтун "Пакліканыя" (Мінск, "Мастацкая літаратура", 2008) — гэта раман-жыціе. Пра таямніцу творчасці і таямніцу святасці — наша гутарка з пісьменніцай.

— Дык як жа наважылася паэтэса Валянціна Коўтун, "багемная" (па мерках літпрацэсу савецкіх часоў) і калісьці даволі далёкая ад царквы, на вытлумачэнне сакральнай таямніцы ў мастацкіх ("вымышленых" ці, прынамсі, "дамысленых") вобразах?

— Першае пачуццё, што вынікае з роздумаў пра мастацкую творчасць, сапраўды звязана з таямніцаю. Таямніцаю "жыцця" кожнага з нас. І ў будзённасці, і ў духоўных пошуках дарогі да Храма. Праўда, многім, прынамсі мне, даводзілася пераадольваць сапраўдныя звышперашкоды, аднак менавіта яны і стаюць пасля "будаўнічым матэрыялам", з якога ўзводзяцца мастацкія сцены. Што да рамана-жыція "Пакліканыя", то прызнаюся, падчас працы над апісаннем духоўнага подзвігу ігуменні з Полацка, гэтай адначасна рэальнай і ў пэўным сэнсе сакральна-містычнай асобы, многае было насычана незвычайнай энергетыкай. Дарэчы, знакавай можна назваць і падрыхтоўчую падзею — стварэнне і дзейнасць Усебеларускага жаночага фонду Еўфрасінні Полацкай: нялёгкая справа доўжылася ў маім лёсе болей дзесяці гадоў. Адсюль, пэўна, і распачаўся шлях да "Пакліканых". Цяпер, калі кніга прыйшла да чытача, спадзяюся, што творчыя азарэнні варта ўспрымаць як вялікі падарунак аўтарцы ад яе гераіні, чый лёс сімвалічна люструе гістарычную хаду народа па шляху святасці. Аднак жа князёўна Прадслава і ігумення Еўфрасіння, у пэўным сэнсе, — гэта і ўсе мы разам, і кожны з нас. Таму важна зразумець, што жыццёвасць рамана не столькі ў сюжэтыцы падзейнай, але ў архітэктоніцы развіцця духоўнасці, у жыццёвасці дыялога галоўнай гераіні з Хрыстом. Дарэчы, як памятаю, найболей "шакіраваў" мяне містычны штуршок да запачаткавання твора, бо ніколі раней не здаралася ў мяне такога яркага "бачання" і адчування. Маю на ўвазе начное аб'яўленне мне полацкіх паломнікаў, якіх ігумення Еўфрасіння вяла праз пранізаную сонцам Галілею. Пясчаная шурпа густа наліпла на полы манаскіх шатаў, і тыя пры хадзе так моцна шоргаліся адна аб адну, што ўрэшце праз глухату стагоддзяў і космас прасторы абудзілі беларускую пісьменніцу, жыхарку канца XX стагоддзя да працы. Гэта і быў па сутнасці той сакральны дазвол, дакладней, нават патрабаванне ўзяцца за пісьменніцкае пяро. Дарэчы, тыя першыя начныя замалёўкі знайшлі месца толькі напрыканцы рамана ў апісаннях паломніцтва...

Задумаўшыся над вытлумачэннем сакральнай таямніцы ў мастацкіх вобразах, адразу згадала пра драматычную містэрыю "Крыж ігуменні", створаную паводле "Пакліканых" і надрукаваную ў "Маладосці". У свой час мяне насцярожыла павярхоўнае ўспрыманне, здаецца, літчасткаю Віцебскага тэатра, знікнення юнай Прадславы, пасля ўдару ланцугом, з Дзвінскай кручы. Але ж гэта было, па сутнасці, сыходжанне манашкі ў містычную прорву безыменнасці, самаахвярнага адмаўлення ад княжае ўлады, жаночай красы і зямнога багацця. Пісьменніца Ніна Загорская і актрысы Марыя Захарэвіч ды Наталля Чамадурава, дарэчы, успрынялі згаданую драматычную калізію як вялікую хрысціянскую метафару, таму не здзіўлюся, калі многія карціны, сюжэты з "Пакліканых", а таксама трактоўкі асобы і дзей ігуменні з маіх драматычных містэрый будуць выкарыстаны ў кіно ці тэатральнымі рэжысёрамі нават без упамінання імені іх сапраўднай аўтаркі. Але — дай Бог усім поспехаў і набыткаў!

— Ці не адчуваўся нейкім чынам лёс герояў вашых празаічных кніг (згадаю тут побач з "Пакліканымі і "Крыж міласэрнасці") у вашым асабістым лёсе? З чым, напрыклад, было звязана ваша нядаўняе падарожжа ў Іерусалім?

— Пра тое, што раман "Крыж міласэрнасці" пэўным чынам нёс на сабе адзнакі аўтабіяграфічнасці, даволі многа ў свой час пісалі — У. Конан, А. Сямёнава, В.Локун. Што ж да аўтаркі і гераіні новага рамана, то расчытваць паралель тут варта вельмі асцярожна. Лепей казаць, што аўтарка пэўным чынам прысутная амаль ва ўсіх сваіх героях. Зрэшты, хіба мы ўсе — не паломнікі, хіба праз усё жыццё не пераадольваем жорсткую пустыню зямнога існавання, несучы на апошні Суд уласную грахоўнасць? У кожнага з паломнікаў рамана таксама ёсць гэткая невымерна цяжкая паклажа, і да іх аўтарка рамана так ці іначай мае дачыненне. Нядаўна пачула старую ісціну: "Кніга пісьменніка — адбітак яго душы". Часам здаецца, што лёсы нашы, асабліва прадстаўнікоў гістарычнае дзялянкі, з самага пачатку, прабачце за паўтор, напісаны на нябёсах і загадзя "асуджаныя" на выпрабаванні. І чым сур'ёзнейшая задача чакае твор у будучым, тым суровейшым выпрабаванням пісьменнік падвяргаецца. Скажаце, абсурд? Так ці іначай, але сцэна яднання Прадславы з небам падчас яе пострыгу, вобраз трох вогненных слупоў мае канкрэтную адрасацыю ў лёс аўтаркі рамана. Праўда, адбывалася тое таінства са мною яшчэ ў перыяд працы ў "Полымі", пры Сяргеі Законнікаве, і працягвалася ў даволі няпростай сітуацыі, калі нават урачам-тэрапеўтам не была зразумелая прычына "адсутнасці" і ўрэшце ўсё ж вяртання іх пацыенткі да жыцця.

У падобнай містычнай напружанасці ствараліся, як памятаю, і старонкі пасягання д'ябла на Прадславу перад яе выездам у Сяльцо і закладаннем у пушчы новага храма. Пэўна, пераважалі там усё ж уласныя пачуцці. Таму і чула папрокі. Маўляў, апісанні тыя залішне натуралістычныя. Але давайце згадаем, што падчас запачаткавання абіцелі і, пазней, царквы палачанцы было ўжо не дванаццаць, а не меней дваццаці гадоў. Таму апісанні нападу д'ябла-спакусніка, супраціўлення яму маладой жанчыны, а таксама гону звар'яцелых ваўкоў, пасланцоў апраметнай, дапраўды абвострана рэалістычныя, асабліва ў дэталях супрацьстаяння манашкі сіле жарсці. Але ж менавіта тое супрацьстанне прывяло ігуменню і да першых творчых вопытаў. Прызнаюся: менавіта пры напісанні "Пакліканых" прыслухвалася я да свайго ўнутранага голасу ой як уважліва. Таму і перапісваўся раман не адзін раз. Дарэчы, калі да галоўнай гераіні адношуся я з вялікай асцярогаю, шанаваннем і адначасна пачуццём нейкай горняй слёзнай жальбы, то князёўна мінская Вольга здаецца мне больш зразумелай і блізкай. Вольга адначасна блізкая і прыродзе, і горняй малітве. Такая, якой, магчыма, бачыцца ў нечым сама Прадслава ў юнацтве. Па-свойму адлюстраваліся зрухі душы галоўнай гераіні і праз яе стрыечную сястру Звеніславу, апантана закаханую ў князя Барыслава, які, дарэчы, пакутуе ад жарсці да Прадславы. Звычайны, як бачым,"трохкутнік", у якім ігуменні адводзіцца найбольш сузіральная роля. І ўсе яны, героі рамана, напрыканцы развіцця жыццёвых стасункаў — пакліканыя. Да сваёй апошняй, самай важнай споведзі.

Спрабавала я стварыць і асобны часавы пласт: старажытныя паходы вікінгаў і перыяд першых скітоў усходніх росаў, таму геаграфічная прастора рамана пашырылася ад невялікага Сяльца да сутарэнняў Кіева-Пячэрскай лаўры, ад пушчанскай жмудзі да Канстанцінопаля і Іудзейскай пустыні. А значыць, ад родных котлішчаў да тых горніх варотаў, дзе ўсіх чакае вершнік на белым кані...

Адносна ж паездкі ў Іерусалім... Яшчэ пятнаццаць гадоў таму такая паездка была б для мяне толькі турыстычнай. Цяпер гаворка ідзе ўжо пра свядомае паломніцтва. Ды і стан здароўя такі, што здагадваешся: тая апошняя сустрэча можа нечакана наблізіцца.

— Якім чынам ваш досвед навукоўца, літаратуразнаўцы ўплывае на ўласна мастацкую творчасць? Ці не канфліктуюць паміж сабой "мысленне паняццямі" і "мысленне вобразамі"?

— Досвед навукоўца заўсёды канфліктуе з мастацкай стыхіяй. І ўсё ж буду яму дзякаваць. Бо дапамагаў гэты досвед і ў расчытванні летапісаў, і пры пабудове сюжэтаў, абдумванні характараў. Спадзяюся, дапамога тая аказалася слушнай. Згадваецца, напрыклад, апісанне стыхіі веснавой Дзвіны і чаўноў з чумнымі нябожчыкамі, калі і пачаліся сутычкі князёўны са служкамі Перуна на паганскім капішчы. Урывак той, памятаю, адразу быў надрукаваны, прыцягнуў ўвагу ўвішных сцэнарыстаў. Невыпадкова доктар філасофіі, святар Юрый Залоска, прачытаўшы рукапіс "Пакліканых", адзначыў у сваім водзыве выразную кінематаграфічнасць рамана. Што да суадносін фактаў і фантазіі, якраз апісанне чумы тут стае паказальным, бо ўвядзенне ў сюжэт рамана страшнай эпідэміі — вынік творчай фантазіі, але ж кіравалася я найперш мастацкімі патрэбамі. Менавіта "чумны" эпізод і апісанне пахавання нябожчыкаў на лясным капішчы сталі фонам да мастацкага разгортвання моцнага характару яшчэ юнай Прадславы.

— Вы шмат зрабілі для своеасаблівага "ўваскрашэння" спадчыны Лесі Беларускі, па сутнасці, адкрыўшы сучаснаму беларускаму чытачу гэтага паэта. Як бы вы маглі пракаменціраваць палеміку, што разгарнулася ў апошні час на старонках літаратурна-мастацкай перыёдыкі вакол самой постаці і творчасці Лесі Беларускі?

— Асоба, творчасць Лесі Беларускі сапраўды асмужана таямнічасцю. Прынамсі, я з усмешкаю ўспрымаю факт з'яўлення гэткіх, ведаеце, "дзяцей лейтэнанта Шміта", а яшчэ — спроб кананізацыі і нават адкрыцця спецыяльнага сайта і напісання цэлых абзацаў ці старонак у кнігах, прысвечаных зняволеным. Нават без упамінання імені пісьменніцы, з чые волі і з'явіліся тыя самыя першыя беларускія публікацыі Лесі ў "Полымі" і выданнях МЖФ святой Еўфрасінні Полацкай адразу пасля аднаго з форумаў фонду.

Ўрэшце, прыходжу да думкі, што таямнічасць гэтую варта ўрэшце расшыфраваць. Што і будзе зроблена мною падчас новай публікацыі вершаў з лагера "Эльген" у тыднёвіку "ЛіМ" праз нейкі час.

— Да вашай творчасці — прычым не толькі да прозы, але і да паэзіі (да якой вы, здаецца, у апошнія гады нібы страцілі цікавасць як да "віду дзейнасці") — ахвотна звяртаюцца сённяшнія маладыя літаратуразнаўцы ў кантэксце найперш "гендэрных даследаванняў". Як вы ставіцеся да спроб некаторых даследчыкаў улучыць вас у "сонм" айчынных феміністак?

— У Беларусі, на жаль, некаторыя даследчыкі, у сілу сваёй неадукаванасці, сур'ёзна блытаюць два розных паняцці — фемінізм і жаночы рух. Фемінізм — паняцце болей прыўнесенае, звязанае з грамадскімі рухамі Амерыкі і Еўропы. Я ж заўжды прытрымлівалася ідэй менавіта жаночага руху, запачаткаванага яшчэ Алаізай Пашкевіч (Цёткай), Палутай Бадуновай, іншымі слыннымі беларускамі, якія займаліся мацаваннем нацыянальнае годнасці, жаночым асветніцтвам і абаронаю жаночых і дзіцячых правоў. Калі ж нехта мае на ўвазе тое, што гераіні мае часта — менавіта жанчыны, то гэта ўсё ж магутныя прадстаўніцы беларускай нацыі. Акрамя таго, каму ўзбрыдзе ў галаву назваць феміністамі стваральнікаў такіх літаратурных вобразаў, як руская Наташа Растова ці беларускі Сцепаніда і Алімпіяда?!

— Нават павярхоўная абазнанасць у вашых сённяшніх грамадскіх і творчых клопатах дазваляе меркаваць пра відавочную "універсальнасць" вашых літаратурных інтарэсаў і выключную (на фоне пэўнай "апатычнасці" сённяшняга літаратурнага працэсу) энергічнасць у рэалізацыі шэрага пазалітаратурных праектаў. Чым жывіцца гэтая ваша "няўрымслівасць"? Няўжо вам не хочацца — ці не ўдаецца — пазбавіцца хоць часткі шматлікіх абавязкаў і турботаў?

— Скажу шчыра, гістарычныя ўмовы развіцця беларускай рэальнасці, сам час заўжды патрабавалі ад нашай інтэлігенцыі пэўнай універсальнасці. Бо працы многа. Таму і даводзіцца, як некалі Цётка, не толькі пісаць вершы, але і пераймацца грамадскімі клопатамі. Важна толькі не збытаць гэтую неабходнасць працаваць пры максімальнай аддачы сілы — з кар'ерызмам і двурушнасцю, якія, на жаль, у многіх прадстаўнікоў творчых дзялянак сталі вядучымі. Для мяне цяпер галоўны абавязак і найважнейшая турбота — яе вялікасць родная літаратура. Праўда, літаратурны клопат ужо даўно выйшаў на першае месца. Бо тая ісціна, што рукапісы не гараць, а кніга застаецца дзейснаю на ўсе часы, урэшце перамагла. А калі даводзіцца выязджаць на сустрэчы з людзьмі, то звязана гэта найчасцей з назапашваннем "матэрыялу" і пазнаннем сучаснага жыцця. Робіцца звычайная нацыянальная літаратурная работа. Бо з людзьмі на гаворку прыходзіць не проста Валянціна Коўтун, а менавіта свая, **беларуская пісьменніца**. І толькі так.

— Якімі бачацца вам якасныя адрозненні ў літаратурных сітуацыях — эпохі 1970-х—1980-х гадоў і часу сённяшняга? Ці ўтульна вы пачуваецеся ў сённяшняй літаратурнай прасторы?

— Хацелася б шмат расказаць пра тое, якой магутнаю хваляю рушыла і ўвайшло ў літаратурнае жыццё наша пакаленне — Алесь Разанаў, Яўгенія Янішчыц, Раіса Баравікова, Нэля Тулупава, Уладзімір Някляеў, Аляксей Дудараў, і яшчэ, яшчэ... І як дзейсна сустракалі нас старэйшыя. Не было таго канфлікту літаратурнага настаўніцтва і — "комплексу непаўнацэннасці", які так рэзка, нягледзячы на ўяўную стылёвую еўрапейскасць "дзяцей асфальту", праяўляецца з боку тых нашых цяперашніх, якім замінаюць і Колас, і Купала, і Багдановіч, і Гілевіч... Зрэшты, традыцыйны раскол адбыўся не толькі паміж маладзейшымі і старэйшымі, але і ў кожным, скажам, сучасным узроставым асяродку асобна, ды яшчэ ж — на глебе не толькі творча-рэўнаснай, але і маральнай! Засмучае, што шкурніцтва так часта перамагае сумленнасць, мужнасць, высокую таленавітасць. Замест вагомых мастацкіх твораў — нейкія далёкія ад народных традыцый прэміі, узнагароды... Самі адмаўляемся ад надзейнага народнага падмурку. Вось што страшна. Быццам не бачым — ды ніхто ўжо ў літаратурным космасе не зойме месца таго ж Кузьмы Чорнага, Пімена Панчанкі, Алеся Адамовіча, Івана Мележа, Янкі Брыля, усіх, хто і дасюль утрымлівае на плячах гонар літаратурнай Беларусі і чыёй творчасцю мы яшчэ крыху цікавыя іншым літаратурам... Баюся схіліцца ў ментарства, але і маладзейшым, і старэйшым цяпер важна ў новых умовах спраўдзіць перад народам сваё.

А гэта не так і проста.

Гутарыла
Ірына ШАЎЛЯКОВА

З пошты «ЛіМа»

Ташкенцкая «адзінота» Якуба Коласа

Папаўняючы асабісты хатні бібліятэчны арсенал, настаўнікі паспяхова выкарыстоўвалі ў практыцы педагагічнай работы распрацоўкі Д. Бугаёва, Г. Кісялёва, Л. Дробава, А. Ліса, нарысы пра народнае мастацтва Я. Сахуты, кнігі І. Чыгрына.

На жаль, грунтоўных навуковых распрацовак у галіне літаратуразнаўства, этнаграфіі цяпер паменшала. А ў тых, што выдаюцца, шмат блытаніны, прыкрых памылак, скажэнняў фактычнага кшталту.

Нядаўна трапілася мне на вочы кніга М. Мішчанчука "100 лепшых сачыненняў на літаратурныя і вольныя тэмы" (Мінск, Аверсэв, 1998 г.)

З анатацыі вынікае, што ў кнізе вядомага літаратуразнаўцы, пісьменніка, аўтара многіх дапаможнікаў для студэнтаў і вучняў "вядзецца размова на прадмет напісання творчых прац". Аўтар сапраўды "не адыходзіць ад школьных праграм" (што станоўча), аднак выдае такія засмучкі, што час ухапіцца за галаву.

Так, у сачыненні "Якому богу маліўся Якуб Колас?" М. Мішчанчук сцвярджае, што беларускі класік, жывучы ў час вайны ў Ташкенце, моцна перажываў "смерць сына Міхаські" (стр. 149).

І гэта сказана пра жывога, дзякаваць Богу, Міхася Канстанцінавіча, брат якога , Юрка, загінуў у 1941 годзе пад Масквой.

Не пашкадаваў даследчык і мележаўскага складана-супярэчлівага па характары Аляксея Башлыкова, ледзь не загнаўшы яго на той свет ("не зусім страчаны чалавек", стар. 215, сачыненне "Трагедыя Аляксея Башлыкова").

Страчаны, але не зусім — нават гучыць смешна ў трактоўцы аўтара сотні лепшых сачыненняў.

Аднак вернемся да аўтарскага сачынення "Якому богу маліўся Якуб Колас?", у якім сцвярджаецца: "Далёкі Ташкент, дзе многа-многа чужых людзей, кожны з якіх дбаў болей пра сябе, чым пра другіх. Пры ўсіх магчымых варыянтах (!) Колас быў у Сярэдняй Азіі на чужыне. І адзінокі" (!), (стар.149). Ды няпраўда гэта. Пісьменнік, як вядома, пераехаў у Ташкент з Акадэміяй навук. Вядома, сумаваў па Беларусі. Былі і матэрыяльныя цяжкасці — ішла вайна. "Трэба было і гэта пераадолець, перажыць", — сцвярджае М. Мішчанчук. І не ведае пра факты этычнага парадку: Якуб Колас адчуваў маральную і матэрыяльную падтрымку з боку кіраўніцтва рэспублікі.

А цяпер пра "адзіноцтва" Якуба Коласа "на чужыне", які меў стасункі ў Ташкенце з грамадскасцю і пісьменнікамі рэспублікі. Трэцяга лістапада 1942 года ў Ташкенце ў доме Чырвонай Арміі ў сувязі з 60-годдзем Якуба Коласа адбылося ўрачыстае пасяджэнне, на якім з прамовай выступалі ў гонар юбіляра сакратар ЦККП(б) Узбекістана Юлдашбаева, акадэмік У. І. Пічэта, паэты І. Сяльвінскі, Г. Гулям, Х. Алімджан. На той вечарыне прысутнічалі пісьменнікі: М. Пагодзін, Б. Лаўранёў, Ул. Лугаўской, С. Гарадзецкі, М. Ушакоў, К. Зялінскі, Д. Благой. Не, Якуб Колас у Ташкенце не сядзеў склаўшы рукі: 6 лістапада 1942 года наведаў заняткі літаратурнага гуртка Ваеннай акадэміі імя Фрунзе, а ў снежні прысутнічаў на пленуме Праўлення СП Узбекістана.

У снежні 1942 года наш класік працаваў над дакладам пра беларускую літаратуру, рыхтуючыся да выступлення на пленуме Праўлення СП Узбекістана. Шостага лютага 1943 года выступаў з прамовай перад выпускнікамі Ваеннай акадэміі імя Фрунзе.

У тым жа 1943 годзе, у Ташкенцкім педагагічным інстытуце, ладзілася памятная вечарына, прысвечаная Якубу Коласу. А 20 красавіка таго ж года пісьменнік наведаў намесніка старшыні СНК Узбекістана Родзічава, трэцяга ліпеня 1943 г. Канстанцін Міхайлавіч браў удзел у вечарыне памяці ўзбекскага паэта Мукімі (Мухамед Амінхаджа, 1851—1903). Пятага ліпеня ён звярнуўся да начальніка Камітэта па справах мастацтва пры СНК Узбекістана І. Султанава з просьбай аднаўна паляпшэння бытавых умоў супрацоўнікаў Акадэміі навук БССР. Актыўнасць Якуба Коласа радуе: ён прысутнічае ў жніўні 1943 года на пасяджэнні прэзідыума праўлення СП Узбекістана, 24 жніўня выступае на мітынгу з нагоды вызвалення Чырвонай Арміяй г. Харкава. У жніўні-верасні 1943 года жыве на дачы (па запрашэнні) старшыні СНК Узбекістана каля падножжа Малога Чыгмана (паэт напісаў нават верш "Чыгман"), працуе тут над паэмай "Адплата".

Мікалай Іванавіч Мішчанчук павінен быў ведаць, што ў 1942 годзе рашэннем гарсавета адна з цэнтральных вуліц Ташкента (Асакінская) была перайменавана ў вуліцу імя Якуба Коласа, што Дзяржвыд Узбекскай ССР выдаў зборнік вершаў класіка на рускай мове "Голас Зямлі" (1942 г.) Шкада, што прафесар філалогіі М. Мішчанчук не знайшоў часу азнаёміцца з дзённікамі Якуба Коласа, "Кнігай Ташкенцкага быцця: дзень у дзень". Сумна і другое: паасобныя старонкі кнігі М. Мішчанчука перасыпаны "наватарскімі перламі", якія выдаюцца за адкрыццё.

Мае нататкі — не рэцэнзія. А проста намер і жаданне выказацца адносна непажаданых "перлаў" даследчыка, кнігі якога (пераканаўся ў выніку апытання педагогаў школ) карыстаюцца сёння вялікім попытам пры падрыхтоўцы да экзаменаў, тэсціравання, а таксама да раённых алімпіяд па беларускай літаратуры.

Браніслаў ЗУБКОЎСКІ

Што скажуць нашчадкі?

Дзе толькі не ведаюць пра нас, беларусаў, і наша беларускае слова! З хваляваннем узгадваю, як аднойчы нашы суайчыннікі, што жывуць за мяжой, везлі з маладзечанскай "Спадчыны" і мае кніжкі "Апалонік для дырэктара" і "Я жадаю вам дабра..." Везлі іх гэтак жа, як і жменьку роднай зямлі, у Канаду, Амерыку, Аргенціну і Аўстралію для нашых землякоў, якія запалілі там вогнішча нацыянальнай самасвядомасці, нават гарады там свае засноўваюць, дзе размаўляюць на роднай мове, спяваюць нацыянальныя песні, выдаюць дапаможнікі і кнігі пра Беларусь... А якая вялізная прыцягальная сіла свайго, нацыянальнага! Англічанін перад усім светам годна зазначае: я — англічанін! Тое ж самае скажа француз, немец, аўстрыец... Радуе, што апошнім часам і мы , у першую чаргу наша патрыятычная моладзь, усё з большым гонарам і ўпэўненасцю прамаўляем: "я — беларус", "мы — беларусы". Ужо, да прыкладу, ці не самым жаданым у асяроддзі моладзі-вайскоўцаў становіцца дружны вокліч "За Беларусь!"

Тым больш незразумелымі становяцца дзеянні чыноўнікаў на Глыбоччыне, якія сілком спынілі існаванне адзінай у гэтым краі беларускамоўнай школы. (Менавіта гэты факт падштурхнуў мяне да ўсіх гэтых разваг). Адзіная на Віцебшчыне беларускамоўная школа страціла свой першапачатковы статус. Скажаце, што гэта праблема бацькоўскага выбару? Дазвольце не пагадзіцца. Чарговы сілавы метад спрацаваў "по умолчанию". Каму гэта было патрэбна? Няўжо тыя школьнікі, бацькі якіх захацелі, каб іх дзеці навучаліся на рускай мове, будуць удзячныя ім за страчаныя карані?! Заканамерна таму, што былыя выпускнікі славутай школы № 2 г. Глыбокае, якія з дзяцінства спрычыніліся да роднага слова, сталі на абарону роднай школы. Тыя іх сціплыя, але неаспрэчныя доказы святасці беларускай мовы мяне ўзрушылі да глыбіні душы. Асабліва пераканаўча сказаў пяцікурснік факультэта міжнародных адносін Белдзяржуніверсітэта Вадзім Жалткевіч: "Я з гонарам падымаю руку ў аўдыторыі на запытанне: "Хто скончыў беларускамоўную школу?..."

Сітуацыя, як кажуць, парадаксальная: сам ход і логіка развіцця самастойнай суверэннай дзяржавы патрабуе аднаго, а сённяшнія некаторыя адказныя асобы са сферы адукацыі робяць іншае, супрацьлеглае.

Аркадзь ЖУРАЎЛЁЎ

Саюз пісьменнікаў Беларусі, Мінскае гарадское аддзяленне СПБ глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю пісьменніка ТРАСЦЯНСКАГА Віктара Сцяпанавіча і выказваюць спачуванні яго родным і блізкім.

Саюз пісьменнікаў Беларусі, Мінскае гарадское аддзяленне СПБ глыбока смуткуюць з прычыны раптоўнай смерці празаіка і публіцыста СЕНЮКОВА Генадзя Палікарпавіча і выказваюць спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

Аднаўленне дачакаліся

Сярод маляўнічых прастораў Міншчыны, на адлегласці каля 40 км ад Мінска, знаходзіцца старадаўняе мястэчка Станькава, вядомае з XV стагоддзя. Да выдатных помнікаў архітэктуры адносіцца і мясцовая Свята-Мікалаеўская царква, якая была пабудавана пры фундацыі ўладальніка станькаўскага маёнтка графа Эмерыка фон Гутэн-Чапскага, а таксама на ахвяраванні прыхаджан.

Аўтарам праекта храма быў славуты ў той час архітэктар Канстанцін Тон, які з'яўляецца аўтарам Крамлёўскага палаца і Храма Хрыста Збавіцеля ў Маскве. Асвячэнне царквы адбылося ў дзень святкавання Успення Маці Божай, 28 жніўня 1858 года. Першым святаром быў протаіерэй Мікалай Трускоўскі, будучы архімандрыт, пісьменнік, краязнавец. Затым, на працягу 35 гадоў, да 1918 года, святаром служыў протаіерэй Фёдар Чарняўскі, бацька новапраслаўленай святой блажэннай Валянціны Мінскай (Валянціны Сулкоўскай), якая была кананізавана Царквой як святая 6 лютага 2006 года. У гэтай царкве Валянціна прыняла хрышчэнне, малілася Богу, спявала ў царкоўным хоры. Па яе малітвах у тыя часы і цяпер, пасля яе смерці, многія атрымлівалі і атрымліваюць цудоўныя збаўленні ад хвароб душы і цела. Сёлета — 120 гадоў з дня яе нараджэння.

Апошнім святаром царквы быў іерэй Ілья Мэндзік, беспадстаўна рэпрэсіраваны і расстраляны ў 1936 годзе. Ды і найпрыгажэйшаму на Міншчыне будынку храма быў накананаваны нешчаслівы лёс. Зачынілі царкву ў тым жа 1936 годзе ў разгар барацьбы з рэлігіяй. З яе было вынесена і разрабавана ўсё каштоўнае, а званы пусцілі на пераплаўку. Да і пасля Вялікай Айчыннай вайны храм быў прыстасаваны пад зернесховішча, але ў выніку пажару з-за навальніцы зерне аднойчы выгарала, і храм пуставаў. Найвялікшыя пашкоджанні храм атрымаў у 1961 годзе, калі па загадзе "зверху" вайскоўцы станькаўскай вайсковай часці ўзарвалі храм, і сцены яго выкарысталі як матэрыял для рамонту пашкоджанай плаціны на рацэ Распуса.

У 2006 годзе, пасля кананізацыі святой Валянціны Мінскай, было атрымана бласлаўленне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі на адраджэнне храма. Цяпер руіны яго знаходзяцца ў рыштаваннях, вядуцца работы. Рэстаўрацыйныя работы вядзе Беларуская Праваслаўная царква, навуковымі кіраўнікамі і аўтарамі праекта рэстаўрацыі храма з'яўляюцца галоўны архітэктар Мінскай Епархіі Мікалай Лук'янчык і архітэктар Дэпартамента знешніх сувязяў Беларускага Экзархата Алег Масліеў. Вялікую дапамогу сваімі добраахвотнымі ахвяраваннямі ў рэстаўрацыі храма аказваюць і многія грамадзяне Беларусі.

І вось сёлета, 28 жніўня, у свята Успення Маці Божай, роўна праз 150 гадоў пасля асвячэння храма, у Станькаве адбылося свята, прысвечанае гэтай даце. Ужо з самай раніцы з Дзяржынска, Мінска, з навакольных вёсак да храма пачалі збірацца людзі.

Роўна ў 10 гадзін раніцы ў храме, сярод рыштаванняў, пачалася святочная Боская літургія, якую правёў протаіерэй Дзяржынскай Свята-Пакроўскай царквы айцец Барыс сумесна са святаром Свята-Мікалаеўскага храма айцом Аляксандрам і святаром Свята-Нікольскай царквы пасёлка Энергетык айцом Міхаілам. Былі часова падвешаны чатыры званы, прысутнічала на літургіі больш за 100 чалавек.

Вячэрні малебен адпраўляў протаіерэй Фаніпальскай Свята-Вазнясенскай царквы айцец Уладзімір. Сярод удзельнікаў набажэнства можна было ўбачыць намесніка старшыні Дзяржынскага райвыканкама Аляксандра Чагана, і старшыню Станькаўскага сельсавета Людмілу Шышко.

Дарэчы, 17 лістапада спаўняецца 180 гадоў з дня нараджэння графа Эмерыка Чапскага. З гэтай нагоды ў Станькаве таксама пройдуць святочныя мерапрыемствы. Адзін з арганізатараў свята Алег Масліеў выказаў пажаданне, каб на гэтае свята прыехалі і сваякі Чапскіх з далёкага і бліжняга замежжа.

Лявон ЦЕЛЕШ
г. Дзяржынск

Выпускнікі фізфака БДУ Андрэй Жвалеўскі, Ігар Мыцько і Яўгенія Пастэрнак ужо добра вядомыя ў Расіі як аўтары шматлікіх белетрыстычных твораў. Кнігі пісьменнікаў з Беларусі неаднойчы ўзначальвалі расійскія рэйтынгі. Яны выбіраюць дасціпныя жанры — разам з мінчанкай Яўгеніяй Пастэрнак Андрэй Жвалеўскі стварыў чатыры іранічныя любоўныя раманы ў серыі "М+Ж" у стылі вядомага "Дзённіка Брыджыт Джонс", а з Ігарам Мыцько — нашумелую пародыю на кнігі Джоан Роўлінг "Пори Гаттер и каменный философ", якая хутка стала бестселерам. Акрамя таго, Андрэй і сааўтары паспрабавалі сябе ў жанрах гумарыстычнага фэнтэзі, фантастыкі, у напісанні камп'ютэрнай літаратуры, а таксама кніг для дзяцей. Дарэчы, за дзіцячую аповесць «Откуда взялся Дед Мороз и почему он никуда не денется» Яўгенія і Андрэй сёлета атрымалі прэстыжную расійскую прэмію «Заветная мечта». Пра натхненне, гумар і сваіх выдатных сааўтараў нашаму карэспандэнту распавядае Андрэй Жвалеўскі.

Трыо незвычайных літаратараў

Хацелася б зрабіць літаратурную прэмію, але не вузкую, кулуарную, а каб гэта была яркая падзея з прыцягненнем СМІ, з абвесткай публікі пра кожны конкурсны этап. Можна правесці такі конкурс сярод маладых аўтараў, прычым узнагарода неабавязкова павінна быць вялікай. Напрыклад, ёсць у Расіі прэмія Андрэя Белага, якая складаецца са шклянкі гарэлкі ды лустачкі хлеба. Галоўнае — сама акцыя, рэзананс.

Літаратурныя спробы пачаліся ў яго з абсалютна нармальнага для дзяцей з творчай сям'і жадання "быць, як тата". Фаму Мяцёлкіна (пад такім псеўданімам бацька Андрэя вёў сатырычную калонку ў газеце) у Гродне, дзе яны жылі, ведалі ўсе. Але менавіта бацька падказаў сыну, які вагаўся паміж журфакам і фізфакам, абраць адукацыю фізіка. Вучыўся Андрэй добра, але большасць часу аддаваў студэнцкаму тэатру, для якога яны з аднакурснікам і першым сааўтарам Ігарам Мыцько пісалі сцэнарыі, малявалі дэкарацыі, а здаралася, і на сцэну выходзілі ў якасці акцёраў. Тут ён пазнаёміўся і з Жэняй Пастэрнак.

— *Дзякуючы фізфаку мы навучыліся думаць. У літаратуры вялікіх форм важна ўнутраная несупярэчнасць, каб падзеі развіваліся нечакана, але лагічна. Жарт — гэта нейкі парадокс, аналітычны выверт, і менавіта прадстаўнікі дакладных прафесій валодаюць магчымасцю яго прыкмячаць, выбудоўваць.*

Цяпер Андрэй вымушаны жартаваць бесперапынку — быць абаяльным у сваіх кнігах, тонка іранізаваць у інтэрв'ю, выдумляць казусныя сітуацыі для кінасцэнарыяў, весела і нязмушана выкладаць свае назіранні ў літаратурнай калонцы, якую вядзе ў газеце «АиФ в Беларуси». З такой штодзённай акумуляцыяй гумару, напэўна, нядоўга ў асабістым жыцці ператварыцца ў занудлівага і панурага чалавека.

— *Спадзяюся, у жыцці я ўсё ж не такі ўжо і пануры (смяецца). Але сапраўды час ад часу хочацца адпачыць. Вось цяпер я з такой асалодай пішу аб'ёмную інструкцыю для карыстання праграмай "Corel Draw" — сур'ёзную тэхнічную працу, дзе мне не трэба жартаваць і дэманстраваць дасціпнасць.*

Дарэчы, пачынаў Андрэй Жвалеўскі менавіта з ІТ-літаратуры — яго аўтарству належаць больш як 20 камп'ютэрных дапаможнікаў. Пасля заканчэння фізфака яму святліла бліскучая навуковая будучыня, але ў пачатку 90-х навука была занадта нявыгаднай у фінансавым плане справай. Сем гадоў ён адпрацаваў у фірме, якая вырабляла каштоўныя паперы, пасля год быў намеснікам рэдактара ў часопісе "Паліграфічны экспрэс", а ў 2001 годзе трапіў у невялікае беларускае выдавецтва, дзе ўзначальваў камп'ютэрны напрамак. Тады і выйшла яго першая тэхнічная кніга. Цяпер працуе ў мінскім прадстаўніцтве буйнога расійскага выдавецкага дома, якое таксама займаецца камп'ютэрнай літаратурай.

— *Дзякуючы працы ў выдавецтве я і пачаў пісаць кнігі. Бо бачыў, якія рукапісы нам прыносяць, і зразумеў, што магу напісаць лепш.*

З'яўляючыся прафесіяналам у камп'ютэрнай сферы, ён адчуў неабходнасць літаратуры для "ламераў", папулярных выданняў для тых, хто толькі пачынае асвойвацца ў свеце "разумнага жалеза". Напісаў «Компьютер без напряга» і падштурхнуў сваю сяброўку Яўгенію Пастэрнак да стварэння кнігі «Компьютер для женщин». Выданне мела ашаламляльны поспех і стала лідэрам продажу ў Расіі ў 2005 годзе, але ў той жа час на яго абрынуўся вулкан адмоўных водгукаў.

— *Шмат людзей спрабавалі напісаць кнігі такога кшталту, але яны не мелі поспеху і рэзанансу. Жэня, што называецца, трапіла ў нерв. Я сказаў ёй: "Пакуль ты намагаешся асвоіць камп'ютэр, проста запісвай кожны крок — усе цяжкасці, незразумелыя рэчы". Так і ўзнікла гэта кніга. Як кіраўнік праекта я прымушаў рэдактараў замяняць усе словы, у якіх было больш за тры склады, каб зрабіць выданне максімальна простым. А крытыкаваў у асноўным хто? Прафесіяналы, сістэмныя адміністратары, людзі, якія больш як 20 гадоў сядзяць за камп'ютэрам. Іх абурала, што яна называла камп'ютэр "вялікай жалезнай скрыняй", але па сутнасці гэта так і ёсць. Цяпер Жэня нарэшце піша працяг — "Інтэрнет для жанчын".*

Была ў Андрэя задума таксама жыва і захапляльна напісаць пра законы фізікі ці пра матэматычныя формулы, каб напоўніцу выкарыстаць сваю тэхнічную адукацыю — нешта кшталту легендарных "Занимательной физики" ці «Живой математики» Я. Перэльмана.

— *Я пачаў фізіку вывучаць не ў апошнюю чаргу дзякуючы гэтым выданням. Але пасля аналізу рынку, прыйшлося, на жаль, адмовіцца ад ідэі стварыць такую кнігу. Гэта пякельная і няўдзячная праца: мода на тэхнічныя навукі, якая была ў 60-я гады, прайшла. Сённяшнія юнакі цікавяцца іншым. У мяне ёсць некалькі такіх праектаў для душы, якімі я мяркую заняцца, калі знікне патрэба зарабляць грошы.*

Беларускім літаратарам разлічваць на тое, каб зрабіць пісьменніцтва адзінай крыніцай заробку, не прыходзіцца. Але, як сцвярджае Андрэй, нават пастаянна выдаючы кнігі ў Расіі, пражыць на адны ганарары таксама цяжка.

— *Расійскія пісьменнікі звычайна выкарыстоўваюць сваё вядомае імя, каб атрымліваць дадатковы заробак. Напрыклад, Дзмітры Быкаў, вельмі раскручаны сёння пісьменнік, часта мільгаціць па ТБ у якасці шоумена. Але ў апошнія два гады ў Расіі кошты на кнігі растуць хутчэй, чым інфляцыя. Спачатку баяліся, што гэта прывядзе да краху выдавецкай галіны. Але высветлілася, што попыт на кнігі не ўпаў, а ганарары аўтаматычна павялічыліся. І, магчыма, праз гадоў пяць сітуацыя ў Расіі зменіцца настолькі, што напісаўшы добрую кнігу, чалавек зможа набыць дом дзенебудзь у Калузе альбо аўтамабіль, тады з'явіцца шмат людзей, якія змогуць зрабіць пісьменніцтва сваёй адзінай справай.*

Такім "дадатковым заробкам" для Андрэя з'яўляюцца кіна- і тэлесцэнарыі. Ён уваходзіць у групу сцэнарыстаў, якія распрацоўваюць сюжэты для папулярных тэлесерыялаў (у тым ліку, для серыяла "Салдаты"). Акрамя таго, у Андрэя з сааўтарамі ўжо ёсць сцэнарныя нарыхтоўкі для гістарычнага фільма, містычна-гумарыстычнага дэтэктыва, моладзевай і авантурнай камедый, а таксама фантастычнага кіно.

— *Напісанне сцэнарыяў вельмі адрозніваецца ад стварэння кніг. Сцэнарыст — самы апошні чалавек, яму дыктуюць, што, як і калі пісаць.*

Дарэчы, буйная кінакампанія "Цэнтрал Партнершып" прыкладна шэсць гадоў таму набыла правы на экранізацыю іранічных раманаў Яўгеніі Пастэрнак і Андрэя Жвалеўскага "М+Ж" і цяпер распачала працу над фільмам. Плануецца, што фільм выйдзе на шырокія экраны ў 2009 годзе.

Ідэя серыі раманаў "М+Ж" у тым, каб жартаўліва і лёгка адлюстраваць адносіны палоў. Мужчынскую "партыю" пісаў Андрэй, жаночую — Яўгенія, якая жыве ў Мінску, выхоўвае дзвюх маленькіх дачок і піша дзіцячую кнігу ў прамежках паміж хатнімі справамі.

— *Гумар у маіх сааўтараў абсалютна розны. У творах Яўгеніі няма нейкіх сканструяваных жартаў, але існуе агульны іранічны тон. А вось гумар Ігара Мыцько звонкі, тонкі, звілісты. Ён ювелірных спраў майстар, выпісвае дэталі, "шліфуе" апавяданне. Праўда, з ім мы можам спрачацца да хрыпаты, да бойкі. У нас ёсць правіла "вета": калі каму-небудзь з сааўтараў нешта не падабаецца, то далей гэта не ідзе.*

Жодзінец Ігар Мыцько цяпер жыве ў Маскве, працуе рэдактарам сайта, займаецца піярам. Твораў апошнім часам амаль не піша, але з'яўляецца ўкладальнікам зборнікаў (неўзабаве павінен выйсці «Сборник страшных рассказов о зеркалах»). Папулярнасць да іх са Жвалеўскім прыйшла нечакана: падчас адпачынку ў Крыме Мыцько, распавядаючы пра свае любімыя казкі Джоан Роўлінг, выпадкова пераблытаў імя героя і назваў яго Поры Гатэрам. Гэта абмоўка і падштурхнула да напісання аб'ёмнага парадыйнага твора.

Цікава, што ў той жа час з'явілася яшчэ адна нашумелая пародыя расійскага пісьменніка Дзмітрыя Емеца «Таня Гроттер».

— Яны з'явіліся з інтэрвалам прыкладна ў месяц. Значыць пісаліся абсалютна паралельна. У Дзмітрыя Емеца былі праблемы з ахоўнікамі правоў Джоан Роўлінг: калі выйшаў пераклад пародыі на нейкую еўрапейскую мову, то ахоўнікі падалі ў суд, які пастанавіў, што «Таня Гроттер» не з'яўляецца плагіятам, але пераклад тым не менш трэба забараніць. Гэты працэс нам вельмі перашкодзіў, таму што ў нас ужо таксама вяліся перамовы наконт перакладу "Пори Гаттера", а пасля гэтага ўсе выдавецтвы перамовы спынілі.

Літаратар з Беларусі, выдаўшы кнігу ў Расіі, часта сутыкаецца з тым, што яго аўтаматычна залічаюць да рускіх пісьменнікаў. І ў рэцэнзіях ды артыкулах часта можна сустрэць: "расійскі пісьменнік Андрэй Жвалеўскі" ці "Яўгенія Пастэрнак — руская Хэлен Філдзінг".

— *Гэта сапраўды так. Але трэба адстойваць сваё права заставацца пісьменнікам з Беларусі, і я заўсёды ў такіх выпадках выпраўляю журналістаў. Хацелася б, канечне, каб газеты больш пісалі пра беларускіх аўтараў, якія друкуюцца за мяжой, каб краіна магла ганарыцца не толькі біятланістамі, але і літаратарамі з Беларусі. Увогуле многія рускамоўныя аўтары вымушаны друкавацца ў Расіі, таму што буйнога выдавецтва мастацкай літаратуры ў Беларусі проста няма. На апошняй выставе "Кнігі Беларусі" на стэндзе Міністэрства інфармацыі прыводзіўся спіс дзесяці найбуйнейшых беларускіх выдавецтваў. Лідзіруе "Харвест", але гэта "выносная вытворчасць", філіял расійскага гіганта. Астатнія пазіцыі ў спісе займаюць выдавецтвы, якія друкуюць прававую, эканамічную літаратуру, дапаможнікі, тэсты для школьнікаў. У гэтую дзесятку ўваходзілі толькі выдавецтвы, якія выдаюць больш як сто кніг у год, мастацкую літаратуру ў такім аб'ёме ў нас не выдае ніхто.*

Нягледзячы на сваю папулярнасць у Расіі, Андрэй не пакідае надзеі рабіць нешта і на радзіме.

— *Была ідэя стварыць у Беларусі літаратурнае агенцтва. Ёсць задума напісаць кнігу ў фармаце тэлефоннага даведніка, дзе былі б нумары тэлефонаў і незвычайныя гісторыі рэальных людзей.*

Хацелася б зрабіць літаратурную прэмію, але не вузкую, кулуарную, а каб гэта была яркая падзея з прыцягненнем СМІ, з абвесткай публікі пра кожны конкурсны этап. Можна правесці такі конкурс сярод маладых аўтараў, прычым узнагарода неабавязкова павінна быць вялікай. Напрыклад, ёсць у Расіі прэмія Андрэя Белага, якая складаецца са шклянкі гарэлкі ды лустачкі хлеба. Галоўнае — сама акцыя, рэзананс. Але для мяне ўсё ўпіраецца ў арганізацыйныя пытанні, бо я проста баюся загразнуць у папяровай цяганіне. Я нават ездзіў у Федэральнае агенцтва па справах друку РФ, размаўляў пра тое, як правільна арганізаваць такое мерапрыемства. Я ўсё ведаю, і калі б нехта ўзяў на сябе вось гэту руцінную падрыхтоўку дакументаў, я б з задавальненнем паўдзельнічаў.

Акрамя шматлікіх твораў, напісаных у сааўтарстве, Андрэй Жвалеўскі мае і "сольныя" — дзве кнігі "Мастер сглаза" і "Мастер силы" з запланаванай трылогіі. Працу над трэцяй кнігай «Мастер смысла» ён скончыў зусім нядаўна.

— *«Мастер сглаза» — гэта першая аповесць, якую я напісаў, так званы brain-fiction: неверагодныя падзеі выкліканыя сілай думкі чалавека, які валодае унікальнымі здольнасцямі. Гэтая кніга не стала бестселерам і прадаецца не вельмі добра, але для мяне яна важная, бо ў ёй шмат асабістага. Нядаўна да мяне звярнуліся з цікавай прапановай — зрабіць камп'ютэрную гульню паводле гэтай кнігі. Таксама шмат ішло размоў пра яе экранізацыю. Так што я думаю, яна яшчэ будзе мець поспех. Увогуле планую працягваць пісаць у жанры brain-fiction, у мяне ўжо ёсць некалькі сюжэтаў, якія проста трэба ўвасобіць на паперы.*

Заняты працаголік Андрэй Жвалеўскі піша па некалькі кніг у год (бывае, што яны выходзяць з прамежкам усяго ў 2—3 месяцы), а да таго ж знаходзіць час на працу ў газеце і напісанне сцэнарыяў. Але зразумела, ніякія поспехі не даюцца лёгка.

— *У мяне ёсць норма: у дзень я павінен напісаць 10 тысяч знакаў. Я не пішу толькі тады, калі зусім не магу — вочы слязяцца, галава не цяміць. Але сам працэс напісання такі цікавы, што гэта дзейнічае, як наркотык. Зразумела, калі б я з такой стараннасцю займаўся гандлем, я б ужо ў грашах купаўся.*

Саша ДОРСКАЯ

З гісторыі аднаго фонду

У гэтым годзе адзначылі 95 гадоў з дня нараджэння пісьменніка Сяргея Іванавіча Грахоўскага. У апошняе дзесяцігоддзе свайго жыцця ён быў вельмі частым госцем Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва: дапамагаў парадкаваць свой уласны архіў, кансультаваў, удзельнічаў у архіўных святах. Да 35-годдзя БДАМЛМ напісаў верш, дзе былі такія радкі:

Раскласці ўсё па жанрах,
па парадку,
Каб перадаць сумленнаму
нашчадку,
Каб ён не знік
ні ў якай завірусе,
А беларусам быў у Беларусі.

Сёння так не хапае яго добрых парад і цікавых успамінаў. Але нам застаўся ў спадчыну яго асабісты архіў, які гатовы адчыніць свае таямніцы ўсім, хто цікавіцца жыццём і творчасцю С. Грахоўскага.

Нарадзіўся Сяргей Іванавіч 25 верасня 1913 года ў сяле Нобель Пінскага павета Мінскай губерні. Дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі ў мястэчку Глуск, што на Магілёўшчыне. У 1935 годзе скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута, працаваў рэдактарам на Беларускім радыё, а з восені наступнага года выкладаў літаратуру на рабфаку БДУ. 19 кастрычніка 1936-га быў беспадстаўна арыштаваны і накіраваны на 10 год на лесараспрацоўкі ў Горкаўскую вобласць. Пасля вяртання ў 1946 годзе выкладаў рускую мову і літаратуру на Случчыне. Аднак ужо ў 1949 годзе паўторна арыштаваны і сасланы ў Новасібірскую вобласць. У 1955 годзе быў поўнасцю рэабілітаваны і вярнуўся ў Мінск, дзе пачаў працу на Беларускім радыё, а пазней — у часопісах "Бярозка" і "Вясёлка".

Друкавацца пачаў з 1926 года, але першы паэтычны зборнік убачыў свет больш чым праз 30 год, у 1958 годзе. Пасля гэтага пачалі адна за адной выходзіць кнігі яго вершаў "Чаканне", "Табе зайздросціць сонца", "Памяць" і іншыя. Плённа працаваў Сяргей Грахоўскі і ў прозе. У 1966 годзе выйшаў зборнік апавяданняў "Які вялікі дзень", а трошкі пазней — аповесць "Рудабельская рэспубліка", паводле якой быў пастаўлены спектакль, а ў хуткім часе адбылася экранізацыя. Шмат увагі аўтар аддаваў напісанню ўспамінаў, публіцыстыцы і перакладчыцкай справе.

Багатая, разнастайная, шматгранная спадчына паэта, празаіка, перакладчыка, публіцыста Сяргея Грахоўскага захоўваецца сёння ў Беларускім дзяржаўным архіве-музей літаратуры і мастацтва.

Першыя дакументы з яго асабістага архіва паступілі ў верасні 1974 года. Гэта былі ў асноўным матэрыялы да дакументальнай аповесці "Рудабельская рэспубліка". Па нататніках, выпісках, варыянтах аповесці дасканала прасочваецца гісторыя напісання твора.

Праз 10 год С. Грахоўскі перадаў у архіў-музей вялікую колькасць сваіх рукапісаў. Гэта варыянты сімвалічных паэм "Бяссмертнікі" і "Ростань на світанні", а таксама найлепшы ліра-эпічны твор паэта "Спаленыя масты", вялікая колькасць вершаў. Важкае месца ў перададзеных дакументах займае празаічная спадчына Сяргея Грахоўскага: аповесці, апавяданні, нарысы, шматлікія накіды да будучых твораў. Нельга не звярнуць увагі на вялікую



колькасць перакладаў прозы і паэзіі.

Наступнае паступленне дакументаў адбывалася на працягу 1992 — 1994 гг. Здзейсніў яго, як і першыя два, сам пісьменнік. Менавіта яны склалі трэці вопіс архіўнага фонду, які дае характарыстыку творчай дзейнасці пісьменніка з 1957 па 1994 гг. У ім сабраны рознабаковыя па змесце і тэматыцы матэрыялы. Найкаштоўнейшы раздзел складае ліставанне Сяргея Грахоўскага. Да яго пісала вялікая колькасць людзей, сярод якіх З. Верас, Н. Гілевіч, М. Забэйда-Суміцкі, М. Лужанін, Я. Сіпакоў, Я. Скрыган і іншыя. У асобным раздзеле сабраныя лісты вязняў ГУЛАГа і іх родзічаў. Дзякуючы допісам Наталлі Вішнеўскай (жонкі Я. Бобрыка), Таццяны Замоцінай (дачкі акадэміка І. Замоціна), Тадзіяны Кляшторнай (дачкі Т. Кляшторнага), Люсі Лёсік (пляменніцы братоў Лёсікаў), Генадзя Шашалевіча (сына Васіля Шашалевіча) і шматлікім іншым, высветліліся важныя моманты цярністага жыццёвага і творчага шляху бязвінна загубленых людзей.

Сам Сяргей Грахоўскі меў за плячыма 10 год лагернага жыцця. Адсюль напісаны ім шэраг кніг-успамінаў "Зона маўчання", "З воўчым білетам", "Такія сінія снягі", у іх вельмі праўдзіва, ярка, вытанчана паказаны драматызм перажытага ў гады сталінскіх рэпрэсій.

Бясспрэчную каштоўнасць уяўляюць перададзеныя фотаздымкі і малюнкі. Сяргей Іванавіч вёў актыўнае культурнае і грамадскае жыццё, сам зрабіў вялікую колькасць здымкаў. Варта згадаць, што пісьменнік, добра маляваў. У фондзе захаваліся яго сібірскія пейзажы, Нарачы, Стаек і вясковыя пейзажы.

Апошняе паступленне датуецца 2001 годам, на аснове якога быў сфарміраваны чацвёрты вопіс. Сярод перададзеных матэрыялаў падборкі вершаў і перакладаў, аповесці, апавяданні, рэцэнзіі, артыкулы. Найбольшую цікавасць маюць успаміны, дзённікавыя запісы, перапіска. Нельга не звярнуць увагі на унікальныя лісты А. Рухінай (дачкі Андрэя Мрыя) і Л. Хурсік (удавы Сымона Хурсіка) да Сяргея Грахоўскага, у якіх раскрываюцца раней невядомыя біяграфічныя звесткі выдатных беларускіх празаікаў, творчасць якіх і па сённяшні дзень мае шмат загадак. Да лістоў прыкладзены копіі фотаздымкаў гэтых пісьменнікаў, арыгіналы якіх, на вялікі жаль, страчаны.

Матэрыялы фонду Сяргея Грахоўскага выкарыстоўваюцца плённа і актыўна. На старонках перыядычнага друку з'яўляюцца публікацыі, актыўна карыстаюцца матэрыяламі студэнты-філолагі. Усіх зацікаўленых творчасцю пісьменніка чакаюць яшчэ многія адкрыцці ў багатых зборах архіва-музея.

Ірына МАКАРЭВІЧ

Да роднага павага

Гістарычнае і літаратурнае краязнаўства — адзін з асноўных напрамкаў дзейнасці Клецкай цэнтральнай бібліятэкі. У чытальнай зале тут дзейнічае інфармацыйна-краязнаўчы цэнтр "Клецкая зямля — гісторыяй багата", адзін з раздзелаў якога прысвечаны Клеччыне літаратурнай. Тут прадстаўлены аўтарскія зборнікі Віктара Худаўца "У святой цішыні", Лілії Мялешкі "Зялёная зорка" і "Промні ў кронах", Святланы Стромскай "Ты паслухай, зямля Беларуская...", тэматычныя зборнікі самадзейных паэтаў "Клеччына вершаваная", "Верыцца ў лепшае, хочацца марыць", "Валошкі ў жыце", буклет да юбілею У. Дамашэвіча "Уладзіміру Дамашэвічу — 80", папка газетна-часопісных матэрыялаў "Пісьменнікі роднага краю".

Добра ўкамплектаваны краязнаўчы фонд бібліятэкі, які змяшчае як мастацкую, так і галіновую літаратуру. Краязнаўчы фонд рэгулярна папаўняецца новымі выданнямі, дапаўняецца папкамі інфармацыйных матэрыялаў.

На працягу многіх гадоў цэнтральная бібліятэка вядзе плённую пошукавую дзейнасць. Разнапланавасць тэматыкі і навуковатворчы падыход далі магчымасць супрацоўнікам цэнтральнай бібліятэкі выпусціць шэраг буклетаў краязнаўчай тэматыкі: "Летапіс памятных падзей Клеччыны", "Клецк і татары", "Клецкая зямля гісторыяй багата", падрыхтаваць поўнатэкставую базу звестак "Народныя святы і абрады".

Традыцыяй для цэнтральнай бібліятэкі стала правядзенне святаў вуліц і дамоў, на якія штогод улетку ўстанова запрашае жыхароў райцэнтра. Работа бібліятэкі ў кірунку літаратурнага і гістарычнага краязнаўства канцэнтруецца ў літаратурна-музычнай гасцёўні "Субяседнік" і юнацкім клубе "Равеснік".

Людміла ЦІМАВЕЦ,
дырэктар Клецкай ЦБС

Уважлівы, строгі, патрабавальны

Да 90-годдзя з дня нараджэння Ф. М. Янкоўскага

Калі ўпершыню даведалася, што адна з вуліц сталічнага мікрараёна Сухарава носіць імя майго любімага настаўніка, была незвычайна ўзрадавана і ўдзячна тым незнаёмым мне людзям, што такім чынам ушанавалі памяць чалавека, які складае гонар Беларусі.

Памяць тых, хто працаваў з Фёдарам Міхайлавічам, каго ён вучыў цвёрда стаяць на зямлі, умець жыць і з перспектываю, і з поспехамі, не дазваляе забыцца пра яго — сапраўднага Чалавека, вялікага вучонага-лінгвіста, руплівага даследчыка роднага слова.

Нарадзіўся Ф. Янкоўскі 21 верасня 1918 года ў в. Клетнае Глускага раёна ў сям'і малазямельнага селяніна. Навучэнец педтэхнікума, школьны настаўнік і адначасова студэнт-завочнік настаўніцкага інстытута. Удзельнік вайны з белафінамі, партызан-разведчык, а потым начальнік стратэгічнай разведкі атрада "Грозны" ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адказны сакратар рэдакцыі раённай газеты, студэнт Гродзенскага пед-інстытута, настаўнік сярэдняй школы, аспірант, выкладчык, дацэнт, прафесар і загадчык кафедры — вось жыццёвыя ступені Фёдара Янкоўскага. На кожнай з іх — часцінка багатага на падзеі і справы жыцця. Яго працы ў галіне народнай фразеалогіі адкрылі новыя раздзелы беларускай лінгвістыкі — фразеалогію і фразеаграфію. Пра здабыткі Янкоўскага ў галіне фразеалогіі нямецкі вучоны-славіст Карл Гутшмет сказаў, што гэтая праца — "адзіная ў сваім родзе ў славістыцы", што гэта "ўзор лінгвістычнага даследавання на самым высокім тэарэтычным узроўні".

Вучоны-першапраходца, Ф. М. Янкоўскі напісаў каля 250 прац па фразеалогіі і фразеаграфіі, лексікалогіі і лексікаграфіі, гісторыі беларускай мовы, дыялекталогіі, фанетыцы і арфаэпіі.

Сваім талентам Фёдар Янкоўскі не толькі служыў роднай Беларусі. Ён быў самым цудоўным выкладчыкам — падрыхтаваў тысячы настаўнікаў. Мабыць, не знойдзецца школы ў рэспубліцы, у якой не было б яго выхаванцаў.

Прафесію настаўніка ён лічыў самай адказнай і ганаровай. У абразку "Настаўнікавы рукі" Фёдар Міхайлавіч пісаў: "Што ж без цябе, настаўнік? Хто ж без цябе, настаўнік? Ты, настаўнік, быў у Скарыны і Гарыбальдзі. Ты, настаўнік, быў у Герцэна і Каліноўскага, у Карскага і Паўлава. Ты, настаўнік, быў і ў таго печніка, якога спалілі фашысты, адзінага, хто мог ў той дзень не згарэць. І ён жыве... Чалавецтва, чалавечнасць далі вечную ацэнку, вынеслі вечную недаравальнасць, вечны прысуд на ганьбенне таго, хто здрадзіў настаўніку".

Вучні прафесара Янкоўскага — гэта спецыялісты-філолагі, якія і ў Брэсце, і ў Віцебску, і ў Мазыры, і ў Гродне, і, вядома ж, у Мінску. Сярод іх — загадчыкі лінгвістычных кафедраў, дэканы Г. М. Малажай, В. І. Несцяровіч, Т. І. Тамашэвіч, Я. М. Адамовіч. Пад яго кіраўніцтвам з'явіліся падручнікі М. С. Яўневіча і Л. П. Падгайскага, дапаможнікі М. Ц. Кавалёвай, А. К. Юрэвіч, К. М. Панюціч і Н. В. Гаўрош, Э. Д. Блінавай і А. А. Каўруса.

Прыгадваецца аўдыторыя і ён — строгі, справядлівы і ўважлівы. Да дапытлівых, да тых, хто стараецца мысліць самастойна, нешаблонна. Сцвердзіш сваю самастойнасць, дакажаш, што ты — асоба, — лёгка будзе вучыцца ў прафесара Янкоўскага. У адваротным выпадку — не паздаровіцца. Уважлівы, строгі, патрабавальны, ён мог табе дараваць міжвольную памылку, зразумець твой боль. Але ніколі не дараваў — няшчырасць, двурушніцтва і прыстасаванства.

Не помню, каб хоць калінебудзь ён на занятках чытаў матэрыял, запісаны на паперы. Стваралася ўражанне, што ён літаральна ўсё ведае. Усебаковая кампетэнтнасць, зайздроснае веданне матэрыялу — вось што ўздзейнічала на нас перш за ўсё. Мы верылі свайму настаўніку. Мы ішлі за ім.

Думаецца, якім было б маё пакаленне, каб не было ў нас такіх настаўнікаў, як ён, як М. Г. Булахаў, А. М. Налівайка, А. А. Каляда, М. Ф. Гуліцкі, М. І. Мішчанчук. Нізкі паклон вам, нашы настаўнікі. За ўсё для нас зробленае. За навуку жыць і працаваць сумленна і шчыра.

Прафесар Ф. Янкоўскі вядомы ў рэспубліцы не толькі як вучоны і педагог, але і як пісьменнік. Лінгвістычныя яго працы па-свойму дапаўняюць літаратурныя творы-навелы, апавяданні, нарысы, мініяцюры, якія ўвайшлі ў кнігі "Абразкі" (1975), "Прыпыніся на часінку" (1979), "І за гарою пакланюся" (1982), "Радасць і боль" (1984), "Само слова гаворыць" (1986), "З нялёгкіх дарог" (1988).

Радзіма высока ацаніла яго заслугі, узнагародзіўшы ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й ступені, "Знак Пашаны", медалямі. Яму прысвоена ганаровае званне "Заслужаны дзеяч навукі Беларусі". Яго імем названа адна з вуліц у горадзе Мінску.

А стараста праваслаўнай царквы Святога Архангела Міхаіла, якая якраз размешчана на вуліцы Ф. М. Янкоўскага, апошні час увесь у клопатах, каб падрыхтаваць шыльду, якая б засведчыла імя вялікага мовазнаўцы для жыхароў горада. Да гэтай справы неабыякавы і намеснік кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна Георгій Уладзіміравіч Козел. Спадзяёмся, што стварэнне музея дарагому настаўніку таксама не прымусіць доўга чакаць.

Вера БУЛАНДА

На здымку: Ф. Янкоўскі і У. Калеснік.

У лепельчаніна Ілы Януша шмат талентаў: настаўніка, арганізатара, шахматыста... Але самага галоўнага — таленту краязнаўцы — у гэтым спісе няма, бо не скажаш пра яго двума словамі. Пра цікавасць Ілы Юльянавіча да роднага краю і да любай зямлі трэба распавесці падрабязна.

Цікавая справа — пазнаваць свой край

Знаёмства з героем

Звычайна адораныя дзеці раскрываюць свае таленты ў раннім узросце, але час быў такі, што нашаму герою прыйшлося трохі пачакаць, каб праявіць свае краязнаўчыя схільнасці...

Ілья Януш нарадзіўся ў 1936 годзе ў вёсцы Галінова Дзісенскага павета ў звычайнай сялянскай сям'і. Але як краязнаўца сябе ў дзяцінстве ніяк не праявіў. Ды і дзе тут было праяўляць, калі сям'я з пяці чалавек трымала гаспадарку, апрацоўвала больш як 12 гектараў зямлі. Ілья тады працаваў упоравень з дарослымі: касіў, жаў, даглядаў жывёлу.

Да краязнаўства справа дайшла толькі падчас вучобы ў Глыбоцкім педвучылішчы (1951 — 1955 гг.). Прыахвочваў навучэнцаў да гэтага цікавага занятку настаўнік геаграфіі П. Свірко. Ён арганізоўваў паходы, экскурсіі, вандроўкі на лодках. Успаміны пра гэтыя паходы і сёння застаюцца самымі яркімі ўспамінамі Ілы Юльянавіча з часоў навучання ў педвучылішчы, а краязнаўства сталася для яго справай жыцця.

Выпрабаванне

Кожнаму чалавеку ў жыцці наканаваны пэўныя выпрабаванні, пераадоленне якіх дапамагае высветліць: ці не памыліўся ён у сваім выбары. Такім выпрабаваннем для Ілы Юльянавіча сталася служба ў войску.

Служыў ён на Камчатцы. Але ўдалечыні ад роднай зямлі не забыўся на свае захапленні: у вольныя гадзіны знаёміўся з прыродай паўвострава (якая, дарэчы, так спадабалася яму, што і сёння ён настальгічна замірае перад экранам тэлевізара, калі паказваюць камчацкія вулканы і сопкі), аглядаў мясцовыя гісторыка-культурныя помнікі, пазнаёміўся ў краязнаўчым музеі з рэдкай кнігай удзельніка другой камчацкай экспедыцыі С. Крашаніннікава "Апісанне зямлі Камчаткі". У войску Ілья Юльянавіч як пазаштатны аўтар пачаў пісаць у газету "На страже Родины" пра сваіх сяброў, пра службу. Гэтай справай ён таксама захапіўся на ўсё жыццё, напісаў дзесяткі артыкулаў для навуковых і перыядычных выданняў (ад раённай газеты "Лепельскі край" да "Звязды" і "Культуры"), стаў адным з аўтараў кнігі "Памяць. Лепельскі раён", напісаў артыкулы пра Лепель і мястэчка Пышна для "Беларускай энцыклапедыі" і "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі".

Геаграфія, малюнкі і спевы

Пасля службы ў войску Ілья Януш пачаў настаўніцкую працу ў Новапагосцкай сярэдняй школе Міёрскага раёна, адначасова завочна вучыўся ў БДУ на геаграфічным факультэце, які праз шэсць гадоў паспяхова скончыў. Яго даследаванні набываюць грунтоўнасць і сістэматычнасць. Разам з настаўнікамі гісторыі Ілья Януш стварае першы ў раёне школьны краязнаўчы музей. Ён узначальвае ў школе турыстычна-краязнаўчую работу, ладзіць злёты, падарожжы, школьныя экспедыцыі, збірае разам з вучнямі калекцыю экспанатаў для кабінета геаграфіі.

Дарэчы, творчасць, адказнасць, талент настаўніка і арганізатара ў адной з лепшых школ вобласці ацанілі адразу. І.Януш пачаў сваю працу настаўнікам геаграфіі, спеваў і выяўленчага мастацтва, а як толькі ў штатным раскладзе ўпершыню з'явілася пасада намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце, на яе адразу прызначылі нашага героя.

На новым месцы

Так здарылася, што ў 1982 годзе сям'я Ілы Юльянавіча пераехала ў Лепель. Месца настаўніка геаграфіі ва ўсіх гарадскіх школах было занята, і ён ўладкаваўся навуковым супрацоўнікам у Лепельскі краязнаўчы музей. Але ні хвіліны пра такі паварот лёсу не шкадаваў. З дзецьмі Ілья Юльянавіч не расстаўся: стварыў пры музеі Клуб юных краязнаўцаў, кіраваў гуртком пры дзіцячай турбазе. Пятнаццаць год Ілья Януш вёў актыўную пошукавую працу, збіраў краязнаўчыя матэрыялы, шмат працаваў у архівах. Свае галоўныя краязнаўчыя дасягненні ён адносіць менавіта да Лепельскага перыяду: найбольш поўнае апісанне гісторыі раёна, 160 старонак кнігі "Памяць. Лепельскі раён" (першы раздзел, прысвечаны гісторыі краю ад каменнага веку да пачатку Вялікай Айчыннай вайны), шматлікія цыклы публікацый у раённай газеце "Лепельскі край".

Сучаснасць

Цяпер Ілья Януш на пенсіі. У жніўні яму споўнілася семдзесят два, і ён сціпла кажа:

— Зараз у нас ёсць маладзейшыя краязнаўцы, якія ходзяць, ездзяць, збіраюць розныя звесткі. А я ўжо больш раблю апісанні па гатовых матэрыялах. Ну, і пастараюся, колькі будзе сіл, яшчэ працягваць апісанне гістарычнага мінулага Лепельскага краю.

— *А над якімі тэмамі вы плануеце папрацаваць?*

— Мяркую надрукаваць матэрыялы пра Лепельскае евангелле, якое ўпамінаецца ў XIX стагоддзі. І яно было ў вядомага нашага археолага М. Кусцінскага. Я ўжо заказаў матэрыялы ў Нацыянальным гістарычным архіве і пастараюся іх выкарыстаць для артыкула ў газету "Лепельскі край". Буду працягваць друкаваць матэрыялы да 570-годдзя Лепельшчыны, якое будзе адзначацца ў наступным годзе. Да юбілею ўжо надрукаваны мае артыкулы пра жыццё на лепельскіх землях у каменным веку, пра некаторыя гістарычныя помнікі і падзеі, пра мястачковы ўклад жыцця, лепельскія дарогі і паштовыя тракты ды іншыя.

Дарэчы, дзякуючы Ілы Юльянавічу Лепельшчына будзе святкаваць юбілей з новым помнікам гораду. Па ініцыятыве краязнаўцы з нядаўняе пары на ўваходзе ў Цэнтральны гарадскі парк гасцей і лепельчан сустракае старажытны валун, на якім выбіта дата першага летапіснага ўпамінання пра лепельскія землі.

А пра справу свайго жыцця, пра свой лёс ў краязнаўстве і краязнаўства ў сваім лёсе, пра будучыню Ілья Юльянавіч кажа вельмі сцісла і ёміста: "Вечная і вельмі цікавая справа вывучаць свой край, і ні пачатку, ні канца гэтаму вывучэнню быць не можа...".

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

Фота аўтара і з асабістага архіва Ілы Януша.

Мінулае — на здымках

"Заслаўе. XX стагоддзе. Падзеі і людзі." Пад такой назвай адкрылася фотавыстаўка ў Гісторыка-культурным музеі-запаведніку "Заслаўе". Вядома ж, яе асабліва чакалі тыя заслаўчане, якіх можна ўбачыць на фотаздымках. Але вось пазнаць іх сёння змогуць хіба толькі родзічы ды куратар выставы — А. Рак, галоўны захавальнік музея.

Прыгледзімся да фотаздымкаў і здзівімся: вось гэтая маленькая дзяўчынка, якая нясе ў руцэ партрэт У. Леніна ў святочнай калоне дэманстрантаў, — няўжо гэта і ёсць Ніна Дзясятнік, невысокая чарнявая жанчына, якая ціхенька засяродзілася на фотаздымках? А прыгожая дзяўчына, што весела таньчыць на вуліцы пад гармонік ды быццам зараджае ўсіх неўтаймаванай моладзевай энергіяй, гэта ж наша паважаная Валянціна Куракевіч, якая працуе наглядчыцай у музеі і ведае шмат цікавых гісторый!

Кожны з прысутных далучыўся на імгненне да часу, які ўжо знік, але напамін пра які застаўся на фотапаперы... Але гісторыя Заслаўя зведала розныя перыяды. Вайна — гэта невыказны боль і страты людзей, якія немагчыма перадаць у лічбах, як і немагчыма выказаць сёння словамі тую "рэвалюцыйную радасць" ці затоены смутак, што адлюстраваўся на твары вайскоўца 1930-х гадоў. Фотаздымкі без каментарыяў, толькі назвы падзей са стракатымі лічбамі гісторыі ды лёсу горада, у якім я працую дзеля незалежнай і магутнай Беларусі. Завітайце ў Заслаўскі музей, каб далучыцца да прамінулага жыцця, «голас» якога гучыць са старых фатаграфій.

Юрый МАЛАШ

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3379
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 22.10.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 5789

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686